КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 25 (1255) 18 чэрвеня 2016 г.

22 — 23 ЧЭРВЕНЯ Ў МІНСКУ — V УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД

Ад ідэнтычнасці да пераўтварэння

Асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016 — 2020 гады, якая будзе прынята пасля шырокага грамадскага абмеркавання на пятым Усебеларускім народным сходзе, уключаюць і шэраг момантаў, датычных развіцця культурнай галіны. "К" прывядзе некалькі фрагментаў гэтага дакумента, які быў цалкам апублікаваны ў цэнтральных СМІ краіны, а таксама на шэрагу вядучых інтэрнэт-рэсурсаў напярэдадні значнай падзеі ў грамадска-палітычным жыцці краіны.

Як зазначаецца ў дакуменце, галоўны вынік чацвёртай пяцігодкі (2011 — 2015 гады) — захаванне палітычнай стабільнасці, устойлівасці эканомікі і сацыяльнай абароны насельніцтва. Нягледзячы на крызіс, які ўзнік у краінах-суседках, мы не толькі прадухілілі абвал, але і забяспечылі станоўчы рост эканомікі за пяцігоддзе. Больш за тое, па шэрагу напрамкаў нам удалося дамагчыся значных вынікаў.

Галоўная ж мэта развіцця краіны на 2016 — 2020 гады — павышэнне якасці жыцця насельніцтва на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягнення інвестыцый і інавацыйнага развіцця. У 2020 годзе прырост да 2015 года складзе: ВУП — 12-15 працэнтаў; рэальных грашовых даходаў грамадзян — 9,5 — 11,6 працэнта.

Для дасягнення гэтых ды іншых пастаўленых мэт развіццё краіны будзе грунтавацца на наступных прыярытэтах. Інвестыцыі — гэта развіццё і рост эканомікі. Гэта не толькі грошы, але і найноўшы вопыт і тэхналогіі. Занятасць — гэта магчымасць кожнага грамадзяніна сваёй працай забяспечыць сябе і сваю сям'ю. Экспарт — аснова нашай адкрытай эканомікі, паступлення валюты ў краіну, прыбытку прадпрыемстваў, падаткаў у бюджэт. Інфарматызацыя — гэта наша канкурэнтаздольнасць у сучасным свеце. Моладзь — гэта галоўны патэнцыял дзяржавы і будучыні краіны.

Будзе захавана сацыяльная накіраванасць бюджэтных расходаў, а таксама павялічана доля выдаткаў на інавацыйнае развіццё. Сацыяльная палітыка дзяржавы будзе накіравана на забеспячэнне годнага ўзроўню і якасці жыцця беларускіх грамадзян, умацаванне дэмаграфічнага патэнцыялу.

Мэтай палітыкі даходаў насельніцтва з'яўляецца павышэнне рэальнага ўзроўню ўсіх відаў грашовых даходаў. Меры ў галіне аплаты працы будуць накіраваны на паслядоўнае павышэнне яе рэальнага ўзроўню, зніжэнне разрыву паміж аплатай працы работнікаў бюджэтных арганізацый і сярэдняй заработнай платай у эканоміцы. Рэалізацыю пастаўленай задачы ў рэальным сектары эканомікі плануецца ажыццяўляць шляхам шырокага прымянення гібкіх сістэм аплаты працы, забеспячэння росту рэальнай заработнай платы, узаемазвязанага з ростам прадукцыйнасці працы.

Павышэнне заработнай платы работнікаў бюджэтных арганізацый да ўзроўню, не ніжэйшага за 80 працэнтаў ад сярэдняй заработнай платы, у эканоміцы да 2020 года прадугледжваецца забяспечыць праз аптымізацыю функцый і колькасці занятых у бюджэтнай сферы. Памер мінімальнай велічыні, што выкарыстоўваецца пры вылічэнні ставак (акладаў, службовых акладаў) работнікаў бюджэтнай сферы, будзе паэтапна набліжацца да бюджэту пражытковага мінімуму, у перспектыве — да мінімальнага спажывецкага бюджэту.

Развіццё нацыянальнай культуры будзе нацэлена на захаванне культурнай ідэнтычнасці беларускага народа, нацыянальных творчых традыцый, умацаванне станоўчага іміджу Беларусі ў міжнароднай культурнай супольнасці.

Для больш шырокага выкарыстання патэнцыялу беларускага культурнага ландшафту і ўключэння яго ў турыстычны абарот прадугледжваецца стварэнне сучасных цэнтраў культуры і паслуг, заснаваных на мясцовых традыцыях і гісторыка-культурных каштоўнасцях.

Трэба будзе стварыць сістэму маніторынгу стану гісторыка-культурных каштоўнасцяў на пастаяннай аснове, што дазволіць даць аб'ектыўную ацэнку мастацкім і тэхнічным асаблівасцям аб'ектаў, для ўключэння іх у дасье, якое будзе прадстаўлена ў папярэднім спісе Сусветнай спадчыны UNESCO за 2016 — 2020 гады. Плануецца павялічыць долю адрэстаўраваных помнікаў архітэктуры і тых, якія маюць адпаведнае функцыянальнае выкарыстанне, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь, з 15 працэнтаў у 2015 годзе да 30 працэнтаў у 2020 годзе.

Атрымае развіццё сістэма бесперапыннай мастацкай адукацыі, будзе аказвацца падтрымка таленавітай моладзі ў рэалізацыі творчых праектаў. Намечаныя меры дадуць магчымасць пашырыць доступ да культурных даброт для розных катэгорый насельніцтва.

Асновай развіцця транзітнай прывабнасці і стварэння індустрыі гасціннасці будзе павышэнне эфектыўнасці выкарыстання выгаднага геаграфічнага становішча краіны. Гасціннасць як комплексная форма абслугоўвання турыстаў будзе ахопліваць транспартную сферу, гасцінічны і рэстаранны бізнес, забаўляльную індустрыю. У сувязі з гэтым выхад на якасна новы ўзровень развіцця рынку турыстычных паслуг будзе забяспечаны праз: развіццё найбольш перспектыўных відаў турызму (культурна-пазнавальнага, медыцынскага, аздараўленчага, спартыўнага); паслабленне візавых патрабаванняў для ўязных турыстаў у мэтах прыцягнення большай колькасці замежных гасцей; павышэнне якасці абслугоўвання турыстаў на аснове ўкаранення міжнародных стандартаў; укараненне перадавых тэхналогій і інструментаў у сістэму прасоўвання турыстычных паслуг Беларусі на сусветным рынку; выкарыстанне механізму дзяржаўна-прыватнага партнёрства для ўключэння айчынных і замежных інвестараў у развіццё турыстычнай інфраструктуры.

Эканоміка ведаў — гэта новая, маладая эканоміка. Менавіта маладое пакаленне грамадзян Беларусі павінна сыграць вырашальную ролю ў пераходзе нашай краіны да інавацыйнага шляху развіцця. Будуць істотна пашыраныя меры падтрымкі таленавітай, адоранай моладзі. Сістэма гарантыі першага працоўнага месца для выпускнікоў будзе захавана і дапоўнена мерамі садзейнічання занятасці ў сферы малога і сярэдняга бізнесу. Будзе перафарматаваны дзейны кадравы рэзерв з уключэннем у яго перспектыўных маладых кіраўнікоў. Дзяржава падтрымае валанцёрскую дзейнасць у маладзёжным асяроддзі.

Асноўны прыярытэт маладзёжнай палітыкі застанецца нязменным — выхаванне ў маладога пакалення адданасці незалежнай Беларусі і любові да роднай зямлі.

У бягучай пяцігодцы асноўныя намаганні будуць сканцэнтраваны на скарачэнні міжрэгіянальных адрозненняў ва ўзроўні і якасці жыцця насельніцтва праз развіццё сацыяльнай інфраструктуры, паступовае павышэнне і выраўноўванне сацыяльных стандартаў. За кошт канцэнтрацыі рэсурсаў на ключавых кірунках, здольных забяспечыць максімальнае развіццё тэрыторый, эфектыўнага выкарыстання мясцовага рэсурснага патэнцыялу і канкурэнтных пераваг будуць сфарміраваны цэнтры эканамічнага росту, дзе будуць сканцэнтраваны сучасныя вытворчыя структуры, аб'екты інжынерна-тэхнічнай і сацыяльнай інфраструктуры.

Асаблівую ўвагу плануецца надаць прымяненню механізмаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Развіццё інфраструктуры ва ўзаемасувязі з размяшчэннем вытворчасцяў дасць магчымасць забяспечыць развіццё тэрыторый са складаным эканамічным становішчам, скараціць разрыў ва ўзроўні і якасці жыцця насельніцтва ў гарадах розных катэгорый і сельскай мясцовасці.

У пятай пяцігодцы мы спынім падзенне і вернем рост эканомікі. Акрамя дасягнення базавых мэт (рост ВУП, рэальных даходаў, працягласці жыцця) мы зробім самае галоўнае — закладзём падмурак новай эканомікі, эканомікі ведаў і паслуг.

Мы пераўтворым нашу родную зямлю, робячы яе ўтульнай і квітнеючай. Такой мы бачым Беларусь праз пяць гадоў — у 2020 годзе. Такой яна абавязкова стане. Усё ў нашых руках!

Фота з архіва "К" і Сяргея ЖДАНОВІЧА

У ноч на 22 чэрвеня ў Брэсцкай крэпасці ізноў будуць гучаць стрэлы і выбухі, дазваляючы адчуць вусціш першых хвілін самай спусташальнай для нашага народу вайны. У гэты дзень сёлета -- 75-я ўгодкі яе пачатку. Згадкі пра іх – не толькі вяртанне ў мінулае, але і сведчанне таго, што сумныя ўрокі засвоеныя. Нядаўні выставачны дэбют (праект "Таму што…" у Палацы мастацтва) студэнта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Вадзіма Цяцёркіна "Шар колеру хакі" выяўляе бачанне вайны вачыма маладога пакалення -- як стыхіі, што нівеліруе чалавечую асабовасць, пераўтвараючы ўсе светлыя мары і памкненні ў бясформенную масу.

Думкі пра мір

Па сваім шляху

У рамках V Усебеларускага народнага сходу, які адбудзецца ў Мінску 22 — 23 чэрвеня, пройдзе і ўрачысты вечар. Гледачамі гэтай тэатралізавана-канцэртнай праграмы ў Палацы Рэспублікі стануць дэлегаты і, вядома, усе, хто ўключыць тэлевізійную трансляцыю.

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Нашай незалежнай дзяржаве, — гаворыць рэжысёр вечарыны, дырэктар Дырэкцыі спецпраектаў тэлеканалу "АНТ" Анжаліна Мікульская, — спаўняецца 25 гадоў. Таму вечарына называецца "Наш шлях" — і гэтую ідэю мы хочам пранесці праз увесь канцэрт, а дакладней, мініспектакль. У ім ёсць галоўны герой — наш сучаснік, якому таксама, як і нашай Незалежнай Беларусі, 25 гадоў. Гэта ж цэлае пакаленне ўзрасло! Вось і вечар пабудаваны на паралелях з чалавечым сталеннем. Там ёсць блокі "Дзяцінства", "Падлеткавасць", "Маладосць", "Сям'я", "Грамадзянскасць". І, такім чынам, прасочваецца рост у чалавеку грамадзянскіх пачуццяў, разумення адказнасці не толькі за сябе і сваіх блізкіх, але і за будучыню нацыі.

У адпаведнасці з канцэпцыяй урачыстасці і самога Усебеларускага сходу ў вечарыне возьмуць удзел не толькі сталічныя знакамітасці — тыя ж Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч, але і лепшыя творчыя калектывы з усіх куткоў краіны. Прадстаўнікі ўсіх абласцей Беларусі з'яднаюцца ў зводным хоры. Запрошаны і расійскі госць: Леў Лешчанка, у 2012 годзе ўшанаваны спецыяльнай узнагародай Прэзідэнта Беларусі "Праз мастацтва -- да міру і ўзаемаразумення", заспявае разам з нашымі "Сябрамі".

— Будуць і іншыя сюрпрызы, — запэўніла Анжаліна Уладзіміраўна. — Іна Афанасьева, Ірына Дарафеева і Іскуі Абалян выступяць у трыа. Кранальным момантам, мяркую, стане выхад Алены Ланской у атачэнні трох-пяцігадовых дзяцей — выхаванцаў школы гімнастыкі. Упрыгожыць відовішча і 3D-графіка, спалучаная з танцавальнымі нумарамі. Прагучыць, зразумела, гімн Усебеларускага сходу, створаны Анатолем Чэпікавым. Але да ўрачыстай вечарыны была напісана яшчэ адна песня — "Свой шлях", і яе прэм'ера адбудзецца акурат у час канцэрта.

— Ніякай асаблівай "гісторыі стварэння" песні "Свой шлях", — распавёў аўтар яе музыкі Леанід Шырын, — няма. На той час, калі мы размаўлялі з рэжысёрам Анжалінай Мікульскай, у мяне ўжо былі некаторыя накіды. Даведаўшыся пра канцэпцыю канцэрта, Наталля Тамбоўцава, з якой мы супрацоўнічаем ужо не ўпершыню, дапісала другі куплет. Аранжыроўку зрабіў цудоўны джазавы піяніст Максім Пугачоў. А праспявае новую песню Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Валерый Дайнэка. Мы з ім даўно знаёмыя, а вось супрацоўнічаць неяк не даводзілася. Вядома, хацелася б, каб песня палюбілася, пайшла "ў народ" і, такім чынам, знайшла б таксама "свой шлях" да сэрцаў слухачоў.

К

22 — 23 ЧЭРВЕНЯ Ў МІНСКУ — V УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД



Барыс СВЯТЛОЎ,
міністр культуры
Рэспублікі Беларусь

Міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў, адказваючы на пытанні прэсы, акрэсліў найбольш актуальныя кірункі сферы культуры, якія будуць вынесены на V Усебеларускі народны сход, перадае БелТА.

Па словах Барыса Святлова, важна ствараць такія ўмовы, каб сфера культуры больш актыўна зарабляла самастойна, тым самым можна палегчыць нагрузку, якая ляжыць на дзяржаве па фінансаванні сферы. "Усю культуру аддаць на самаакупнасць немагчыма, — адзначыў міністр. — Высокую, акадэмічную культуру трэба падтрымліваць. У той частцы, якая тычыцца менавіта нейкіх узораў культуры, павінна быць поўная падтрымка дзяржавы, у астатнім — максімальна зрабіць так, каб нашы ўстановы культуры сталі зарабляць грошы ".

На V Усебеларускім народным сходзе, па словах міністра, будуць закрануты такія напрамкі, як прафесійнае мастацтва, народная творчасць і падрыхтоўка кадраў у сферы культуры. Плануецца падвесці вынікі мінулай пяцігодкі. У прыватнасці, плануецца разгледзець вынікі рэалізацыі дзяржпраграмы адраджэння тэхналогій і традыцый вытворчасці слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі "Слуцкія паясы" на 2012 — 2015 гады.



Ірына ДАРАФЕЕВА,
заслужаная артыстка
Рэспублікі Беларусь,
загадчык кафедры
мастацтва эстрады
Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта культуры і мастацтваў

— На Пяты Усебеларускі сход збіраюся з самым пазітыўным настроем. Прыемна, што мне выпаў такі гонар — і адначасова адказнасць, бо ва ўсіх нас ёсць свае надзеі на гэты самы, бадай, галоўны форум у жыцці краіны. Спадзяюся, што частка пытанняў, закранутых на ім у цяперашні Год культуры, будзе тычыцца сферы мастацтва. Хацелася б, калі надасца такая магчымасць, агучыць і свае думкі на гэты конт.

Колішняе дзяржаўнае рашэнне аб 75-ці адсотках беларускай музыкі ў эфіры дало творчы ўсплёск, на гэтай хвалі з'явілася нямала папулярных сёння, а тады зусім новых аўтараў і калектываў. З цягам часу суадносіны "наша — замежнае" змяніліся, і моладзь зноў, нават маючы перамогі ў конкурсах і тэлешоу, багаты рэпертуар і запісаныя кампакт-дыскі, не можа прабіцца на вялікую сцэну, якой стаўся тэлеэкран. Другая праблема непасрэдна звязана з БДУКіМ, дзе я ўзначальваю кафедру мастацтва эстрады. У нашай навучальнай установы, як ні дзіўна, няма ўласнай тэатральна-канцэртнай залы. Так, мы ладзім выступленні на сцэне Маладзёжнага тэатра эстрады, у Музычным тэатры паставілі мюзікл "Дуброўскі", які стаў рэпертуарным, зараз рыхтуем новую прэм'еру — "Казанова" ўсё таго ж Кіма Брэйтбурга. Але ўсё гэта — у арандаваных залах. Ці ж не парадокс?..

Ганна КОНАНАВА,
старшы выкладчык кафедры
малюнка, жывапісу, скульптуры
Беларускай дзяржаўнай акадэміі
мастацтваў, кандыдат
мастацтвазнаўства

— Міжнародны прэстыж нацыі стварае творчая эліта. На сёння работа дзяржавы па выхаванні і падтрымцы творчай інтэлігенцыі знаходзіцца на годнай вышыні. І ўтрымліваецца гэтая планка праз штодзённы маніторынг варункаў крэатыўнай дзейнасці. Па-за ўвагай не застаюцца і прыватныя моманты забеспячэння творчых працэсаў. Бо калі ўкладзены сур'ёзныя сродкі ў прафесійную адукацыю маладога спецыяліста, але пры гэтым адсутнічаюць умовы для рэалізацыі атрыманых ведаў і навыкаў — грошы, лічы, змарнаваныя. Архітэктару, мастаку неабходная майстэрня; акцёру, музыканту, танцору — сцэна, кінааператару — тэхнічны рыштунак і гэтак далей. І калі з адукацыяй усё добра, але ў паслядыпломным жыцці ўзнікаюць праблемы, напрацаваны ў час навучання творчы патэнцыял можа застацца незадзейнічаным у культурным працэсе. Праз гэта выяўляецца небяспека ўзнікнення фінансавых дзірак і міграцыі спецыялістаў культуры.

Пытанне, на якое варта звярнуць увагу, — гэта захаванне ўжо існуючай матэрыяльнай базы сістэмы мастацкай, музычнай, тэатральнай адукацыі і давядзенне яе да сусветных стандартаў. Важна здзейсніць удумлівае, ашчаднае ўкараненне Балонскага працэсу ў сістэму нашай адукацыі, узяць толькі лепшае. Бо, як кажуць, "прышчэпка" мусіць умацаваць кроў, але не змяніць генетычны код.

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.

Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 4 277. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 17.06.2016 у 21.30. Замова 2400. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

З сябрамі — у Александрыю

9—10 ліпеня ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці ў чарговы раз пройдзе традыцыйнае свята "Купалле" ("Александрыя збірае сяброў"). Падчас мерапрыемства шматлікіх гасцей свята чакаюць самыя розныя цікавосткі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Напярэдадні свята ў Александрыі прайшло выязное пасяджэнне аргкамітэта мерапрыемства, якое ўзначаліла намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі, старшыня аргкамітэта свята "Купалле" Наталля Качанава. Па яе словах, гэта падзея з кожным годам набірае ўсё большую папулярнасць, прырастае новымі гасцямі і сябрамі.

— Мы ўпэўнены, што ў гэтым годзе свята збярэ яшчэ больш удзельнікаў, — адзначыла Наталля Качанава. — Паколькі бягучы год асаблівы, ён аб'яўлены Годам культуры, усіх чакаюць новыя цікавыя праекты і мерапрыемствы.

Так, па словах намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Алены Бабровай, для гасцей свята будзе арганізаваны экскурсійны маршрут "Александрыйская вандроўка" па асноўных творчых пляцоўках праекта. Галоўнай культурнай падзеяй свята стане гала-канцэрт "Купальская казка" з удзелам зорак беларускай і замежнай эстрады. Плануюцца паказальныя конна-спартыўныя выступленні, дэманстрацыйныя аэравыступленні, работа дзіцячых атракцыёнаў, запальванне купальскіх вогнішчаў, святочны феерверк, лазернае шоу і многае іншае.

Але і гэта, натуральна, не ўсё. Як адзначыла на тым жа выязным пасяджэнні міністр інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч, падчас свята "Купалле" ў Александрыі будзе дадзены старт урачыстасцям, прысвечаным 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У павільёне "Друкарскі двор XVI стагоддзя" ўстановяць абсталяванне, зробленае па тагачасных чарцяжах, — друкарскі станок накшталт таго, на якім Францыск Скарына друкаваў свае кнігі. Кожны ахвотны зможа ўбачыць, як рабілася тады папера, як друкавалася кніга, і сваімі рукамі зрабіць афорт старонкі з Бібліі Францыска Скарыны.

— Гэта будзе добрая інтэрактыўная пляцоўка, задача якой яшчэ раз прыцягнуць увагу гасцей да вялікай культурнай спадчыны Беларусі, да таго, што наша краіна дала шмат славянскаму свету, — падкрэсліла Лілія Ананіч.

Як адзначыла міністр інфармацыі, на творчай пляцоўцы "Друкарскага двара" будуць прадстаўлены і кнігі класікаў беларускай літаратуры, якія складаюць гонар нацыянальнага кнігавыдання, а таксама творы сучасных пісьменнікаў.

— Канцэпцыяй свята прадугледжана работа "Горада сяброўства", што прыме больш за 600 майстроў і які ўключае 3 святочныя вуліцы: Мінскую, Маскоўскую і Кіеўскую, — адзначыў дырэктар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы Алег Хмялькоў. — Таксама тут будзе працаваць творчая дэлегацыя з Літвы. Работа будзе арганізавана па прынцыпе кірмашовага дзеяння: гасцей сустрэнуць мабільныя групы аніматараў і музыкантаў. Усіх будуць частаваць салам, маласольнымі агуркамі, мёдам і, вядома, вясёлым народным гумарам, песнямі і прыпеўкамі.

На кожнай вуліцы таксама будуць размешчаны атракцыёны-фотаатэлье з каларытнымі роставымі фігурамі ў нацыянальных строях. Творчыя групы беларускіх, рускіх і ўкраінскіх персанажаў будуць ствараць на гэтых міні-пляцоўках кірмашовую атмасферу. Таксама кожны ахвотны зможа прыняць удзел у тканні рэкорднага купальскага пояса, над якім цяпер працуюць народныя ўмельцы з 17 раёнаў Магілёўскай вобласці. Ягоная даўжыня на сёння перавысіла 70 метраў, а пасля свята і гэты рэкорд, натуральна, будзе пабіты…

Летась свята "Купалле" сабрала каля 70 тысяч гасцей. Як мяркуюць арганізатары, сёлета мерапрыемства наведаюць амаль 100 тысяч чалавек. Такім чынам, на думку намесніка Прэм'ер-міністра Беларусі Наталлі Качанавай, свята "Купалле", як частка падзейнага турызму, будзе садзейнічаць папулярызацыі беларускай культуры ў свеце.

— Такія творчыя, крэатыўныя праекты прыцягваюць да нашай краіны больш увагі і забяспечваюць рост патоку турыстаў, — адзначыла падчас выязнога пасяджэння віцэ-прэм'ер. — А нам насамрэч сёння ёсць што паказаць, чым ганарыцца. Нашы госці з задавальненнем адкрываюць для сябе новую Беларусь — гасцінную, мірную, чыстую і добраўпарадкаваную, з багатай самабытнай культурай і гісторыяй.

На думку Наталлі Качанавай, чым больш у краіне будзе цікавых творчых праектаў, чым больш маштабна яны будуць праводзіцца, тым больш іншаземцаў зможа даведацца пра Беларусь:

— Сёння наша краіна можа зарабляць не толькі на вытворчасці нейкіх тавараў, але яшчэ і на паслугах. У валавым унутраным прадукце паслугі сёння складаюць каля 50 працэнтаў, але мы маем патэнцыял для таго, каб на паслугах, у тым ліку турыстычных, зарабляць яшчэ больш.

К

"Зоркі…" — зоркам

У мінулую суботу ў Мінску ўручалі галоўную гуманітарную ўзнагароду СНД — прэмію "Зоркі Садружнасці-2016".

Яе лаўрэатамі сёлета сталі беларускія біёлагі Уладзімір Рашэтнікаў, Уладзімір Ціток і Алена Спірыдовіч, народны артыст СССР Фархад Шамсі аглы Бадалбейлі з Азербайджана, армянскі вучоны-фізік Сяргей Амбарцумян, генеральны дырэктар Нацыянальнай акадэмічнай бібліятэкі Казахстана Умуткан Муналбаева, народны артыст Кыргызстана Муратбек Бегаліеў, народны пісьменнік Малдовы Ён Друцэ, народны артыст СССР мастацкі кіраўнік Малога тэатра Расіі Юрый Саломін (на фота) і народны мастак Таджыкістана Вафо Назараў.

Старшыня праўлення Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Азербайджана ў Расіі Палад Бюльбюль аглы на цырымоніі ўручэння прэміі ў Мінску зазначыў: "Нельга жыць у ізаляцыі, трэба быць адкрытымі, абменьвацца ведамі, каб мы адчувалі нейкую агульнасць людзей гуманітарнай прасторы, асабліва культуры і мастацтва". Разам з дыпламатам прэмію ў Мінску ўручаў сустаршыня праўлення МФГС, спецыяльны прадстаўнік прэзідэнта Расіі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл Швыдкой. А гасцей цырымоніі віталі міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў і міністр інфармацыі краіны Лілія Ананіч.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Фотафакт

16 чэрвеня ў рамках I Беларускіх тэатральных сезонаў у Францыі Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы паказаў у пастаноўцы мастацкага кіраўніка беларускай трупы Мікалая Пінігіна інтэлектуальную камедыю "Арт" паводле п'есы французскага аўтара Ясмін Рэза на сцэне "Les Feux de la Rampe" ў Парыжы. Услед за паказам адкрылася выстава айчыннага тэатральнага плаката, дзе прадставілі работы сучасных мастакоў. А 13 чэрвеня ў парыжскім тэатры "Сэн-Жорж" беларускія мастакі ўпершыню былі ўзнагароджаны прэстыжнай прэміяй Тэйлара. Лаўрэатамі сталі Валянціна Шоба з Гродна і Сяргей Парцянкоў з Гомеля. Узнагарода атрымана па выніках дэбюту нашай дэлегацыі ў выставе "Art Capital" ў знакамітым мастацкім салоне "Гран Пале" восенню 2015-га.

Фота з Facebook Юліі КАМІНСКАЙ

Артысты Алег Гарбуз, Сяргей Чуб і Павел Харланчук-Южакоў.

2016 ГОД КУЛЬТУРЫ

Ініцыятыва — бадай самае каштоўнае, што ёсць у развіцці творчасці і культуры. І важна, што ў Год культуры гэтая ініцыятыва праяўляецца з падвоенай энергіяй. А хэштэг #2016годкультуры стаў назвай новай рубрыкі "К" і пазнакай для такіх матэрыялаў на сеціўных рэсурсах газеты.

Як "адзвінелі" Паставы?

10 — 12 чэрвеня Паставы на Віцебшчыне традыцыйна сталі пляцоўкай для аматараў народнай музыкі. Ужо ў 19 раз фестываль "Звіняць цымбалы і гармонік" прайшоў пад статусам міжнароднага. Хронікі ж фэсту вядуцца з 1987 года, калі ён быў яшчэ рэспубліканскім святам "Грай, гармонік!" у абласным цэнтры.

Аліна САЎЧАНКА,
Мінск — Паставы— Мінск /
Фота аўтара

Падчас адкрыцця фестывалю.

Анатоль Собаль, мастацкі кіраўнік ансамбля "Паазер'е".

Андрэй Шклёда, майстар па вырабе народных інструментаў з Мазыра.

Самыя малодшыя ўдзельнікі "Хто каго?".

Жыхары Паставаў цёпла згадваюць гады, калі імпрэзу іх горада наведвалі дэлегацыі з далёкага замежжа: тут былі і грузіны, і венесуэльцы, і венгры. Сёлета гасцямі фестывалю "Звіняць цымбалы і гармонік" сталі не менш значныя артысты — нашы бліжэйшыя суседзі з Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі ды Эстоніі. Па-сутнасці, фэст праходзіў пад шасцю сцягамі (не трэба забывацца пра айчынных музыкаў), што зусім не мала ў рэаліях сусветнага эканамічнага крызісу. Але найперш "Цымбалы і гармонік" адбываюцца для сваіх, мясцовых, якія чакаюць летніх дзён з нецярпеннем, рыхтуюцца, дапамагаюць адзін аднаму ў гэтым.

Журы фестывалю заўсёды лічыцца не менш шаноўным за ўдзельнікаў. Для Паставаў вялікі гонар у чарговы раз прымаць народнага артыста Беларусі, галоўнага дырыжора Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя Іосіфа Жыновіча Міхаіла Казінца, народнага артыста Беларусі, мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора Нацыянальнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча Міхаіла Дрынеўскага, намесніка старшыні Беларускага фонду культуры Тадэвуша Стружэцкага, прафесара, загадчыка кафедры баяна і акардэона Акадэміі музыкі Мірона Булу... Старшыня журы Міхась Казінец на прэс-канферэнцыі 11 чэрвеня, дарэчы, прызнаўся, што суддзі хвалююцца не менш за выканаўцаў, таму галоўнае мерапрыемства фестывалю — творчае спаборніцтва "Хто каго?" — ён хутчэй назваў бы "Хто за каго?"

І сапраўды, зала Дома культуры вельмі цёпла прыняла выступленні калектываў і салістаў, якія ўмоўна дзяліліся на дзве часткі: маленькую дзіцячую і дарослую, больш разгорнутую ды шматнацыянальную. Неаднойчы чуліся шчырыя словы захаплення з боку слухачоў і каманды журы. Гран-пры атрымаў знакаміты пастаўскі ансамбль пад кіраўніцтвам Анатоля Собаля "Паазер'е", які ў гэтым годзе адзначае сваё 25-годдзе.

Дарэчы, гэты год для Паставаў выдаўся на рэдкасць багатым на юбілеі. Споўнілася 230 год з дня нараджэння культавай асобы для гэтага населенага пункта — графа Канстанціна Тызенгаўза, вядомага вучонага, калекцыянера, мастацтвазнаўцы. Менавіта ён, унучаты пляменнік знакамітага Антонія, заснаваў у Паставах арніталагічны музей, які адзначаў у дні фестывалю сваё 200-годдзе новай выставай, створанай супрацоўнікамі падчас віленскай экспедыцыі. Нельга забыцца і на герб горада — гісторыка-геральдычны помнік краіны, ён з'яўляецца аднагодкам музея.

Наогул, XIX Міжнародны фестываль народнай музыкі "Звіняць цымбалы і гармонік" можна назваць дзеяй рознабаковай. Тры дні фэсту змясцілі ў сабе як традыцыйныя конкурсы і канцэрты — "Хто каго?", "Пастаўскі баль", тэатралізаванае прадстаўленне "Музыка беларускіх палацаў і сядзіб", канцэрт класічнай музыкі ў касцёле, — так і мерапрыемствы, разлічаныя на масавага наведвальніка: агляд-конкурс сельскіх падворкаў з частаваннямі, выступленне эстрадных артыстаў, дыскатэка з удзелам дзі-джэяў Віцебскай вобласці.

К

"Берагіня": конкурс за конкурсам

З 23 да 26 чэрвеня ў гарадскім пасёлку Акцябрскі будуць праходзіць заключныя імпрэзы чарговага Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня". Ім папярэднічалі раённыя і абласныя адборы ўдзельнікаў. У Акцябрскім выступяць дзіцячыя і дарослыя беларускія гурты, а таксама госці з Чэхіі, Сербіі, Літвы, Польшчы, Украіны, Расіі.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Самым эмацыйна насычаным мерапрыемствам фестывалю становіцца звычайна конкурс танцавальных пар. Удзельнікі гуртоў у якасці гледачоў з пляскам, тупатаннем і віскам падтрымліваюць "свае" пары, хвалююцца мастацкія кіраўнікі, напружана працуе журы… Сёлета конкурс пройдзе 23 — 24 чэрвеня. Расцягнецца ён на два дні, бо вызначэнне пераможцаў праходзіць у тры этапы, фінальнаму адбору папярэднічае чвэрць- і паўфінал.

Акрамя конкурсу танцавальных пар пройдуць спаборніцтвы салістаў-выканаўцаў беларускіх народных традыцыйных танцаў, турнір дзіцячых калектываў, якія выканаюць карагод, кадрылю, імправізаваны танец, найгрыш, твор народнай прозы. У конкурснай праграме "Песенная творчасць" удзельнікі пазмагаюцца ў намінацыях "Ансамблевыя спевы", "Ансамблевыя мужчынскія спевы", "Сольныя спевы". На конкурсе музычных інструментальных капэл традыцыйнага складу "Дудар" удзельнікі пакажуць праграмы "Сольнае выканальніцтва: дуда, скрыпка, цымбалы", "Траіста музыка", "Ансамблевае выканальніцтва". Большасць абласцей прадставяць па адным дзіцячым гурце-ўдзельніку.

Увечары 24 чэрвеня пройдуць канцэрты замежных калектываў. 25 чэрвеня — конкурсная праграма "Традыцыйнае вяселле", падчас якой удзельнікі прадэманструюць вясельныя абрады сваёй мясцовасці. Увечары жыхароў і гасцей Акцябрскага чакаюць на свята "Рудабельскае Купалле".

На працягу фестывалю будуць працаваць выставы "Беларускія народныя музычныя інструменты" і "Вясельныя строі Рудабельшчыны і ваколіц" у Акцябрскім Цэнтры гісторыі і культуры. Іх урачыстае адкрыццё адбудзецца 23 чэрвеня. Аматары традыцыйнага адзення не павінны прапусціць таксама прэзентацыю народных строяў "Традыцыя і сучаснасць" 26 чэрвеня. Яна пройдзе падчас "Рудабельскага кірмашу". Можна будзе яшчэ раз паслухаць фальклорныя калектывы Беларусі і замежжа, набыць рамесніцкія вырабы на рэгіянальных падворках, паўдзельнічаць у майстар-класах па танцах, гульнях, народных рамёствах. Госцем кірмашу стане мазырскі рыцарскі клуб "Шатун". Завяршыць кірмаш і фестываль увогуле канцэрт фольк-гурта "Палац".

К

Ад краязнаўства да тэхналогій

Адным з найбольш папулярных профіляў для сельскіх бібліятэк нашай краіны з'яўляецца краязнаўчы, калі ўстановы збіраюць і акумулююць звесткі пра мясцовыя славутасці, важныя падзеі і шанаваных людзей.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Аднак кожны бібліятэкар пасвойму разумее краязнаўчую работу: для кагосьці гэта справа жыцця, а для іншага — лішняя нагрузка і фармальнасць. Пры гэтым у кожнага бібліятэкара, які сутыкаецца з гэтай працай, з'яўляюцца тыя ці іншыя пытанні. Знайсці адказы на гэтыя пытанні паспрабавалі ў Клімавічах на базе цэнтральнай раённай бібліятэкі, дзе днямі адбыўся семінар бібліятэкараў Клімавіцкай бібліятэчнай сеткі на тэму "Бібліятэчнае краязнаўства: новыя тэндэнцыі і традыцыйныя каштоўнасці".

Асноўным на семінары стала пытанне эфектыўных форм краязнаўчай работы публічных бібліятэк на сучасным этапе. Сваім бачаннем на гэты конт падзялілася загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Марыя Шылава. У прыватнасці, для папулярызацыі радзімазнаўства сярод сваіх калег абвесціла конкурс на лепшую бібліяграфічную прадукцыю краязнаўчай тэматыкі "Я тут жыву, і край мне гэты мілы".

Не менш важнае пытанне ўзняла метадыст Юльяна Клімянкова — выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій па краязнаўстве. Бібліятэкары мелі магчымасць убачыць розныя варыянты краязнаўчых рэсурсаў, размешчаных у інтэрнэце: сайты і блогі, слайд-шоу і буктрэйлеры. Удзельнікі семінара даведаліся пра арганізацыю, дзейнасць і перспектывы цэнтраў краязнаўчай інфармацыі ў бібліятэках, а таксама пра вопыт работы цэнтральнай бібліятэкі па выпуску друкаванай прадукцыі пра рэгіён.

Дарэчы, нядаўна Клімавіцкая ЦРБ прыняла і раённы форум творчай інтэлігенцыі "Год культуры крочыць па краіне".

К

Свіслач: кніжнае свята

На пачатку верасня Рагачоў прыме традыцыйны Дзень беларускага пісьменства. Аднак і іншым раёнам ніхто не замінае правесці рэгіянальныя святы беларускай кнігі. Так, ужо заўтра ў Свіслачы, што на Гродзеншчыне, упершыню адбудзецца буйны раённы кніжны фестываль. Ініцыятарам такога мерапрыемства стала раённая бібліятэка.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Раённы статус не павінен уводзіць у зман аматараў айчыннай літаратуры: на свята запрошаны многія айчынныя выдавецтвы. З іх удзелам створаць некалькі тэматычных пляцовак, як унутры бібліятэкі, так і вакол яе.

Скажам, сваю аўдыторыю чакае пляцоўка "Бібліятэка для дзяцей" з забаўляльна-пазнавальнай праграмай. Выстава "Інтэрактыўныя кнігі для самых маленькіх" пазнаёміць з кнігамі-пазламі, кнігамі-цацкамі, музычнымі выданнямі. "Інфармацыйна-выставачны комплекс" прапануе выставы самаробнай, а таксама рарытэтнай кнігі.

На думку ініцыятара праекта, дырэктара Свіслацкай раённай бібліятэкі Святланы Піваварчык, галоўная задача мерапрыемства — паказаць не толькі дзейнасць бібліятэкі, але, найперш, прыцягнуць увагу да чытання, да кнігі як да ўнікальнага артэфакта культуры.

Адметнасць фестывалю — удзел сельскіх бібліятэк раёна, якія прадставяць у межах пляцоўкі "Бібліятэкі Свіслаччыны" свае кірункі працы: фальклорны, этнаграфічны, краязнаўчы, духоўны. Апроч таго, запрошаны да ўдзелу прыходскія, а таксама школьныя бібліятэкі Свіслацкага раёна. Назавём толькі некаторыя праекты: "Поразаўская зямля — часцінка Радзімы", "Крыніца душы і натхнення", "Велічны свет мастацтва", "На шляху да духоўнай асветы", "У кніжнай памяці — гісторыя вайны", "Юбілейныя даты літаратурнага календара".

Яшчэ адна цікавостка — летняя чытальная зала "Альтанка для чытанкі" прапануе на свежым паветры за кубкам духмянай гарбаты пазнаёміцца з новымі перыядычнымі выданнямі, якія атрымлівае раённая бібліятэка.

У рамках мерапрыемства будзе праходзіць шмат літаратурных конкурсаў, а таксама дэманстравацца багата тэатралізаваных пастановак у выкананні калектываў гарадскіх і сельскіх клубных устаноў.

К

"Лічбавы" падыход

Ці лёгка быць аўтаномным?

Пару словаў пра новае ў дачыненні да фінансавання ўстаноў культуры Беларусі. За прыклад для такой гаворкі можна ўзяць тую сістэму, якая дзейнічае ў сферы культуры суседняй Расіі. Пабываўшы некалькі дзён на Браншчыне, я быў здзіўлены тым, што там у сферы культуры сёння існуюць як казённыя, так і бюджэтныя ды аўтаномныя ўстановы.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

У чым іх асаблівая ды прынцыповая розніца? Казённыя ўстановы культуры цалкам адпавядаюць сённяшнім беларускім, поўнасцю залежаць ад дзяржаўнага фінансавання, атрымліваюць субсідыі з раённых, абласных ці рэспубліканскіх органаў кіравання. А ўсе грошы, што зарабляюць на платных паслугах, яны павінны пералічваць на агульны рахунак вышэйшай арганізацыі — у бюджэт.

У сваю чаргу бюджэтныя ўстановы адрозніваюцца ад казённых тым, што калі яны ажыццяўляюць дзейнасць, якая прыносіць даход, дык гэтыя грошы могуць выкарыстоўваць на свае патрэбы, не пералічаючы іх у казну. Гэта, кажучы сучаснай мовай, той варыянт, які найбольш задаволіў бы многіх айчынных работнікаў культуры: дзяржава нас падтрымлівае фінансава, а тое, што мы зарабляем, — наша. Менавіта пра такую схему мне неаднойчы казалі многія кіраўнікі ўстаноў культуры ў рэгіёнах Беларусі. Маўляў, дайце нам нашы грошы — і ўсё будзе "ў ажуры", бо мы самі ведаем, што нам набываць, што рамантаваць, калі прэміраваць супрацоўнікаў, а калі — не.

Іншая справа, што кіраўнікі падобных устаноў культуры, на мой погляд, нагадваюць людзей са знакамітага выслоўя. Памятаеце, пра тых, хто хоча і рыбку з'есці, і ногі не замачыць? І сапраўды: субсідыі ад дзяржавы будуць, мае грошы ад мяне нікуды не падзенуцца, карацей, не жыццё настане, а маліна. Між тым, не ўсё так проста. Установа культуры ў Расіі, хай сабе і бюджэтная, поўнасцю падпарадкавана органам улады на месцах. І менавіта ўлады прымаюць канчатковае рашэнне пра тое, ці варта на пазабюджэтныя даходы набываць апаратуру ці інструменты, павышаць заробкі ці выплачваць прэміі ды ладзіць рамонт. Так што поўнай свабоды і тут няма, хоць, зразумела, яе нашмат больш, чым у казённых арганізацыях.

А калі хочацца яшчэ большай свабоды дзеянняў, дык вам у "клуб" аўтаномных арганізацый. Такія ўстановы культуры маюць сваім кіраўнічым органам не толькі ўладныя структуры, а і савет заснавальнікаў. Менавіта гэты савет размяркоўвае прыбыткі, аплачвае набыццё інструментаў, абсталявання, працуе са спонсарамі і гэтак далей. Акрамя таго, па рашэнні савета могуць быць прэміраваны супрацоўнікі, ім можа быць усталяваны той або іншы заробак, а яшчэ гэты кіраўнічы орган можа прыняць рашэнне аб узяцці крэдыту, укладанні свабодных фінансаў у банкаўскія дэпазіты і гэтак далей.

Што яшчэ? Аўтаномная арганізацыя, у адрозненне ад бюджэтнай, у значна большай ступені павінна разлічваць на сваю актыўнасць, бо заснавальнік (савет) фінансуе той аб'ём яе дзейнасці, які вызначаецца пэўнымі задачамі. І, натуральна, невыкананне нейкіх запланаваных паказчыкаў адбіваецца як на заробках супрацоўнікаў, так і на паспяховай ці стратнай рабоце ўстановы культуры.

Ёсць, канечне, і некаторыя іншыя асаблівасці аўтаномных арганізацый, але спынюся пакуль толькі на названых. І згадаю, што акрамя перавагаў, у аўтаномных арганізацый ёсць і пэўныя мінусы.

Гэта, у першую чаргу, рызыка. Бо калі ў бюджэтнікаў усё зразумела, спланавана і фінансуецца паводле зацверджанага загадзя каштарысу, дык аўтаномныя арганізацыі залежаць ад паступлення даходу (ад продажу білетаў, аказання дадатковых паслуг), ад кампетэнтнасці кіраўніцтва (скажам, не выключаецца, што могуць быць згублены фінансавыя сродкі, укладзеныя ў пэўны банк, не выплачаны ў вызначаны тэрмін крэдыт і гэтак далей). Да таго ж пралікі ў фінансавай сферы — гэта крымінальная адказнасць. Так што там, дзе большая свабода — там, натуральна, і большая адказнасць.

З маіх размоў з расійскімі работнікамі сферы культуры я зрабіў для сябе пэўныя высновы. Калі, скажам, арганізацыя досыць вялікая (кшталту абласнога музея ці рэгіянальнага метадычнага цэнтра) і можа зарабляць грошы на аказанні сваіх паслуг ды прыцягваць спонсарскія сродкі, дык ёй лепш быць аўтаномнай. А вось малым установам культуры — СДК, раённым музеям ці музычным школам больш мэтазгодна заставацца казённымі ці бюджэтнымі. Так працаваць больш звыкла, і, пэўна, не так страшна.

Мяркую, што з цягам часу падобная сістэма можа быць узятая "на ўзбраенне" і ў Беларусі. Але ці гатовы да гэтага айчынныя культработнікі? Ці гатовы яны "плаваць" у рынкавым моры і не патануць у яго фінансавых хвалях? Пытанне гэтае пакуль з даволі няпэўным адказам...

Погляд з боку

Статыстыка сведчыць — пры постіндустрыяльным тыпе эканомікі турызм становіцца ледзь не асноўнай крыніцай прыбытку для несыравінных краін. Для многіх еўрапейскіх гарадоў, некалі слаўных сваёй прамысловасцю і гандлем, постіндустрыяльная будучыня ўжо стала паспяховай сучаснасцю. І плынь ахвотных паглядзець саборы-руіны-музеі прыносіць ці не асноўны ўнёсак у мясцовы бюджэт.

Горад для сваіх

Як быць турыстычным цэнтрам, але жыць не турыстам адзіным

Антон СІДАРЭНКА

Вось толькі гарады гэтыя часцяком пачынаюць нагадваць нейкія турыстычныя дыснэйлэнды. Прынамсі, для саміх прыезджых, якія мараць адчуць гатычную аўтэнтыку з сярэднявечнай рамантыкай. Памятаю некаторае здзіўленне ад англійскага Ёрка, спусцелага пасля ад'езду турыстычных аўтобусаў каля 17-й гадзіны. Рабіць у цэнтры гэтага маленькага прыгожага мястэчка, слаўнага сваім велічным саборам, але зусім не прыстасаванага да паўсядзённага жыцця, увечары абсалютна не было чаго. Музеі (больш падобныя на навукова-папулярныя атракцыёны), рэстараны і крамкі сувеніраў пазачыняліся. На адлегласці некалькіх міль не засталося ніводнага паба, а паб у Брытаніі і ёсць паказчык жыцця. За англічан, якія так спрытна выкарыстоўваюць турыстычны патэнцыял сваёй шчодрай на каштоўнасці краіны, я толькі парадаваўся. Але пэўны асадак усё роўна застаўся.

А некалькі тыдняў таму давялося на шляху да радзімы пабываць у знакамітым ганзейскім горадзе Брэмене. Вядомым, як і ўсе сярэднявечныя заходнееўрапейскія гарады, сваім старым кварталам. У Брэмене апошні ўпрыгожаны гатычным саборам Святога Пятра і мясцовай турыстычнай мекай — скульптурай "Брэменскія музыкі". Самалёт вылятаў зранку, гатэль здымаць не мела сэнсу, і трэба было правесці на нагах вечар ды палову ночы. Сябры, праўда, забяспечылі мяне адрасам, па якім я мог прабавіць час. І адрас спатрэбіўся — стары турыстычны Брэмен (праўда, цалкам адбудаваны пасля бамбардзіровак саюзнікаў напрыканцы Другой сусветнай вайны), падобна Ёрку, спусцеў у паўгадзіны. Пасля восьмай вечара зачыніліся кафэ, крамы і рэстараны, і нават у знакамітых лонданскі Шордзіч, некалі аблюбаваны творчым людам, а цяпер звышмодны і ўсё больш дарагі.

Клубам аказаўся і будынак па адрасе, які на ўсялякі выпадак паведамілі мне сябры. А адным з яго гаспадароў — мастак Макс, родам з расійскага Омска, але з віцебскімі каранямі. Ён ветліва паказаў сваё незвычайнае жыллё. У 1944 годзе гэты будынак на беразе ракі Вэзэр з тоўстымі бетоннымі сценамі павінен быў хаваць ад бомбаў дзясяткі брэменскіх сямействаў. Потым ён доўга стаяў закінутым, пакуль на танны (яго ігнаравалі бюргеры) Вертэль не паклала вока багема. Бункер вырашылі ператварыць у жылы асабняк. Перагародкі, якія дзялілі яго на адсекі, разабралі. Верхні паверх ператварыўся ва ўтульную кватэру з велізарнай кухняй-гасцёўняй і адкрытай тэрасай з газонам, дрэвамі і выдатным выглядам на Вэзэр. А ніжні — у невялікую канцэртную пляцоўку з барам. Праўда, гаспадар-наватар з сямействам неўзабаве з'ехаў — бетонныя канструкцыі былога бункера патрабавалі велізарных выдаткаў на ацяпленне. І тады сюды засялілася творчая моладзь, якая стала актыўна выкарыстоўваць ніжні паверх як месца для канцэртаў і вечарынак.

Пасля джэнтрыфікацыі ўслед за багемай і рэстаратарамі ў калісьці напаўзакінуты квартал пацягнуліся людзі, багацейшыя за тыповую тутэйшую публіку. Кошты на нерухомасць стала растуць, і жыллё людзям мастацтва тут можа хутка аказацца не па кішэні.

Увогуле, стандартная схема для джэнтрыфікацыі — рэканструкцыі і абнаўлення будынкаў у раней нефешэнэбельных гарадскіх кварталах. Вертэль у гэтым сэнсе апынуўся тыповым прыкладам. Макс распавёў, што, услед за багемай і рэстаратарамі, у квартал пацягнуліся людзі, багацейшыя за тыповую тутэйшую публіку. Кошты на нерухомасць стала растуць, і жыллё людзям мастацтва тут можа хутка аказацца не па кішэні.

А пакуль на першым паверсе пачаўся канцэрт экстравагантнай поп-зоркі — тоўстага, вельмі харызматычнага барадача, на які сабралася з сорак маладых людзей. Канцэрт быў бясплатным — у сучаснай брэменскай багемы, як і ва ўсе часы, не тое каб густа з грашыма. Праўда, пасля выступу па крузе пусцілі капялюш, і ўдзячная публіка даволі актыўна дзякавала спеваку наяўнымі. Дзякаваць, сапраўды, было за што і выканаўцу, і арганізатарам — канцэрт атрымаўся. У тым ліку дзякуючы атмасферы, нязмушанай і нефармальнай.

Такой самай як на беразе Вэзэра, на які я выйшаў, каб завяршыць свой брэменскі вечар, што плаўна перайшоў у кароткую летнюю ноч. У адзін з першых цёплых дзён пасля доўгай дажджлівай вясны набярэжная была поўная тымі, хто выйшаў на шпацыр, і веласіпедыстаў. На суседняй лаўцы эмацыйна гутарыла на турэцкай пара тыповых стамбульцаў сярэдніх гадоў. На схіле кампанія падлеткаў рознага колеру скуры распальвала нешта духмянае. Цётка, якая праязджала міма на ровары на зайздроснай хуткасці, нечакана пажадала мне і бляшанцы ў маёй руцэ здароўя застольным нямецкім воклічам "Prost!"

І ніякіх турыстаў. Усе свае, нягледзячы на розны ўзрост, знешні выгляд ды астатнія прыкметы. Знакаміты гістарычны і эканамічны цэнтр Паўночнай Германіі аказаўся хатнім і камфортным не толькі для прыезджых. Няхай для таго, каб упэўніцца ў гэтым, трэба было адысці на кіламетр убок ад турыстычных маршрутаў. Такога спакою і ўлагоджанай самадастатковасці варта пажадаць і нам, тым, якія хочуць бачыць у сябе як мага больш гасцей. Госці — гэта, вядома, добра, але і пра сябе забываць не варта.

Ліст у рэдакцыю

Будынак на рагу вуліц Кісялёва і Багдановіча сёння і ў канцы XIX — пачатку XX ст.

Як дом ледзь не стаў... зданню

Хачу распавесці пра тое здзіўленне, якое я адчуў нядаўна на адной з вуліц Мінска, і пра тое, як потым падумаў: усё ж ёсць у сталіцы разумныя і незаспакоеныя людзі. Але пра ўсё па парадку.

Амаль усё жыццё, з 1953 года, жыву ў адным і тым жа мінскім доме на вуліцы Чырвонай. Усе вуліцы і завулкі навокал вельмі знаёмыя. Не аднойчы даводзілася хадзіць і ў раёне мінскага піўзавода "Аліварыя". Заснаваны ж ён быў у 1894 годзе графам Каралем Чапскім, атрымаўшы назву "Багемія". Папярэднікам быў драўляны бровар Рохлі Фрумкінай, створаны ў 1864 годзе. У 1896 годзе прадпрыемства было прададзена прадпрымальніку і стала называцца "Мінскі паравы піваварны завод №3 Франца Лекерта". Пасля рэвалюцыі прадпрыемства было нацыяналізавана, і яму было нададзена імя іншага Лекерта — Гірша, які не належаў да сям'і былога ўладальніка, але быў героем рэвалюцыі, дзеячам яўрэйскага рабочага руху, што ў 1902 годзе страляў у віленскага губернатара, параніў яго і за тое быў павешаны.

Карпусы прадпрыемства захаваліся да нашых дзён. Цяпер гэта рог вуліц Багдановіча і Кісялёва. У дарэвалюцыйны ж час гэтыя вуліцы, адпаведна, называліся Аляксандраўская і Старажоўская. Урэшце, і кварталы, якія прылягаюць да гэтага месца, маюць цікавае гіста-

Заспявалі. Што далей?

Валерый ДАЙНЭКА,
заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь

Летась мне давялося паўдзельнічаць у журы конкурсу "Заспявай.by 2.0", дзе ад маладых музыкантаў патрабавалася стварыць песні на вершы беларускіх класікаў, а таксама падрыхтаваць кавер на кампазіцыю айчынных аўтараў і выканаўцаў. І ведаеце, новы песенны матэрыял мне спадабаўся куды больш, чым кавер-версіі.

Я пачуў сапраўдную творчасць, спробу стварэння нейкага адмысловага гуку, адметную манеру спеву — тое, што і называюць сучасным гучаннем. Не было тут чарговых абрыдлых спробаў паўтараць ці імітаваць кагосьці, што ўласціва кавершчыкам усіх гатункаў. Ды і сутыкненне з літаратурным словам, а не проста тэкстамі, мабыць, паўплывала. А да вершаў у намінацыі "Спяваная паэзія" не згадаў варыянтаў з іншай музыкай. Дадам, што над запісамі прэтэндэнтаў на фінал давялося пасядзець даволі доўга, хоць, прызнаюся, далёка не ўсё я слухаў да канца. (Ужо даруйце, паважаныя аўтары, але калі не чапляе рэч, дык наўрад ці прафесіянал або шараговы спажывец музычнага прадукту праслухаюць твор да канца. Зараз трэкі пераключаюцца адным націскам, таму — "козыры" адразу!)

Тым не менш, прасякнуўся. І тут жа задумаўся. Няхай гэта толькі невялікая часцінка беларускай культуры, але ж — крок наперад. Ды хутчэй за ўсё з паспяховым даробкам маладых аўтараў нічога не будзе. (Цяпер, праз год, у тым пераканаўся, і спадзяюся, што фіналістаў конкурсу "Заспявай.by 3.0" чакае ў гэтым сэнсе больш справядлівы творчы лёс.) Калі па-сапраўднаму, дык трэба прымаць ва ўлік, што рынак перанасычаны, і тое амаль невырашальная праблема. Каб ісці далей, патрэбны прадзюсар (не адзін Уладзімір Кубышкін на ўсю краіну), што зацікаўлены ў творцах-пачаткоўцах і прапануе ім прыцягальныя ўмовы. Каб як у Маскве было: толькі тэлешоу скончылася, а ўжо вісяць рэкламы канцэрта асобы з не вельмі знаёмым прозвішчам, якое ўсё ж многія недзе чулі.

Але вернемся да нашага конкурсу. Па яго выніках набралася крытычная маса з 20 — 30 песень на беларускай мове. Але хіба ёсць ім месца ці ў айчынных фарматах на радыё ці на тэлебачанні, на фестывалях кшталту маладзечанскага ці віцебскага "Славянскага базару…"? Можна, канешне, выдаць пласцінку, амаль безвынікова спрабуючы прадаваць яе, можна выкласці творы ў сеціва ў выглядзе інтэрнэт-сінглу і скарыстацца з іміджавых дывідэндаў…

Але ў жывапісе, у паэзіі, у балеце, у эстраднай музыцы (безадносна да гэтага ці якога-колечы конкурсу) калі і склаліся беларускія традыцыі, дзесьці нават школы, якімі можна ганарыцца, дык усё тое — з іншай эпохі, калі была прастора адной вялікай краіны, чытай, вялізны абшар для рэалізацыі і пашырэння творчага плёну. Але ці дапамогуць сёння беларускай музыцы і культуры "абхадныя шляхі"? Можна зрабіць стаўку на краіну-суседку. Скажам, беларуская мова зрабіла пэўны "пралом" у Польшчы ў рок-кірунку, таму адпаведнага кшталту каманды едуць туды з задавальненнем. Ва Украіне таксама зацікаўленасць да беларускамоўных твораў стала прасочваецца, мяркую, у краінах Балтыі такая ж тэндэнцыя будзе падтрымана.

Адносна Расіі сітуацыя крыху іншая. Калі чалавек з'язджае туды з Беларусі, назад ён найхутчэй не вяртаецца: іншыя магчымасці, іншыя грошы. Гэта ў Савецкім Саюзе можна было хваліцца: вось, паглядзіце, гэта ж хлопцы з Мінска прыехалі. Зараз уся эстрада расійская. Тут не адмовіш: расіяне ўмеюць скарыстоўваць таленты на карысць сваёй культуры. Але прывязкі да радзімы размываюцца. Хто з Беларусі і Украіны, застаўшыся ў Маскве, адчувае сябе беларусам ці ўкраінцам? З іншага боку, тая ж Лайма Вайкуле не пераехала і, застаючыся папулярнай у Расіі, лічыцца гонарам Латвіі. Гэтак жа і Сафія Ратару.

І яшчэ. Многія маладыя айчынныя музыканты надта спадзяюцца на заклік "купляйце беларускае!"… Але ж трэба тое, да чаго заклікаем, і вырабляць так, каб куплялі. Гэта і прамысловай прадукцыі тычыцца, і творчай. Ну не возьмуць у эфір песню, калі яна нецікавая! Вось пры такой простай і адначасова складанай умове ў беларускамоўных песень ёсць шанц стаць папулярнымі ў Беларусі. Упэўнены, нашы вядомыя спевакі, аўтары не будуць замінаць натуральнаму працэсу абнаўлення. Наадварот: падтрымаюць!

Занатаваў Сяргея ТРАФІЛАЎ

Дзе паказацца тэатрам?

Ірына ЖЫЛАЧ,
педагог дадатковай адукацыі сярэдняй школы № 49 горада Мінска, кіраўнік тэатра-студыі "Крыштальны шар"

Як не хапае фестывальнага руху для дзяцей! У Беларусі безліч аматарскіх студый пры дамах культуры, палацах творчасці, школах і ДШМ, але дзе калектывам паказвацца, а іх кіраўнікам набірацца вопыту?

Аматарскім дзіцячым тэатрам я займаюся 35 гадоў. Пачынала з Салігорска: у мой час у Цэнтры творчасці дзяцей і моладзі дзейнічала пяць тэатральных калектываў! Аднойчы да нас завіталі Васіль і Ала Каткаўцы з Любані і распавялі пра ідэю: стварыць тэатральны фестываль для дзяцей. У Беларусі на той час нічога падобнага не існавала. Так я стала адным з родапачынальнікаў вядомага сёння адкрытага абласнога фестывалю тэатральнай творчасці "Чароўны куфэрак", які праходзіць раз на два гады на Любаншчыне.

Якое гэта было шчасце! Але колькі такіх тэатральных крыніц зараз існуе ў нашай краіне? Можна палічыць па пальцах. Летась ладзіўся юбілейны дзясяты "Чароўны куфэрак". У красавіку ў Баранавічах прайшоў VI Міжнародны фестываль-семінар юнацкіх і маладзёжных аматарскіх тэатраў "Паралельныя міры". На жаль, сышоў у нябыт легендарны Міжнародны фестываль "Крок у неба" (яго ідэйны натхняльнік, кіраўнік тэатра для дзяцей "Ронд" Ірына Маркава занялася дзіцячай кінашколай "Сінема")… Раз на два гады ў сталіцы праводзіцца гарадскі фестываль, але на яго накіроўваецца адзін калектыў з раёна. А ў Мінску каля 300 дзіцячых тэатральных студый! Гэту лічбу я добра ведаю, бо калісьці працавала галоўным рэжысёрам Цэнтра народнай творчасці ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама. Таму вялікі дзякуй Дзяржаўнаму музею гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, што яны ўвесну правялі тэматычны фестываль для школьных студый.

Часам чую, што не ўсе пастаноўкі, прывезеныя на тэматычныя форумы, маюць добры ўзровень… Тут усё ідзе ад густу і вопыту рэжысёра. Ды і ў айчынных прафільных установах сярэдняй і вышэйшай адукацыі не выкладаюць, як працаваць рэжысёру з дзецьмі. А ёсць свая спецыфіка, шмат нюансаў… Вось я: скончыла каледж, потым Універсітэт культуры і мастацтваў, але тонкасці працы са школьнікамі спазнала, назіраючы, як рэпеціруюць калегі. Бадай усяму, што я ўмею, навучылася, пераймаючы вопыт.

Зараз іншая бяда: усё менш людзей з прафільным дыпломам хоча ісці ў аматарскія калектывы… Заробак не самы вялікі, ды і школы, як ні шкада, глядзяць на нас як бы зверху ўніз. Для іх тэатральны гурток не самае галоўнае ў сістэме адукацыі. Бывае, пры адсутнасці дыпламаванага рэжысёра, тэатральным калектывам могуць "нагрузіць" настаўнікаў-прадметнікаў. Дэкарацыі, касцюмы, фанаграму — усё робіш за свой кошт, школа ні капейкі не выдаткоўвае. Магчыма, у фінансавым плане сітуацыю можна змяніць, калі студыя займее вызначаны статус. Напрыклад, калі мой колішні салігорскі калектыў "Вітамін-Т" атрымаў званне ўзорнага, установа культуры адразу пачала садзейнічаць нашым паездкам на фестывалі, прынамсі, выдаткоўвалі грошы, каб пашыць касцюмы ў атэлье.

Майму сённяшняму тэатру-студыі "Крыштальны шар" толькі тры гады. Бачу, што дзеці гатовыя прэтэндаваць на статус узорнага калектыву. Але ці патрэбна тое?.. Хіба для таго, каб на цябе прыходзілі глядзець прафесіяналы (раз на тры гады для пацвярджэння статусу ў аматарскую студыю накіроўваецца спецыяльная камісія).

За 35 гадоў змяніліся і дзеці: сталі не такімі закамплексаванымі, як раней, больш валодаюць інфармацыяй. Раней была праблема з хлопчыкамі. Зараз на сцэне іх столькі ж, як і юных актрыс. Калі я набірала тэатральныя класы, іх нават было болей за дзяўчынак! Наша справа ніколі не згасне! Школьнікам не хапае жывога слова, сапраўдных эмоцый. Можа таму, як да мяне ў студыю прыходзяць у верасні, так цягам года амаль стопрацэнтна застаюцца.

Занатавала Настасся ПАНКРАТАВА

рычнае мінулае. Так, праз квартал адсюль, на рагу Старажоўскай і Шырокай (цяпер вуліца Куйбышава), стаяў дом землямера-тапографа Івана Пуліхава, сын якога 27 студзеня 1906 года зрабіў замах на жыццё мінскага губернатара Курлава, за што быў пакараны смерцю. У другім напрамку, праз квартал па вуліцы Аляксандраўскай, знаходзілася духоўная семінарыя, заснаваная яшчэ ў 1793 годзе ў Слуцку, а ў 1840-м пераведзеная ў Мінск. На вуліцы Аляксандраўскай для яе ў 1892 годзе быў пабудаваны двухпавярховы каменны корпус. Будучыя святары, якія там навучаліся, 14 лютага 1905 года, пратэстуючы супраць рэакцыйнай сістэмы навучання, разграмілі класныя пакоі, кватэры рэктара і інспектара, знішчылі архіў і вучэбныя журналы. У выніку будынак семінарыі загарэўся, і з агнём ледзве справіліся мясцовыя пажарныя. Для ўціхамірвання семінарыстаў былі выкліканы войскі. Семінарыя часова была закрыта. Але ў красавіку 1905 года заняткі ўсё ж аднавіліся. Пасля рэвалюцыі 1917 года ў будынку семінарыі размяшчаліся пяхотныя курсы, потым — сярэдняя вайсковая навучальная ўстанова. У пачатку 1950-х тут змясцілі адкрытае ў Мінску Суворaўскае ваеннае вучылішча. У той час дом па вуліцы, якая ўжо насіла імя Максіма Горкага, перабудавалі, у яго з'явіўся яшчэ адзін паверх. Ну а вучылішча тут знаходзіцца і сёння.

> У хуткім часе я не паверыў сваім вачам: на доме, пра які мы вялі гутарку, **вісела новенькая шыльдачка,** дзе было пазначана: гэты будынак пабудаваны ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя, як і было насамрэч, а не ў 1950-я, што было пазначана на няслушнай таблічцы.

У мінулым на вуліцы Аляксандраўскай, амаль побач з будынкам семінарыі стаяў дом Гурэвіча, дзе ў 1891-м нарадзіўся паэт Максім Багдановіч, чыё імя мае зараз вуліца.

Ну а цяпер пра прычыны майго здзіўлення. Для гэтага зноў трэба прашпацыраваць да скрыжавання вуліц Багдановіча і Кісялёва. На процілеглым ад бровара баку вуліцы знаходзіцца яшчэ адзін цікавы будынак (па Багдановіча гэта дом № 24, а па Кісялёва — дом № 28). Галоўным фасадам ён выходзіць на вуліцу Кісялёва. Гэта адзін з нешматлікіх мінскіх будынкаў, пабудаваных у стылі мадэрн канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Ён мае асноўныя характэрныя ўласцівасці гэтага стылю. Двухпавярховы будынак складзены з чырвонай цэглы, на зашклёным прамавугольным эркеры, які ідзе ўздоўж усёй вертыкалі ўнутранай лесвіцы, па шкле зроблены дэкор у выглядзе выгнутых ліній, над дзвярыма пад'езда — паўкруглае арачнае акно, вокны дома таксама зверху крыху скругленыя, на эркеры і на бакавых частках фасада — пілястры, якія цягнуцца на абодва паверхі будынка, жывапісны каваны дэкор упрыгожвае балконы другога паверха. Бакавы фасад, што выходзіць на вуліцу Багдановіча, больш сціплы, але і тут маюцца пілястры і балкон з дэкарыраванымі парэнчамі. Такім чынам, будынак з усімі прыкметамі архітэктуры канца XIX — пачатку XX стагоддзя. І якое ж было маё здзіўленне, калі я на сцяне дома ўбачыў шыльдачку з надпісам, які сведчыў, што гэты будынак узведзены нібыта ў 1950-я. Гэта тым больш было дзіўна, што захавалася фота канца XIX — пачатку XX стагоддзя, на якім засняты той самы рог вуліц Аляксандраўскай і Старажоўскай, і тут мы бачым як стары бровар, так і знаёмы двухпавярховы цагляны дом.

Пра гэтую дзіўную шыльдачку на старым доме я расказваў сваім знаёмым, якія таксама здзіўляліся факту. Але, як аказалася, здзіўляцца нам прыйшлося нядоўга. У хуткім часе я праходзіў праз гэта месца і не паверыў сваім вачам: на доме, пра які мы вялі гутарку, вісела новенькая шыльдачка, дзе было пазначана: гэты будынак пабудаваны ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Пісьменнасць і розум перамаглі! Гэта і пацвердзіла, што ў нашай сталіцы ёсць незаспакоеныя і разумныя людзі, якія сочаць за тым, што робіцца на вуліцах горада.

Якаў ЛЕНСУ,
кандыдат мастацтвазнаўства

Дзяжурны па нумары

Па Мінску ў Парыжы сумаваць

Скандальна вядомаму маскоўскаму дызайнеру Арцемію Лебедзеву належыць нямала распрацовак, пра якія, нібыта, і казаць не варта, тым больш — сур'ёзна. Але яны ствараюць розгалас вакол ягонага імя і кланіруюцца. Да іх, у прыватнасці, належыць падобны на дарожны знак "Галоўная дарога" бляшаны ромб з тэкстам, які паведамляе, што побач з гэтым знакам "усе фатаграфуюцца". Ёсць ахвочыя пабачыць такі знак і ў Мінску.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Агулам на сёння такія знакі ўсталяваны больш як у 50 гарадах, пераважна расійскіх. Акрамя таго створана мноства варыяцый — гэта знакі, побач з якімі "ўсміхаюцца", "тэлефануюць маці", "загадваюць жаданні", "прызначаюць спатканні", "здымаюцца без штаноў" нават. Ідэя пайшла ў народ і народу спадабалася. Былі выпадкі, калі вулічныя вандалы псавалі ці ламалі такія знакі, але іх заўжды аднаўлялі па патрабаванні грамады, якая да згаданага "прыкола" прызвычаілася і ўспрымае яго як мясцовую адметнасць. Справа ў тым, што слуп з такім тэкстам можна паставіць як у чыстым полі, так і пасярод дэпрэсіўнай забудовы спальнага раёна.

Просьбу паставіць ромб з адпаведным надпісам на адной з вуліц накіравалі і ў Мінгарвыканкам. Ініцыятары абяцалі, што грошай на гэта яны прасіць не будуць, усё зробяць за свой кошт. Ім не тое каб адмовілі, але і не дазволілі. Адказ не надта ўцямны, але па сэнсе атрымліваецца, што, маўляў, у Мінску і так ёсць аб'екты, побач з якімі мінчане і госці фатаграфуюцца.

Я з павагай стаўлюся да грамадскай ініцыятывы, але ў дадзеным выпадку я на баку сталічнай улады. Добра, каб ідэя для Мінска была вартай. Скажыце, аднак, што добрага, калі ў нашай сталіцы з'явіцца чарговы клон лебедзеўскага прыколу? Нават калі гэту бляшаную шыльду лічыць арт-аб'ектам, дык Мінск паводле свайго статусу мусіць мець арт-аб'екты выключна ўнікальныя.

А між тым, нават інфармацыйная шыльда можа пры пэўных умовах быць арт-аб'ектам. У вёску Парыж, што на Пастаўшчыне, людзі спецыяльна прыязджаюць, каб сфатаграфавацца побач з дарожным указальнікам "Парыж". А шыльда з надпісам "Парыжскі сельскі дом культуры" ўвогуле пакідае іх у трансе. І нічога прыдумляць не трэба.

Сам я хацеў бы, каб у Мінску, у цэнтральнай частцы горада, з'явілася па-мастацку аздобленая шыльда з цытатай з кнігі "Тропік Рака" класіка літаратуры XX стагоддзя Генры Мілера: "Парыж — гэта эстрада, сцэна, што верціцца. І глядач можа бачыць спектакль з любога кута. Але Парыж не піша і не стварае драм. Яны пачынаюцца ў іншых месцах. Кожны, хто гайдаецца ў парыжскай люльцы, можа марыць пра свой Берлін, Нью-Ёрк, Чыкага, Вену, Мінск". Побач з гэтым тэкстам на асноўных мовах свету, у тым ліку на беларускай, турысты і мінчане будуць фатаграфавацца і без напаміну. Бо марыць пра Мінск у Парыжы — крута! А чаму не? Атрымалася жа ў Шагала на Лазурным узбярэжжы па Віцебску сумаваць...

К

“Беларускую песню трэба прышчапляць зноў”

На мінулым тыдні прайшоў ужо шаснаццаты па ліку Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі “Маладзечна-2016”. Сваімі ўражаннямі ад форуму і думкамі пра яго развіццё падзяліўся ў фармаце маналогаў яго “айцец-заснавальнік” — кіраўнік Нацыянальнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь, народны артыст краіны Міхаіл ФІНБЕРГ.

Ілья СВІРЫН

— Пачнем з галоўнага: для чаго і для каго мы робім гэты фестываль? Якое месца ён павінен займаць сярод многіх іншых культурных падзей нашай краіны? (А іх, трэба адзначыць, нямала: толькі наш аркестр правёў ужо 225 фестываляў у малых гарадах, не кажучы пра шматлікія іншыя імпрэзы). Я задаваў сабе гэта пытанне заўсёды — і наконадні чарговага фэсту ў Маладзечне, і, вядома ж, у тыя часы, калі ён яшчэ толькі задумваўся. І ўжо тады — шмат гадоў таму, калі сёлетнія канкурсанты добра калі хадзілі пехатой пад стол — мне было дакладна зразумела: гэта мусіць быць не проста “яшчэ адзін фестываль”, хай сабе і вельмі маштабны. Найперш гэта важнае асветніцкае мерапрыемства, чыя галоўная місія — выхаванне новых талентаў і развіццё мастацкага густу як публікі, так і саміх выканаўцаў. У дадзеным выпадку мы засяроджваем увагу менавіта на нацыянальнай песні. А песня, не пабаюся тут пафасу, — кансалідуючае звяно нацыі.

Раней з такім тэзісам ніхто б нават не наважыўся спрачацца. І я магу згадаць тут не толькі апетую літаратурнымі класікамі “сівую даўніну”, але і зусім нядаўнія часы. На першых фестывалях у Маладзечне былі такія кранальныя моманты, калі падчас канцэрту гледачы літаральна плакалі, калі гукі музыкі знітоўвалі пачуцці ўсіх, хто іх чуў.

Сёлета публікі было як заўсёды шмат, і на яе няўдзячнасць нікому з артыстаў наракаць не даводзіцца. Але… таго яднання душ, калі слухачы хорам спяваюць разам з салістамі, паклаўшы адзін аднаму рукі на плечы, цяпер ужо няма. Таму самая галоўная выснова, якую варта зрабіць пасля сёлетняга фэсту — беларускую песню трэба прышчапляць зноў. Людзі ад яе трохі адвыклі.

Чаму? У чым прычына? Можа, знізіўся творчы ўзровень фестывалю? Ды не, сёлета ён быў як заўсёды высокім, і гэта пацвердзілі многія прафесіяналы. Думаю, справа тут зусім у іншым. На нашу свядомасць сёння ўплываюць тэлебачанне ды іншыя сродкі масавай інфармацыі. І ў той справе, якую мы робім, яны павінны быць саюзнікамі, а не наадварот. На жаль, пакуль гэтага не скажаш.

Уявіце канкрэтную сітуацыю: ты ўтрапёна рыхтуеш канцэртныя праграмы (а іх у нас на фэсце, дарэчы, было пяць!), вяртаешся позна дадому, уключаеш тэлевізар — а там круцяць рэкламу зусім не нацыянальнага свята, а нейкага фестывалю шансону, які таксама пройдзе ў Маладзечне. Нічога не маю супраць шансону, як і ўсіх іншых музычных стыляў, але… Трэба ж нейкім чынам расстаўляць прыярытэты.

Сёлета караценькія ролікі з рэкламай фестывалю былі толькі на канале “Беларусь 3”. Вядома ж, гэтага замала. Каб фэст мог выканаць сваю грамадскую місію, ён патрабуе паўнавартаснай медыйнай падтрымкі. Уявіце сабе: недзе за месяц да яго пачатку на тэлебачанні пачынаюць з’яўляцца прэм’еры песень, інтэрв’ю са знакамітымі артыстамі, кампазітарамі, паэтамі… Хай бы гэтых людзей у нас пазнавалі ў твар! Паверце, яны таго вартыя. А ўжо наконадні фэсту гледачы могуць убачыць, як рыхтуюцца канкурсанты, як яны хвалююцца перад адказным момантам, як літаральна на вачах маладняк пераўтвараецца ў сапраўдных артыстаў…

Ды, на жаль, пакуль гэта — толькі мае мары. У рэчаіснасці ўсё зусім іначай.

Сёлетні фестываль быў прысвечаны памяці Уладзіміра Мулявіна. Спецыяльна з гэтай нагоды наш аркестр зрабіў новую праграму яго твораў. Прычым яна складалася зусім не з тых хітоў, якія сёння ў кожнага на слыху, але з рэчаў малавядомых або прызабытых. Так, яны трохі няпростыя і для выканання, і для ўспрыняцця публікай. Але зала рэагавала цудоўна, ды і трансляцыя канцэрта па тэлебачанні прынесла нямала добрых водгукаў. Шкада толькі, што ён ішоў па канале “Беларусь 3”. Хаця, як падаецца, постаць Мулявіна адпавядае маштабу Першага нацыянальнага канала.

■■■

— Фестывальны конкурс маладых выканаўцаў даўно зарэкамендаваў сябе як адзін з самых прэстыжных у краіне. Многія яго колішнія лаўрэаты сталі прафесійнымі спевакамі, і кожны з іх ахвотна пацвердзіць: “Маладзечна” для іх стаў не проста прыступкай на шляху ўгару — ён зрабіўся сапраўдным трамплінам!

Ды, тым не менш, ахвотных узяць удзел у тым спаборніцтве не так і шмат — што, вядома ж, насцярожвае. Чаму? Мабыць, прычына перадусім у тым, што маладзёны не бачаць ад гэтага нейкага канкрэтнага плёну. Раней конкурсныя выступленні паказваліся па тэлебачанні, гучалі па радыё, і для пачаткоўцаў гэта была добрая магчымасць “засвяціцца”. Сёння землякі ўжо не могуць хварэць за “свайго хлопца” ля экрана.

Больш за тое, на ўсе рэпетыцыі — а іх не адна і не дзве — канкурсанты прыязджалі з розных куткоў Беларусі выключна за ўласныя грошы. Можа, і гэта акалічнасць для кагосьці адыграла сваю ролю.

І тым не менш… Лічу, што конкурс можа быць папраўдзе вызначальным у кар’еры таго спевака, які мае сур’ёзныя намеры — прычым нават незалежна ад занятага месца. Уявіце сабе — хлопец ці дзяўчына з невялічкага гарадка атрымлівае ўнікальную магчымасць заспяваць на адной сцэне з не самым горшым у гэтым свеце аркестрам! Гэта ж папраўдзе неацэнны досвед, гэта моцны штуршок у плане прафесійнага росту і нагода перагледзець сваё стаўленне да творчасці. Трэба было бачыць, як гэтыя таленавітыя

На фестывалі, прысвечаным Уладзіміру Мулявіну — Нацыянальны канцэртны аркестр Рэспублікі Беларусь.

Каму свеціць зорка Мулявіна?

XVI Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі “Маладзечна-2016” працягваўся ўсяго два дні — 10 — 11 чэрвеня, але, як заўжды, быў насычаны шматлікімі падзеямі. І ў цэнтры, як і мае быць, апынуўся Нацыянальны конкурс выканаўцаў беларускай эстраднай песні.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Сёлета адметнасць конкурсу дый усяго фестывалю была, найперш, у яшчэ большай, чым калі, скіраванасці іх на постаць Уладзіміра Мулявіна і 75-годдзе з дня яго народзін. Мулявінская тэма была пазначана своеасаблівым лейтматывам “Маладзечна-2016”: тут і выстава з фондаў прысвечанага яму музея, і фотавыстава з яго здымкамі, і тэматычны канцэрт адкрыцця, які ўвабраў яго песенную спадчыну, і творчая справаздача на сцэне амфітэатра выхаванцаў Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва яго імя, і спектакль сталічнага тэатра імя Максіма Горкага “Пясняр”, і традыцыйная паэтычная гасцёўня з удзелам беларускіх паэтаў, што перагукаецца з назвамі “пеняроўскіх” рэчаў, — “Малітва за Беларусь”.

У такім асяродку яшчэ больш значнай успрымалася галоўная конкурсная ўзнагарода — прыз імя Уладзіміра Мулявіна ў выглядзе хрустальнай гітары. Таму цалкам заканамерна, што Нацыянальны конкурс патрапіў на тэлеэкраны, каб назіраць за спаборніцтвам і хвалявацца за патэнцыйных пераможцаў магла ўся краіна (дададзім, што цяперашні фестываль увогуле меў даволі шырокую тэлеверсію — праўда, выключна на канале “Беларусь 3”).

Дык якім жа атрымаўся конкурс? З боку Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі і асабіста яго кіраўніка — народнага артыста краіны, прафесара Міхаіла Фінберга — было зроблена ўсё, каб конкурсныя выступленні прайшлі як мага лепш. Як заўсёды, канкурсанты некалькі разоў з’язджаліся ў Мінск на папярэднія рэпетыцыі з аркестрам (сёлета, як расказвалі ўдзельнікі і іх выкладчыкі, рэпетыцый было нават больш).

Было заўважна, што ўсе больш адказна, а часам і прыдзірліва падышлі да выбару рэпертуару: у адрозненне ад мінулых гадоў, практычна не сустракаліся сітуацыі, каб адну і тую ж песню, бы неіснуючы на гэтым конкурсе “абавязковы твор”, канкурсанты спявалі б адзін за адным. Прыемна, што куды часцей, у параўнанні з мінулымі гадамі, рабіўся выбар на карысць прафесійных кампазітараў, прызнаных аўтараў, але іх не надта “растыражыраваных” кампазіцый. Так, у конкурсным рэпертуары апынуліся ажно шэсць розных песень Дзмітрыя Даўгалёва (“Нарач”, “Мелодыя сэрца”, “Зараніцы”, “Балада растання”, “Рэха жураўлінае”, “Наша рэчанька”), чатыры — Алены Атрашкевіч (“Маладзечанскі блюз”, “Паўзабыты свет”, “Гукай мяне”, “Ночы блакітны рай”), тры — Фёдара Жыляка (“Спытай у неба”, “Маё сэрца ў далонях”, “Жураўлі”), дзве — Яўгена Алейніка (“Чуеш мяне”, “З табой”), столькі ж — вядомага ўкраінскага кампазітара Аляксандра Панамарова (”Ты дачакайся мяне”, “Човен”). Дарэчы, наконт апошняга: пакуль у конкурсных умовах не будзе абсалютна дакладна прапісана неабходнасць звароту да беларускіх творцаў, а не проста беларускамоўных песень, удзельнікі часам будуць прапаноўваць пераклады замежных аўтараў, як у дадзеным выпадку.

Аднак больш за ўсё было менавіта “песняроўскіх” песень — з розных перыядаў існавання мулявінскага калектыву і некалькіх гуртоў яго паслядоўнікаў (“Касіў Ясь канюшыну”, “Ля замкавай гары”, “Тры крынічанькі”, “Стася”, “Ночка цёмная”, “Ліцвінка”). “Жняя” ж Рамана Козырава і цяперашняга Дзяржаўнага ансамбля “Песняры” на чале з Уладзімірам Мулявіным увогуле гучала двойчы: у жаночай і мужчынскай версіях.

Былі згаданы таксама песні Ізмаіла Капланава (прысвечаная памяці Мулявіна “І змоўкла гітара”), колішняга “песняра” Ігара Паліводы (“Па-над белым пухам вішняў”), якіх ужо з намі няма, Яўгена Магаліфа, які з 1990-х жыве ў ЗША (”Больш табе я не пазваню”). Звярталіся канкурсанты і да новых, нават зусім новых песень, сцвярджаючы іх запатрабаванасць (”Белая ластаўка” Уладзіміра Кандрусевіча, з якой Алёна Ланская перамагла на “Славянскім базары ў Віцебску-2012”, “Сонца каласы” Пятра Ялфімава, “Няма другой такой” Веранікі Мусвідас, “Бяжы” Насты Шпакоўскай з гурта “Naka”, “Новы дзень” з рэпертуару “Navi”, “Русалкі” Аляксандра Маркевіча з “Ву сгу”, “Свяча” Рамана Валазнёва, прэзентаваная ім толькі летась на XIV Рэспубліканскім конкурсе “Белазаўскі акорд”).

Тым не менш, для многіх канкурсантаў менавіта выбар рэпертуару па-ранейшаму заставаўся адным з непяройдзеных рубіконаў. Бо мала знайсці добрую песню, неабходна яшчэ, каб яна стала па-сапраўднаму “сваёй”, раскрываючы лепшыя якасці выканаўцы. А для гэтага часцяком патрабуецца яе рэдагаванне, прыстасаванне да канкрэтнага спевака, пошукі ва ўсіх сэнсах новай інтэрпрэтацыі — да таго ж, узгодненай з аўтарамі ці іншымі праваўладальнікамі. На жаль, не ўсе “дацягваліся” да абраных відавочна “на выраст” песень. Хтосьці ж, наадварот, схіляўся да простых мелодый, не спрабуючы расквеціць іх сольнай кадэнцыяй.

Па вялікім рахунку, нацыянальнаму статусу конкурсу адпавядала прыблізна трэць удзельнікаў. Выканальніцкія праблемы заставаліся ранейшымі: недавучанасць (асабліва ў пастаноўцы правільнага спеўнага дыхання), няўменне як след асэнсаваць змест песні, адбудаваць музычную форму, зрабіўшы ў ёй кульмінацыю. А галоўнае — вытрымаць добры густ, а не “скатвацца” ўвесь час да рэстаранных манераў. Дарэчы, на апошні недахоп, як паказалі фестывальныя канцэрты, пакутуюць і некаторыя прафесійныя спевакі, так што канкурсантам, на жаль, ёсць у каго набірацца “вопыту”.

Каб падкрэсліць недастатковую планку, журы на чале з Міхаілам Фінбергам вырашыла сёлета Гран-пры не ўручаць. Першай прэміяй і спецпрызам імя Уладзіміра Мулявіна, які звычайна суправаджае вышэйшую ўзнагароду гэтага конкурсу, быў адзначаны выпускнік Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў, цяперашні студэнт Універсітэта культуры і мастацтваў Аляксандр Саванец. Ён і сапраўды быў лепшым, паказаўшы вельмі высокую культуру выканання: папраўдзе сталы прафесійны падыход, ідэальную адточанасць кожнай дэталі. Не першы год назіраючы за гэтым спеваком, прыемна бачыць, як раз за разам ён бярэ ўсё новыя творчыя вяршыні, не спыняючыся ў самаўдасканаленні.

Першую прэмію і спецыяльны прыз імя Уладзіміра Мулявіна Аляксандру Салаўцу ўручыла ўдава артыста Святлана Пенкіна.

Падчас канцэрта. / Фота Яўгена СТЭЛЬМАХА.

маладыя людзі былі задаволеныя, пачуўшы якасны жывы гук.

Мушу адзначыць, што са сваёй задачай канкурсанты справіліся, і на вялікай сцэне яны выглядалі вельмі годна. Можа, не кожны з іх стане суперзоркай, але… думаецца, памяць пра тыя дні застанецца на ўсё жыццё. А гэта таксама дарагога каштуе.

Шмат разоў чуў пытанне: "А што далей будзе з лаўрэатамі?". Адказ тут можа быць толькі адзін: дакладна не ведаю. Бо гэта найперш залежыць ад іх саміх.

Неаднаразова сустракаў такое меркаванне: маўляў, артыст павінен паступова ісці ўгару прыступка за прыступкай. Перамог у Маладзечне — едзь у Віцебск, а калі ты і там адзначыўся, дык "аўтаматам" трапляеш на "Еўрабачанне". Думаю, гэтая схема можа плённа працаваць хіба ў ідэале — хаця, як вядома, многія пераможцы "Маладзечна" нядрэнна праявілі сябе на "Славянскім базары…". Калі ты здатны да ўнутранага росту і эвалюцыі, тады можаш прэтэндаваць і на пуцёўку на "Еўрабачанне", а калі будзеш трохі "падбуксоўваць"… Прабач, але "блат" мы табе не будзем забяспечваць, нягледзячы ні на якія заслугі.

■ ■ ■

— Як яшчэ можна ўдасканаліць фестываль? Гэта пытанне не з простых. Пераканаць, што ў дадзеным выпадку самае важнае — гэта не рэформы, а захаванне таго, што мы ўжо маем. А для гэтага належыць дбайна працаваць — кожнаму на сваім месцы. Думаю, работнікі культуры з усіх куткоў краіны ўжо сёння павінны актыўна заняцца падрыхтоўкай канкурсантаў на будучы год. Прыгледзьцеся: можа, літаральна поруч з вамі — будучая зорка нашай музыкі. І самае галоўнае: пры падрыхтоўцы не забывайцеся пра тое, што "Маладзечна" — гэта фестываль менавіта беларускай, нацыянальнай песні.

Вядома ж, мы таксама рыхтуемся поўным ходам. Лейтматыў наступнага фестывалю "Маладзечна" ўжо вызначаны, — вядома, гэта юбілеі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Калі Бог дасць здароўя, аркестр налета прадставіць прысвечаную ім праграму. Назвы яна пакуль не мае, але ж усе творы (а яны, адзначу, абсалютна новыя) ужо падрыхтаваны. І хочацца верыць, што хаця б некаторыя з іх стануць тымі песнямі, якія можна назваць папраўдзе народнымі (нават пры наяўнасці аўтараў).

Сапраўды, што можа яшчэ лепей яднаць нацыю, чым выдатныя музычныя творы? Згадайма знакамітае Свята песні і танца ў Рызе, на якое сцякаюцца дзясяткі тысяч турыстаў з усяго свету, каб адчуць дух гэтага народа. Паверце, "Маладзечна" цалкам можа — і, больш за тое, павінна! — заняць гэтую нішу ў нас. Але… Паўтаруся, для гэтага мы ўсе разам павінны працаваць. І, галоўнае, верыць у тую справу, якую робім.

К

Што ж, калі да Гран-пры прад'яўляць вышэйшыя патрабаванні экстра-класа (маўляў, гэта павінна быць штосьці звышкасмічнае, што адкрывае прынцыпова новыя, невядомыя раней шляхі ў мастацтве), дык і сапраўды — такіх выканаўцаў у Маладзечне не было. Але калі параўнаць першую прэмію з дзвюма другімі (віцябчанка Марына Бараноўская і мінчанка Ніна Жукоўская), а тым больш — трыма трэцімі (яшчэ адна віцябчанка Аляксандра Вітушкіна, Аляксандр Ласоўскі са Светлагорска і Ксенія Бучылка з Гродна, да народнай спеўнай манеры якой так і хацелася дадаць крыху больш не акадэмічнай, а эстраднай), дык разрыў паміж імі атрымаецца надта вялікім — як паміж лаўрэатам і, у лепшым выпадку, дыпламантамі. Затое "за бортам", на жаль, апынуліся некаторыя, на маю думку, даволі цікавыя і перспектыўныя выканаўцы. Гэта, да прыкладу, салістка аркестра Міністэрства ўнутраных спраў, выпускніца БДУКіМ і студэнтка Акадэміі мастацтваў Вольга Калеснікава, схільная да прыцягальнага сінтэзу мастацтваў; маладзечанка Дзіяна Бажко, якая скарыла вялізным дыяпазонам і музычнасцю; навучэнка Мінскага каледжа мастацтваў Юлія Юхневіч са Смаргоні, схільная да драматургічных тонкасцяў у абраных песнях; салістка Мірскага ДК з Брэстчыны, выпускніца Баранавіцкага музычнага каледжа Аксана Вайцешык, якая, у адрозненне ад многіх іншых, асэнсавана карыстаецца голасам і магчымасцямі свайго рэпертуару.

Будзем спадзявацца ўбачыць у Маладзечне небывалы конкурсны ўздым — праз год і далей. Але пакуль, у немалой ступені, гэтаму перашкаджае сістэма адбору ўдзельнікаў: ад кожнай вобласці і Мінска — па тры чалавекі. Вядома, гэта дае агульную карціну стаўлення да беларускамоўнай эстрады ў краіне, але не спрыяе выяўленню ўсіх, хто, паводле Палажэння аб конкурсе, здольны да "ўдзелу ў прэстыжных міжнародных фестывалях і конкурсах". Але апошні пункт, як паказвае практыка, не вытрымліваецца, нягледзячы на штогадовыя сцверджанні пра тое Міхаіла Фінберга: на той жа "Славянскі базар у Віцебску" праводзіцца асобны адбор канкурсантаў ад Беларусі. Можа, усё ж прыслухацца да прапаноў магутнага спецыяліста?

...Фестываль расце, развіваецца. Вось і сайт у яго асобны з'явіўся — і нават абнаўляецца, у адрозненне ад некаторых іншых фестывальна-конкурсных. Хіба да рубрыкі "Спіс пераможцаў" у арганізатараў рукі пакуль не дайшлі: там па-ранейшаму ўсё заканчваецца леташнімі і яшчэ больш ранейшымі прозвішчамі (у некаторых, на жаль, і без фотаздымкаў). А між тым, маладзечанскі конкурс узрасціў і адкрыў многіх цяперашніх знаных салістаў — тых жа Наталлю Тамела, Аляксандра Салаўёва, якія выдатна трымаюць званне яго лаўрэатаў. Пажадаем таго ж і новым зорачкам!

К

Працягваюцца справаздачныя канцэрты абласных самадзейных калектываў. 12 чэрвеня ў Палацы культуры Маладзечна Міншчына прэзентавала шматграннасць творчых сіл. І Маладзечна, і Міншчына засталіся задаволенымі.

Яўген РАГІН, Мінск — Маладзечна — Мінск / Фота аўтара

Вярнуцца ў народ

На сцэне — "Аношкаўскія музыкі".

Сімфанічны аркестр музычнага каледжа.

Сімфонія Палаца для духавых, народных, апантаных

Духавы аркестр "Віціны".

Пра горад і гараджан

Ці не дзесяць гадоў таму, упершыню пачуўшы Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь Сімфанічны аркестр Маладзечанскага музычнага каледжа імя Міхала Клеафаса Агінскага пад кіраўніцтвам Рыгора Сарокі, звярнуў увагу на тое, як слухае выступленне мясцовая аўдыторыя. Не проста ўважліва ды сцішана, а з належным шляхетным піетэтам і да музыкі, і да выканаўцаў, і да сябе. Так паводзіць сябе эліта. Станаўленне яе — заслуга работнікаў культуры. Тое ж самае сказаць можна не толькі пра Маладзечна, але і пра іншыя абласныя "сталіцы". Гэта і яшчэ адзін доказ таго, што традыцыйныя ды высакаякасныя фестывалі, святы, конкурсы прымушаюць публіку адпавядаць, удасканальваюцца і ўдасканальваюць нас, слухачоў, гледачоў, гасцей. Ісціна, якая павінна стаць нормай і для кожнага сельскага дома культуры. Цяпер у лік такіх мерапрыемстваў трапілі і абласныя справаздачныя канцэрты.

Літаральна ўчора скончыўся Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі "Маладзечна-2016". Здавалася б, эмоцыям у амфітэатры не было мяжы і самы час сцішыць пачуцці і адпачыць. Не. На наступны дзень зала Палаца культуры, дзе распачаўся справаздачны канцэрт абласной самадзейнасці, была паўнюткай, як і ўчарашні амфітэатр.

Канцэрт распачаўся а 14-й. Але пэўны ажыятаж панаваў у Маладзечне яшчэ зранку. На пешаходнай вуліцы Прытыцкага, дзе процьма лавачак і зручны для спатканняў вялікі гадзіннік на каваным слупе, адна бабуля цярпліва, але настойліва даводзіла другой, што сённяшні канцэрт прапусціць нельга, бо выступаць будуць лепшыя з лепшых. У цудоўнай кнігарні крамніцы перажывалі, што сёння для іх — рабочы дзень і ў Палац яны не патрапяць. Словам, "на разагрэве" перад канцэртам у мяне былі і горад, і гараджане.

Пра арганізатараў

"На ўчарашнім фестывалі ўсё ўзлятала і падала, — расказвалі ў палацавых кулуарах пра святочныя феерверкі і салюты ды пыталіся ў работнікаў культуры. — Ці паўторыцца тое сёння?" "Калі хто і будзе падаць, дык гэта мы, — адказвалі работнікі культуры". Так нараджаюцца паказкі. Ніхто не падаў. Стома напружаных дзён засталася ў закуліссі.

Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Святлана Баранок заўважыла, што на справаздачным канцэрце хацелася паказаць і таленавітасць выступоўцаў, і, што не менш важна, разнастайнасць жанраў. Раіса Вайцяхоўская, дырэктар Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, магла б шмат распавесці, якімі высілкамі "ўзрошчваецца і сілкуецца" вялізны гарманічны арганізм. Але на аналіз гэтай "кухні" спатрэбіўся б аб'ём ладнай "паваранай кнігі".

Пра Палац

У Палацы трэба трошкі пажыць. Інакш будзеш бясконца блукаць па калідорах і паверхах. Напачатку ратавала тое, што гукі рэпетыцыі чутны былі адусюль, і так альбо інакш да сцэны можна было дабрацца. А там з самага ранку кіравала падрыхтоўчым працэсам рэжысёр Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці Вераніка Жыгалко. І рабіла яна гэта вельмі рашуча і прафесійна, таму ў "чыставым" выглядзе канцэрт прайшоў без відавочных рэжысёрскіх хібаў.

Святло, гук падчас канцэрта прэтэнзій не выклікалі. Заслуга ў гэтым, безумоўна, належыць гаспадыні Палаца Святлане Сарока, якая трымае гаспадарку належна. Не варта забываца на тое, што Маладзечна сёлета — Культурная сталіца Беларусі, а мясцовы Палац — галоўная яе сцэна. І ўвогуле, установы культуры буйных гарадоў краіны амаль усе без выключэння — узорныя па тэхнічным забеспячэнні. Вось да гэтага б узроўню ды нашы СДК падцягнуць…

Для мяне адна з пераваг такіх канцэртаў у тым, што бяруць у ім удзел не толькі артысты раённых ці абласных цэнтраў, але і тыя, у каго сельская прапіска. Дык вось, у Маладзечне вестыбюль Палаца ўпрыгожвалі ўдзельніцы Тэатра дэфіле "Відана" Лешніцкага СДК з Бярэзінскага раёна. Вытанчаныя дзяўчаты ў дзіўных касцюмах не толькі прэзентавалі жывапісныя палотны, але і дадавалі ім чароўнага зместу.

Прысутнічала ў Палацы і постаць Уладзіміра Мулявіна. Прыз ягонага імя атрымліваюць пераможцы конкурсу маладых выканаўцаў у рамках Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі. У імправізаванай экспазіцыі на першым палацавым паверсе — асабістыя рэчы кіраўніка "Песняроў", залаты дыск гурта, рэдкія фотаздымкі бессмяротнага калектыву з фондаў Музея Мулявіна ў Белдзяржфілармоніі.

Пра ўдзельнікаў

Для таго, каб "паказаць і таленты, і разнастайнасць жанраў", спатрэбілася ці не тры з паловай гадзіны. Па часе, шчыра кажучы, мнагавата. Па атрыманых эмоцыях — самы раз. Некалькі старонак майго нататніка запоўнены клічнікамі, пастаўленымі насупраць імёнаў і назваў выканаўцаў і калектываў, што асабліва прыйшліся па душы. Гэта, у першую чаргу, памянёны ўжо сімфанічны аркестр маладзечанскага каледжа, а таксама — народны аркестр народных інструментаў той жа ўстановы пад кіраўніцтвам непараўнальнай Тамары Бяльковай.

Аляксандр Саванец уразіў бясконца. Пераможца конкурсу маладых выканаўцаў фестывалю беларускай песні і паэзіі яшчэ раз давёў: прыз імя Мулявіна ўручаны яму па заслугах. Бліскуча, на мой погляд, выступіў народны ансамбль народнай песні "Пліса" Акцябрскага сельскага дома культуры Смалявіцкага раёна. Даўно знаёмы з творчасцю нясвіжскіх артыстаў. Лыжкары, "Аношкаўскія музыкі", гурт "Зараніца" з ДШМ і гэтым разам аказаліся на вышыні. Салігорскі харэаграфічны ансамбль "Сузор'е" ўражваў шматзначнасцю відовішча, а allegri-квартэт Мінскага абласнога каледжа мастацтваў — вакальнай канцэптуальнасцю…

Асаблівая гаворка — пра духавы аркестр "Віціны" Стаўбцоўскай дзіцячай школы мастацтваў. У фантазіі "Песні нашай Перамогі" хапіла месца і для ўласна духавых экзэрсісаў, і для вакалу, і для харэаграфіі. І ўсё гэта выконвалася адначасова, у рэжыме non-stop і ў строгай адпаведнасці з ваеннай відэахронікай, фрагменты якой дэманстраваліся паралельна. Мяне, напрыклад, зачапіла.

Хапала прыкладаў і ў доказ шматжанравасці. Прысутнічаў размоўны жанр, дзеці старанна капіравалі эстрадных зорак, а казакі так шчыравалі ў фланкіроўцы шашкамі, што страшна было за першыя глядацкія рады.

Пра перспектыву

Такія канцэрты, па маім меркаванні, трэба паказваць па нацыянальным тэлебачанні. Хаця б для таго, каб пераканаўча давесці, што яно сапраўды нацыянальнае. Давайце згадаем, як восем гадоў таму вобласці выступалі з аналагічнымі справаздачамі ў Палацы Рэспублікі, а літаральна ўсю Кастрычніцкую плошчу займалі неабсяжныя гандлёвыя рады з вырабамі рамеснікаў. Сталіца тады была прыемна ўражана. Так, паўтарыць гэты цуд па сённяшнім, складаным у эканамічным плане, часе немагчыма. Дык чаму б не выкарыстаць магчымасці ТБ? Хоць у прамым эфіры (ён у нас ёсць яшчэ для культурных дзей?), хоць у запісе — гэтыя перадачы не могуць не стаць рэзананснымі. Гэта ж абласныя цэнтры ў нас прызвычаіліся ўспрымаць належным чынам народную творчасць, а сталіца пакуль застаецца гэткім самадастатковым рафінаваным стварэннем. Як той казаў, мала выйсці з народу, варта ў яго яшчэ і вярнуцца.

К

Настройка "рэзкасці"

паводле свету, што стаў вёсачкай

З Сяргеем Грыневічам пра тое, дзе ў Мінску каралеўскі замак, чым займаўся мастак 5 дзён сярод 80 мадэляў і што сталіца "адцягвае" ў Гродна?

Ён — сусед Сандра Бацічэлі і Рэмбранта ван Рэйна. Знаходзіцца ў зайздросным становішчы — малюе, што яму падабаецца, і кажа: пазнавальнасць стылю — не камплімент. Тым не менш, почырк і маштаб работ гэтага майстра не збліталі. Знаёмства нашай рэдакцыі з гродзенскім жывапісцам Сяргеем ГРЫНЕВІЧАМ пачалося з самага цёмнага памяшкання выставы "Цёмны пакой" у сталічнай галерэі "ДК". Ён правёў экскурсію, распавёў пра адну з улюбёных ім работ — "Дуэль", на якой — сын мастака. А пасля наша размова працягнулася ў сталым фармаце рубрыкі "Рэдакцыя плюс..." (Дарэчы, а гэты тыдзень мастак па даўняй завядзёнцы правядзе на міжнародным арт-кірмашы "Арт-Баззэль".)

Падрыхтавала
Вольга РОПАТ

"Я люблю пісаць рукі, ногі"

— Вы часам бераце выявы медыйных персон, і, скажам так, "пераводзіце" іх у жывапісную прастору. Наколькі для вас істотна адлюстроўваць менавіта медыйных персанажаў на сваіх карцінах?

— Цяжка ў нашым свеце пазбегнуць рэфлексіі на бягучыя падзеі, у тым ліку — з жыцця селебрыці. У свой час мне надакучылі тыя ж скандалы з Кейт Мос. Таму захацелася адрэагаваць. У мяне, дарэчы, былі і спецыяльныя праекты, прысвечаныя свету мадэлей — "Кастынг 1" і "Кастынг 2". Яны нарадзіліся з таго, што калісьці я пабываў на фінальным паказе агенцтва "Elite Model Look" у Шанхаі і правёў 5 дзён сярод 80 найпрыгажэйшых жанчын свету: рабіў накіды, фотаздымкі. Некалькі гадоў таму "Кастынгі" і ў Мінску выстаўляліся, і за мяжой. Наогул жа, мяне заўсёды цікавіў чалавек як істота, як аб'ект.

— Асобы беларускай культуры часта трапляюць на вашы палотны?

— Ёсць нядаўнія партрэты Янкі Купалы, аб'яднаныя ў тэтрапціх. У 1980-х для Музея Максіма Багдановіча ў Гродне рабіў выявы Ларысы Геніюш, Вацлава Іваноўскага, Максіма Багдановіча. Яны і цяпер там знаходзяцца.

— Ці ёсць дэталі ў вашых работах, якія заўсёды хочацца прамалёўваць?

— У савецкія часы нас вучылі, што, калі робім карціну на замову, рукі персанажаў можна "хаваць" у кішэнях, а на ногі надзяваць боты альбо лапці, бо гэтыя дэталі вымагалі часу і пэўнай канцэнтрацыі для іх рэалістычнасці. Дык вось, я наадварот люблю пісаць рукі, ногі, не пазбягаю іх.

— Чалавек заўжды займае багата месца на вашых немалых палотнах. А з чым звязаны выбар маштабу? З манументалісцкай школай?

— Напэўна, так. І — без іроніі — пагаршаецца з гадамі зрок: "рэзкасць" наводзіцца ўжо на выцягнутай руцэ. А я не люблю ў акулярах працаваць. Калісьці ж пісаў яшчэ большыя фарматы — па 5 — 6 метраў…

"У мяне нават палітры няма"

— Вы неаднойчы казалі ў інтэрв'ю, што ў сусветным мастацтве існуюць дзве тэмы — каханне і смерць. З гэтага вынікае, што, уласна кажучы, чалавек не змяняецца, свет не змяняецца… А навошта ў нязменным свеце і з нязменным чалавекам змяняцца мастаку?

— Я і цяпер "падпісваюся" пад гэтымі словамі. Так, аснОўныя тэмы — каханне і смерць, а астатняе — адгалінаванні. І, па сутнасці, толькі яны застаюцца актуальнымі.

— Адсутнасць глабальнага стылю — адсутнасць глабальнай ідэі ў чалавецтва?

— Свет стаў вёсачкай у час інтэрнэту, таму адна глабальная ідэя не можа аб'яднаць свет. Ідэі спрачаюцца, і гэта, канешне, трывожна.

— Але ўсё роўна інтэрнэт, напрыклад "Фэйсбук", патрабуе імгненнага рэагавання: "лайк", каментарый… Вось вы — мастак хуткага рэагавання на нейкую падзею?

— Штосьці варта і абдумаць. Нам казалі "манументальнае мастацтва — самае маментальнае".

— У вас адчуваецца майстэрства, вельмі пазнавальны стыль. Не страшыць, што на нейкім этапе гэта пазнавальнасць са здабытку ператворыцца ў штамп?

— Пазнавальнасць для мяне не камплімент. Я стараюся ўсё ж такі змяняцца. Гэта ўменне — нашмат цяжэйшая справа, чым заставацца прыхільнікам свайго некалі выпрацаванага почырку. Напрыклад, у 1990-я ўвогуле забараніў сабе маляваць людзей, займаючыся абстракцыяй, і толькі ў пачатку "нулявых" вярнуўся да фігуратыўнасці. Я рысавальшчык, а не жывапісец. У мяне нават палітры няма. Мае творы — "падкрашаныя" рысункі. Колер як пластычны складнік адыходзіць на другі план.

— Фігуратыўнасць — сусветны трэнд альбо чынік вашага самаразвіцця?

— 16 гадоў таму, напэўна, гэта не было сусветным трэндам. Але была ўнутраная прага да фігуратыўнасці, што і дазволіла вярнуцца да яе на іншым узроўні. Быў перапынак — амаль што 10 гадоў, і я шмат чаго зразумеў у іншым, так бы мовіць, складніку. Ідэта як спіраль — прыйшоў іншы віток, трошкі вышэйшы. Перапынак, урэшце, стаўся карысным для мяне.

— Творы манументаліста Грыневіча ў прасторы Гродна захаваліся?

— Рабіў шмат роспісаў, фрэсак, вітражоў (яны, у асноўным, і захаваліся) у прафесійных вучылішчах, бальніцах, паліклініках, калі працаваў на мастацкім камбінаце. Вітраж — такая тэхніка, якую цяжка зрабіць непрыгожа. Каб замовы былі, я і зараз з задавальненнем рабіў бы іх…

— Скажыце, а гэта звычайная практыка, калі мастак-манументаліст прыхо-дзіць з часам у жывапіс, таму што няма замовы на аб'екты, а потым гэта становіцца яго другой (калі не першай) натурай?

— Магу назваць чалавек з дваццаць манументалістаў, якія займаюцца жывапісам. Многія пасля інстытута сыходзілі ў жывапіс або ў выкладчыкі, бо ўладкавацца на мастацкі камбінат і здабыць замову было няпроста. Я хацеў хутчэй рэалізавацца, таму не мог дачакацца, калі скончу інстытут, каб з'ехаць у Гродна. Напэўна, школа была сапраўды някепская на манументальным аддзяленні і больш "рухавая" ў жывапісным сэнсе.

"Прычасаныя" гарады

— У Мінску прайшоў фестываль "Vulica Brasil", дзякуючы чаму з'явіліся роспісы, графіці на прамысловых, грамадскіх і жылых будынках. Манументальнае мастацтва змяніла форму — да яго прыйшлі аматары з пэўным узроўнем майстэрства, уласным стылем... Мастацтва гэта ці не мастацтва?

— У ідэале для стрыт-арта і графіці эскіз не замаўляецца. Яго ўвогуле не павінна быць. Толькі — імправізацыя, прычым з небяспекай, што цябе міліцыя возьме. На фестывалях жа прадстаўлены варыяцыі манументальнага мастацтва. Калісьці тое называлася суперграфікай — адно з адгалінаванняў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, дзе роспіс робіцца па тынкоўцы.

— А калі пройдзе год — два, і скажуць, напрыклад, гэтыя творы замаляваць, каб зрабіць новае. На ваш погляд, гэта нармальна?

— Калі стрыт-арт — нармальна.

— Ваша стаўленне да "чалавека са свечкай"?

— Эскіз быў зацверджаны, а жыхарам суседніх дамоў не падабаецца…

— Работа для свайго жанру, вядома ж, моцная. І ў мяне быў падобны выпадак. Два гады таму прымаў удзел у брэсцкім этапе арт-праекта "Zabor", які праходзіў напярэдадні 9 мая. Напісаў трыпціх "Роля", прысвечаны Чарлі Чапліну. Мясцовыя ўлады сказалі, што тую частку, дзе Чаплін да Гітлера падобны (а ён і сапраўды высмейваў яго ў стужцы "Вялікі дыктатар"), на 9 мая здымуць, каб не траўмаваць пачуцці ветэранаў. А здзівіла мяне тое, што абуралася моладзь. У інтэрнэце было каля 300 водгукаў, і я пра сябе прачытаў усё, што толькі можна.

— Наколькі патрэбны гарадской прасторы стрыт-артаўскія малюнкі?

— Мы ўсім у свеце вядомыя чысцінёй сваіх гарадоў. Што Мінск, што Гродна — як у аптэцы, такія вось "прычасаныя" ў нас… Хочацца ж трошачку дадаць аўтэнтычнасці і артыстычнасці. Нядаўна я быў каля прасторы "ЦЭХ" на мінскай вуліцы Кастрычніцкай, дык графіці там натуральна выглядаюць. Нават кавалачак Нідэрландаў нагадваюць. Старыя будынкі заводаў і сапраўды трэба неяк прыстасоўваць, упісваць у кантэкст сучаснасці і тут стрыт-арт толькі ў дапамогу. У Мінску ж і сапраўды не хапае кавалачка натуральнай прасторы, дзе, разам з тым, моладзі можна нестандартна правесці час.

— Ёсць цікавая думка ў адным з твораў Умбэрта Эка, што існуюць упэўненыя ў сабе гарады і не ўпэўненыя. Жыхары апошніх пытаюцца ў турыстаў "Як вам наш горад?", першых — не перапытваюць нават, бо ён для іх — найлепшы. Як вы лічыце, да якой катэгорыі адносіцца Гродна?

— Гродна адносіцца да ўпэўненых гарадоў. Апантаныя гродзенцы будуць даказваць, што гэта самы лепшы горад. І яны будуць мець рацыю. Не сакрэт, што горад захаваў сваю старадаўнюю інфраструктуру. Галоўны аргумент — у Гродне жылі каралі, у ім ёсць замкі. Вось дзе ў Мінску каралеўскі замак? Але Мінск зараз "адцягвае" ўсё самае лепшае з вёсак і малых гарадоў. У 9-мільённай краіне наяўнасць 2-мільённага мегаполісу — раскоша.

— У адным з інтэрв'ю вы ўзнялі тэму мастацкай адукацыі ў Гродне. Ці змянілася сітуацыя?

— Кардынальна ў параўнанні з савецкім часам. Па-першае, з'явілася шмат мастакоў, якія займаюцца рэпетытарствам і паспяхова рыхтуюць вучняў да паступлення ў Акадэмію мастацтваў. Але з нашага рэгіёну едуць вучыцца не толькі ў Мінск, але і за мяжу. Раней цяжка было пазбегнуць лесвіцы з мастацкага вучылішча (альбо школы-інтэрната, дзе я навучаўся), Тэатральна-мастацкага інстытута і мастацкага камбіната. Цяпер многіх маладых мастакоў, якія скончылі Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў або Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, не цікавіць саюз мастакоў. Чаго ён паедзе ў Мінск? Ён стане "прабівацца" ў Варшаву (думаю, нічога кепскага ў тым няма, ды і глабалісцкі свет не зменіш) або застанецца ў Гродне. Цяпер ёсць годная мастацкая школа і ў Ваўкавыску: я з гэтага краю, з гарадскога пасёлка Краснасельскі.

■ "Думаю, мы павінны быць выключна адкрытымі свету. Тым больш **беларуская мастацкая школа больш разнастайная і менш "закамплексаваная"**, чым шэраг заходніх. ".

■ "**Гродна адносіцца да ўпэўненых гарадоў.** Не сакрэт, што горад захаваў старадаўнюю інфраструктуру. Але Мінск зараз "адцягвае" ўсё самае лепшае з вёсак і малых гарадоў".

■ "У савецкія часы нас вучылі: калі робім карціну на замову, **рукі персанажаў "хаваць" у кішэнях, а на ногі надзяваць боты ці лапці,** бо гэтыя дэталі вымагалі часу і пэўнай канцэнтрацыі для іх рэалістычнасці. А я наадварот люблю пісаць рукі, ногі".

— Бывае так, што самаізаляцыя, "закрытасць" краіны выпрацоўвае сістэму каштоўнасцяў, якія потым запатрабаваны ў свеце, што можна пабачыць на прыкладзе з Японіяй. Можа, у беларусаў ёсць патрэба адмыслова "зачыніцца"?

— Думаю, мы павінны быць наадварот выключна адкрытымі свету. Тым больш беларуская мастацкая школа больш разнастайная і менш "закамплексаваная", чым шэраг заходніх.

— Тыцыян усё жыццё пражыў у Венецыі. Потым ён прыехаў у Рым і сказаў: "Каб я прыехаў у Рым маладым, то быў бы іншым мастаком…" Вы не думаеце, што варта рэгіянальным школам сябе ў большай ступені паважаць і ў меншай ступені арыентавацца на сталіцу?

— Калі мы будзем аргачнічным спалучэннем рэагаваць на сусветныя тэндэнцыі праз прызму беларускага кантэксту, то і будзем у пэўным сэнсе цікавымі свету.

— Вы казалі, што з аднаго боку, моладзь з'язджае ў Варшаву, а з іншага, няма і "ўключанасці" беларускіх мастакоў у еўрапейскія тэндэнцыі…

— Ніколі Беларусь не была прадстаўлена на швейцарскім кірмашы "Арт-Баззэль", дзе да мастацтва падключаюцца і камерцыйныя моманты… Не памятаю, каб беларускія мастакі выстаўляліся "сольна" ў буйных еўрапейскіх музеях… Разам з тым, па вялікім рахунку, нас у свеце ведаюць. Парадокс, але так і ёсць!

— У Віцебску існуе Цэнтр сучаснага мастацтва, Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў працуе ў Мінску. Напэўна, у Гродне аналагічнай структуры не хапае?..

— Вядома. Апроч таго, да прыкладу, у Гомелі, Карцінная галерэя Гаўрылы Вашчанкі выконвае функцыі мастацкіх музеяў: ёсць калекцыі і залы для зменных экспазіцый, робяцца закупкі…У Гродне ж ёсць столькі палацыкаў і добрых будынкаў! Скажам, у парку Тызенгаўза была камендатура — выдатны будынак, толькі адрэстаўраваць… Або Палац культуры тэкстыльшчыкаў на вуліцы Савецкай — там таксама мог бы з'явіцца мастацкі музей, не кажучы ўжо пра цэнтр сучаснага мастацтва.

"З шыяй трошачкі даўжэйшай…"

— Зараз назіраецца тэндэнцыя ў сучасным мастацтве: адсылкі да класічных сюжэтаў. Можа гэта тупік?

— Не сакрэт, што постмадэрнізм — мастацтва цытаты, эклектыкі, асэнсавання таго, што ўжо адбылося. Па вялікім рахунку, нічога новага стварыць нельга — можна толькі адрэагаваць па-іншаму. Зараз мастацтва вельмі тэхналагічнае (маецца на ўвазе не жывапіс у традыцыйным сэнсе), яно спалучаецца з апошнімі дасягненнямі навукі. І гэта добра. Напрыканцы мінулага стагоддзя чакалі новага глабальнага стылю. Напэўна, ён ужо не прыйдзе. А калі прыйдзе, то на год — два. Мы будзем жыць у перыяд гэтых пост-постэклектычных стыляў… Апошнія пяць гадоў казалі пра смерць глабальнага стылю, а апошнія паўгады — пра "рэанімацыю". А які адказ на ваша пытанне? Магчыма, усё ж такі гэта з'ява і тупік.

— Давайце пра іншае: каго прасцей намаляваць: натуршчыцу або сына?

— Я — прафесіянал, адпаведна, для мяне няма ніякай розніцы. Да ўсіх мадэлей аднолькава стаўлюся (некаторыя нават крыўдзяцца). Умею рабіць жанчыну маладзейшай, з шыяй трошачкі даўжэйшай.

— Вашы работы спецыфічныя. Для якой прасторы яны прызначаны?

— У мяне ёсць адмысловы альбомчык на маёй старонцы ў "Фэйсбуку", які называецца "Pictures in an interior" — другое жыццё маіх карцін у офісах, банках, жылых памяшканнях па ўсім свеце. У музеях толькі няма. Бывае, 10 гадоў карціну не бачыў, і яна ўжо становіцца чужой.

Зайздроснае становішча

— Чаго на ваш погляд не хапае для таго, каб мы больш актыўна ўключыліся ў працэсы арт-рынку?

— Канешне, фінансаў. Напрыклад, мінімальны бокс на "Арт-Баззэль" каштуе 30 тысяч еўра. Ведаю, што некалькі расійскіх галерэй падавалі заяўку, але не прайшлі — ахвотных прыняць удзел у тры разы больш, чым месцаў. Ды і трэба, каб галерэя "пацягнула" ўдзел у фінансавым плане, мела пэўную рэпутацыю.

— Што можаце сказаць адносна практыкі арт-кірмашоў?

— Многія прэстыжныя кірмашы ўвогуле не працуюць з галерэямі маладзейшымі за тры гады. Цяпер шмат мастакоў едзе на "Арт-Кіеў". Дык калі ён пераехаў у Мастацкі арсенал, падзея стала вельмі цікавай, "жывым" месцам. Адна наша галерэя ўдзельнічала ў "Арт-Варшаве", добра, што яе аднавілі. А адзіны ва ўсёй постсацыялістычнай прасторы кірмаш правядзіўся раз на два гады ў Познані: ад Савецкага Саюза пускалі толькі дзве маскоўскія і адну пецярбургскую галерэі. А вось да "Арт-Баззэло" мы не дараслі.

— Як адносіцеся да арэнды карцін?

— У свеце ёсць такая практыка, калі ў галерэі арэндуюць карціны банк ці офіс. Праўда, я не ведаю, хто каму павінен плаціць: галерэя за прамоўшн ці банк за тое, што выкарыстаў.

— А вы сочыце за "топамі"? Ні разу не было напісана, што ваша карціна ўзначальвае "топ" самых дарагіх работ…

— Не. Я, напэўна, не самы дарагі мастак з беларусаў. І ўвогуле, на сотых ролях у нашай краіне. Затое шмат гадоў працую з швейцарскім калекцыянерам, у якога даволі вядомая прыватная калекцыя класічнага мастацтва — Альбрэхт Дзюрэр, Сандра Бацічэлі, Тыцыян, Рэмбрант ван Рэйн… Ён альбом выдаў пра мяне. Карацей, мае карціны ў асноўным знаходзяцца за мяжой.

— Як вам такое суседства з Рэмбрантам, Бацічэлі?

— Нармальна. Я гэта не афішую, праўда.

— Вы арыентуецеся на пакупнікоў? Хто ваш патэнцыйны пакупнік?

— Я знаходжуся ў зайздросным становішчы: магу маляваць тое, што мне падабаецца. І такую карціну лягчэй прадаць — гэта ўсё ж такі шчырая праца. Бачна па карціне: яна рабілася на замову або для сябе.

Пытанні задавалі Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Пётра ВАСІЛЕЎСКІ, Настасся ПАНКРАТАВА, Вольга РОПАТ, Сяргей ТРАФІЛАЎ. Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

К

ф о т а ф а к т

У нядзелю, 19 чэрвеня, у Слонімскім драматычным тэатры адбудзецца прэм'ера: "Бяду ад пяшчотнага сэрца" Уладзіміра Салагуба паставіў галоўны рэжысёр трупы Васіль Сявец. Спектакль з лёгкай усмешкай паказвае чалавечыя недахопы і характары, а ў фінале перамагае шчырасць і справядлівасць. Сваіх герояў выдатна сыгралі як вядучыя артысты тэатра, так і маладыя. У спектаклі шмат музыкі, танцаў і песень. Верыцца, што прэм'ера на сцэне тэатра гледачам прынясе асалоду і адпачынак.

Фота Сяргея ЧЫГРЫНА

Аўдыя & Відэа

Майскія аўдыя/відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць гітарыст гурта "Flat" Андрэй ДЗЯМЕНЦЬЕЎ (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты "Культура", музычны крытык Алег КЛІМАЎ (В.).



тэкст

Алег КЛІМАЎ, спецыяльны карэспандэнт "К"

Андрэй ДЗЯМЕНЦЬЕЎ, гітарыст гурта "Flat"



АЎДЫЯ

Гурт "Gurreactive", міні-альбом "приЛИЧНОЕ"

А.: А што ж, цалкам прыстойны рэпіз. Сумленны да наіўнасці, гэтым і добры. Чамусьці (ужо і не ведаю чаму) прыгадаўся мой родны, на жаль, спачылы гурт "Калі Юга". Нешта падобнае мы выконвалі ў 1990-я і мелі некаторы поспех, мабыць. Гітарысты "Gurreactive" пастараліся ад душы, саўнд даволі жорсткі. Песня "Забіваць" наогул па гуку ды падачы прыняла для думкі пра гурт "ZZ Top". Дык яшчэ трэба ўмець...

Папрацаваць бы з вакалам, але, калі я правільна зразумеў, спявак — дастаткова дарослы спадар, і тут ужо "што вырасла, тое вырасла", або так: "разумнага вучыць — толькі псаваць". Урэшце, некаторыя шурпатасці ў інтанаванні могуць быць нейкай аўтарскай нарыхтоўкай. Як там у Стругацкіх — сыдзе за далягляд? Сыдзе. Чацвёрка з плюсам.

В.: Руліць Магілёў у выглядзе культавага для гэтага горада складу. Гады ды новыя музычныя стылі над Аляксандрам Гурам, лідарам гэтай калабарацыі, не пануюць. Як "рэзаў" ён амаль 20 гадоў таму "рускі рок" дваровага разліву, а-ля ленінградскі рок-клуб або маскоўская рок-лабараторыя часоў іх росквіту з застоем, так і "рэжа". Што не можа не выклікаць павагі. Уласна, акрамя павагі міні-альбом ніякіх іншых пачуццяў і не выклікае. Ну, можа, песня "Забіваць" чапляе сваім нахабствам ды аголенасцю. Астатняе — тлен, архаіка. Аднак, дапускаю, што ідэя ў тым і заключалася, каб такімі выкананнем ды запісам перадаць тыя рэтра-эмоцыі. Віктар Цой у Гуры ўсё яшчэ жывы, і добра, добра, што не Аніта.

Гурт "Zui", альбом "Пытанне"

А.: Зухавата! Тэксты некаторых трэкаў ("Супермаркет", "Тату звольнілі") прымуслілі такі пакурчыцца — ну нельга ж так з нервовым чалавекам. Інструментал вельмі эклектычны і дае спасылкі да гуртоў "Калібры", "Мегаполіс", да Эні Ленакс (так-так!) ды ледзь не да Б'ёрк. Голас — проста бальзам на душу: такіх чыстых ды дасканалых вакальных прагрэсій даўно не даводзілася слухаць. Не скажу, што я пачаў бы слухаць гэты альбом у машыне, аднак, каб меўся дыск дома на паліцы, пры пэўным настроі я яго абавязкова ставіў бы ды прайграваў. Улічваючы, што музыку слухаю вельмі рэдка (чукча не чытач, чукча — пісьменнік), гэта нешта ды значыць.

В.: У праекце былога ўдзельніка гурта "Дзецідзяцей", цяперашняга музыканта каманды "ili-ili" ды акцёра Купалаўскага тэатра Міхаіла Зуя занятыя трое яго калегаў і двое з бэнда "Нагуаль" (у тым ліку яго ідэолаг Леанід Паўлёнак). А лідар-вакаліст выступае жонка Міхаіла — Алена Зуй-Вайцяхоўская. Альбом — гэта такі пірбыд, сумесь "Дзецідзяцей", "Sounduk", "ili-ili" ды нават крышачку "Сярэбранага вяселля". Сур'ёзная ды наіўная ў тэкставым дачыненні, з жыццём у розных яго праявах — глабальных ды ўтылітарных, немудрагеліста ды міла аранжыраваная работа.

Праект "Рэхам", альбом "Памяці фрагменты"

А.: Для мяне гэты кірунак — цёмны лес, адсутнасць якой-небудзь канкрэтыкі палохае. Аднак трэба прызнаць, што гучанне вельмі прыемнае і несумненна шматлікім прыйдзецца па гусце. Па кожным трэку праходзіцца я не бачу сэнсу з-за недастатковай кампетэнтнасці ў гэтым музычным стылі, можа хіба адзначыць некаторую схільнасць да сімфанізму, што надае фундаментальнасці, а таксму напоўненаму кіслародам матэрыялу гэта толькі на карысць. Куды лепш пра гэта мог бы распавесці (а заадно і даць адэкватную ацэнку) які-небудзь Клаўс Шульц або Браян Іна. Я ж толькі прызнаю, што пад такую музыку вельмі прыемна дыс карысна займацца дыхальнай гімнастыкай і, магчыма, ёгай.

Паверце, у мяне няма намеру здзекавацца, проста, паўтаруся, я не зусім кампетэнтны ў гэтым жанры, і ацаніць дадзены альбом магу толькі павярхоўна. Якасць матэрыялу вельмі добрая, "частотка" вельмі ўдала збалансавана, што тут скажаш, а зрэшты, інакш і быць не можа з музыкай, якая заснавана на частотных ды эмбравых мадуляцыях. Неяк так.

В.: Пад "рэхам" схаваны нейкі музыкант, які валодае псеўданімам Openaiid. Як цывяджаецца ў прэс-рэлізе, што анансуе прадукт, "новы праект вылучаецца перш за ўсё музычна. На змену трып-хопу ды драм-н-бейсу прыйшоў атмасферны эмбіент, разведзены меладычным ды больш мяккім нойзам, упрыгожаны ўкрапваннямі шугейза". Як вы зразумелі, у прынцыпе, мне дадаць да гэтага пасылу асаблівых і няма чаго. Калі ў вас маецца сталае жаданне сістэматычна адслухоўваць кампазіцыі даўжынёй хвілін па 9 — 17, то гэта работа для вас.

ВІДЭА

#endeni, кліп на песню "Той самы момант"

А.: Вельмі нетрывіяльны і ад гэтага цікавы трэк. Відэашраг таленавіты, нягледзячы на " бюджэтнасць". Мінімалістычная інструментоўка "сыграла", усё слушна, з такім матэрыялам інакш і не трэба. Рэп з характэрным "прыдыхам" гучыць даволі арыгінальна, а пранізлівы па сэнсе, хай і не ідэальны па форме, тэкст проста зачароўвае і дае падставы меркаваць, што аўтар кажа пра нешта глыбока асабістае.

Па гукаржэкысуры — голасу можна было б надаць "жалеза", хоць чорт яго ведае, усё ж — лірыка... Інструментал не чапаем, там усё "ў масць", прыгожы ды вельмі дарэчны барабанны малюнак (можа быць, ледзь-ледзь не хапае якога-небудзь басовага падгуку, але гэта не догма), дысканты таксама не падвялі, словам, я — "за". Абедзвюма рукамі!

В.: Дзівацтваў не злічыць у нашым свеце. Вось адно з іх, наўпрост з Гомеля. Мясцовы рэпер #endeni ды тыя, хто прымаў удзел у здымках дадзенага кліпа, больш за 15 гадзін правялі лежачы на падлозе аднаго з тамтэйшых дамоў культуры. Усё гэта было задумана ды ажыццёўлена, мабыць, для таго, каб атрымаўся эксклюзіў, які найбольш поўна адлюстроўвае змест кампазіцыі. У роліку герой высвятляе адносіны з дзяўчынай, ажно матылі пырхаюць, потым, як заведзена, яна яго кідае, але хлопец не здаецца ды пераадольвае перашкоды на шляху да вяртання сэрца паненкі. Але, на жаль, і ў кліпе, і ў трэку пачуццё да красуні не вярнулася.

Форум

Рэклама рэкламы

Яўген РАГІН,
рэдактар аддзела
газеты "Культура"

Неяк падумаў, а як бы я на месцы сельскага бібліятэкара прарэкламаваў сярод чытачоў самую непапулярную фондавую кнігу.

Перш-наперш расклеіў бы на слупах і дзвярах крам улёткі з надпісам "Не чытайце гэтую кнігу!" І яна адразу знайшла б аднаго-двух чытачоў. Такая рэклама, так бы мовіць, — правакацыйная, ад адваротнага: што забаронена, тое і ўвагу прыцягвае. Але гэта толькі адзін від рэкламы. І ці прыдатны ён на вясковых завулках, дзе яшчэ не перасталі верыць напісанаму ды друкаванаму слову?…

Кніжная выстава па сённяшніх мерках — рэч малаэфектыўная. Вяскоўца трэба ўражваць, здзіўляць і без прамаруджвання "браць у палон". Непапулярная кніга — кепска разрэкламаваная кніга. Давайце запросім дзятву намаляваць для яе плакаты-ілюстрацыі і расклеім іх на тых жа слупах ды дзвярах. Давайце прыцягнем тых жа дзяцей, каб увечары прачыталі бацькам рэкламную літаратурную лекцыю, ды яшчэ з "заманухай", што самы першы чытач атрымае званне самага актыўнага з занясеннем на дошку чытацкага гонару. (Вось вам яшчэ некалькі чытачоў!) Пойдзем далей і створым з той жа дзятвой невялічкую п'еску і тэатралізацыю паводле яе ўсё пра тую ж кнігу. А сцэнай няхай стане вясковая вуліца ва ўсю яе даўжыню. Гарантыю даю: кнігу стануць рваць з бібліятэкарскіх рук. Чытацкага расчаравання не будзе: нецікавых кніг не бывае, бывае нецікавая іх прапаганда (чытай — рэклама) сярод мэтавых аўдыторый.

Уважлівы чытач "К" з лёгкасцю можа назваць публікацыі пра самыя розныя віды бібліятэчнай рэкламы. Хто не памятае, я нагадаю: пры дапамозе райцэнтраўскага грамадскага транспарту можна і трэба агучыць запісы вершаў і прозы, наладзіць жывапісныя выставы дзіцячага малюнка на тэму карысці ўсеагульнага чытання, арганізаваць перад пасажырамі выступленні бібліятэкараў пра тое, дзе знаходзіцца бібліятэка і што яна можа прапанаваць.

Тое ж тычыцца не толькі кніг і бібліятэкараў, але і народных майстроў, музейшчыкаў, іншых работнікаў культуры. Толькі для гэтага, натуральна, трэба часцей бываць сярод людзей. Разумею, цяжка, нязвыкла і дадаткова не аплачваецца. Разумею, што на сяле праблемы з выхадам у інтэрнэт. Але, як паказваюць факты гэтага газетнага развароту, аналагічныя

Кошты кусаюцца…

Кацярына ЛАБУКА,
дырэктар Віцебскага
абласнога метадычнага
цэнтра народнай
творчасці

З рэкламай — бяда. Для Горада майстроў падчас аднаго са "Славянскіх базараў…" спрабавалі замовіць банер для больш дакладнай вадзіцельскай арыентацыі. Але гэта аказалася так дорага, што мы ўрэшце адмовіліся. Так, прыдарожная рэклама, пра адсутнасць якой "К" піша вельмі часта, — задавальненне, якое культуры не па кішэні. А такая "сацыялка", я пераканана, патрэбна краіне. Яна ж, урэшце, не піва прапагандуе, а гістарычныя брэнды. І калі дзяржава мяркуе развіваць турызм, без такіх прыдарожных указальнікаў не абысціся.

Адкуль, да прыкладу, вандроўнік на аўто можа здагадацца, што, скажам, у Віцебскім раёне вырабляюць унікальны квас па прадзедавай тэхналогіі, а мясцовыя работнікі культуры вакол гэтага брэнда закруцілі процьму цікавых мерапрыемстваў? Ці ўзяць Глыбокае, дзе традыцыйным стаў вішнёвы фестываль. А ў Лёзна брэндам сталі клубніцы. Ягады прадстаўлены і ў выглядзе сувеніраў. А чаму б іх выявы не паставіць збоч шашы, ды з картай, дзе пазначаны сувенірныя крамы, музеі, час правядзення традыцыйных фестываляў? Дык не: недасягальна дорага. Адно выйсце: рабіць сваімі сіламі. Інакш брэнд так і застанецца нераскручаным.

Цудоўную ініцыятыву праявілі нашы тэатры лялек. Дзіця ў тэатральным квартале не заблукае, а выведзе бацькоў наўпрост да тэатральных кас. Дарогу падкажуць жывыя выявы лялек. Крэатыў! А яшчэ для рэкламы культурных з'яў можна выкарыстоўваць (вельмі модная цяпер рэч!) глухія фасады жылых дамоў. Але іх мастацкі роспіс з дапамогай валанцёраў — таксама не танны…

Брэнд павінен "адстаяцца", каб даказаць сваю правамоцнасць. Вось ва Ушачах леташнім сімвалам стала тэматыка партызанскага прарыву. Гэта ў пэўнай ступені дапамагло мясцовым работнікам культуры прывесці да ладу аднайменны мемарыяльны комплекс. Але такі трагічны брэнд не можа быць сталым. Ва Ушачах думаюць, які сімвал узяць на творчае ўзбраенне.

А Мёры на справе давялі, што журавы і журавіны — яркі брэнд запатрабаванага экалагічнага фестывалю. Як тут не згадаць лепельскага цмока. Аднак работнікі культуры раёна бяруць шырэй: брэнд для іх — Бярэзінскі запаведнік, дзе яны і "вырошчваюць" вельмі культурных і прывабных цмокаў. Уяўляеце, якой магла б быць прыдарожная рэклама!

І колькі слоў пра дубровенскага салаўя. Аўтар глінянага брэнда Людміла Кавальчук зрабіла сёлета сімвалічнае дрэва з гняздзечкамі, куды госці фэсту "Дняпроўскія галасы ў Дуброўне" будуць "засяляць" сваіх птушачак. Добры рэкламны ход.

Не адзін буктрэйлер

Ганна КЕРАЛЬ,
бібліятэкар аддзела
маркетынгу
Астравецкай раённай
бібліятэкі

Сёння, у імклівы час усеагульнай інфарматызацыі і інтэрактыву, усё, што не змагло прыстасавацца пад папулярны лічбавы фармат, здаецца састарэлым і непатрэбным. Бязлітасны дух часу ў ліку першых адчулі бібліятэкі.

На жаль, блукаць сярод бясконцых стэлажоў, уважліва аглядаючы кожны том і беражліва перагортваючы старонкі, цікава толькі людзям старой фармацыі. Новае ж пакаленне прывабіць у храм кнігі практычна немагчыма. Ды і ці трэба, калі амаль любую інфармацыю можна знайсці ў інтэрнэце: хутка, зручна, на даму.

Дык няўжо ў бібліятэк сапраўды сумная будучыня? Той-сёй кажа, што нібыта пераўтворацца яны неўзабаве ў музеі, дзе захоўваюцца фаліянты часоў прапрадзядулінай маладосці і ладзяцца экскурсіі для аматараў сівой даўніны. Карацей, пытанняў шмат, адказаў мала. Таму бібліятэкары ўглядваюцца ў будучыню з асцярожнай надзеяй: не будуюць глабальных планаў, але і паміраць не збіраюцца. Зразумела адно: сядзець моўчкі не выпадае. Таму ў Астравецкай раённай бібліятэцы правялі семінар, на парадак дня якога вынеслі адзінае пытанне: "Выкарыстанне рэкламы ў дзейнасці бібліятэк".

> "Блукаць сярод стэлажоў цікава толькі людзям старой фармацыі. Новае ж пакаленне прывабіць у храм кнігі **практычна немагчыма.** Як быць?"

Галоўныя задачу і праблему агучыла намеснік дырэктара ДУК "Астравецкая раённая бібліятэка" Вольга Пінчук. Задача бібліятэкі: быць карыснай кожнаму чытачу. Праблема: эфектыўнасць рэалізацыі задачы. Спецыялісты аддзела бібліятэчнага маркетынгу і аддзела абслугоўвання распавялі пра віды бібліятэчнай рэкламы. Самая даступная — друкаваная: буклеты, улёткі, календары, запрашальнікі. Не менш папулярная рэклама — кніжныя выставы. Гаворка ішла і пра ўмацаванне бібліятэчнага іміджу ў віртуальнай прасторы, пра акаўнт райбібліятэкі на старонках сацыяльных сетак.

Для сельскіх бібліятэкараў быў праведзены майстар-клас па стварэнні буктрэйлераў — сродкаў эфектыўнай рэкламы кнігі. Супрацоўнікі раённай бібліятэкі прадэманстравалі буктрэйлер на кнігу Адама Мальдзіса "Восень пасярод вясны".

"На дом" сельскія спецыялісты атрымалі заданне па стварэнні акаўнта бібліятэк у сацыяльных сетках, выпуску рэкламнай прадукцыі, пошуку іншых спосабаў папулярызацыі сваіх устаноў.

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Бярозаўшчына / "Жунку ў хату нэ могу загнаты"

Гэтымі выхаднымі ў аграгарадку "Спорава" адбываецца VI Свята народнага гумару "Спораўскія жарты". А першае свята гумару прайшло ў 1996 годзе.

Показкі пра гэтую азёрную зямлю расказвалі яшчэ каля двухсот гадоў таму. Вось адна з апошніх.

Ідзе ўчастковы міліцыянер па Споравe. Бачыць: спаравец (так мясцовыя сябе называюць) вакол хаты жонку ганяе.

— Што ты робіш?

— Да вот, жунку ў хату нэ могу загнаты…

За два дзясяткі "гумарных" гадоў ў Споравe былі адкрыты "метро", "куранты" і "пасольства гумару", помнікі "Спараўцу і Спароўцы", "Карасю". Менавіта рыба для спараўцоў і ёсць самая галоўная "валюта". Нязменную цікавасць выклікае "Карта рассялення спараўцоў па свеце"…

Што адбываецца на сёлетнім свяце? Цягам двух дзён на беразе возера не спыняюцца конкурсныя "баталіі" творчых дэлегацый з усіх раёнаў Брэсцкай вобласці пад агульнай назвай "Добраму суседу — багатае лета". Вясёлых і кемлівых, творчых ды таленавітых — больш за тры сотні. Каб, як кажуць, не трапіць тварам у бруд, грунтоўна рыхтуецца да "фірменнага" свята народны тэатр народнага гумару "Спораўскі акалот" мясцовага Цэнтра культуры і вольнага часу, які абараняе гонар Бярозаўскага раёна.

Галіна МІХНЕВІЧ,
вядучы метадыст
Бярозаўскай раённай
клубнай сістэмы

Падчас свята народнага гумару ў Споравe.

Выпускнікі Мінскага музычнага вучылішча імя Міхаіла Глінкі: сустрэча праз 45 гадоў.

Мінск / Курс — правільны!

Мы ўсе вучыліся ў Мінскім музычным вучылішчы імя Міхаіла Глінкі. Тыя чатыры гады пранесліся імклівымі крокамі музычных рытмаў. Пасля выпуску кожны намагаўся знайсці ўласны стыль рэалізацыі. Прайшло з таго часу 45 гадоў. Нам — па 60, і мы сустрэліся.

Колішнія аднакурснікі выклікаюць у мяне пачуццё глыбокай павагі. Практычна ўсе атрымалі вышэйшую адукацыю, знайшлі выкарыстанне свайму таленту. Але гады навучання ў вучылішчы засталіся часам станаўлення характару, базай, якая дала магчымасць рэалізавацца камусьці ў педагагічнай дзейнасці, камусьці — у артыстычнай, выканальніцкай, а камусьці — у дырыжорскай…

Жыццё раскідала нас па свеце: ЗША, Ізраіль, Люксембург… Але праз кожныя пяць гадоў мы спяшаемся ў Мінск, каб ізноў сустрэцца. Вось яны, мае паплечнікі. Кавалер ордэна "Знак Пашаны" Леанід Рауцкі, адзін з вядучых педагогаў Беларусі, музыкант, які актыўна канцэртуе. Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Мікалай Калядка, дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь "Паазер'е" Анатоль Собаль. Гэты калектыў — лаўрэат прэміі Прэзідэнта краіны "За духоўнае адраджэнне", а таксама прэміі UNESCO "За захаванне нацыянальнай музычнай спадчыны". Беларускі кампазітар Уладзімір Грушэўскі, аўтар твораў для фартэпіяна, баяна, цымбалаў, кантаты на вершы Максіма Багдановіча, араторыі для барытона, баса, змешанага хору і сімфанічнага аркестра, сімфанічных паэм і песень.

У ліку маіх аднакурснікаў — мастацкі кіраўнік і дырыжор камернага аркестра "Струны Галілеі" Леанід Фітэрштэйн, былыя дырэктары музычных школ Людміла Рауцкая, Галіна Левашкевіч, Анатоль Собаль, Васіль Шутко, Уладзімір Грушэўскі. А яшчэ — дацэнт Беларускай акадэміі музыкі Аляксандр Селачнік, чатыры намеснікі дырэктараў музычных школ і педагагічных каледжаў Людміла Корцікава, Ірына Ільіна, Таццяна Бондарава, Раіса Карпекіна, саліст народнага ансамбля народных інструментаў "Каралі" Васіль Шутко, кіраўнік фальклорнага ансамбля "Вязынка" Аляксандр Макараў, загадчыкі цыклавых камісій музычных школ і вучылішчаў, салісты прафесійных аркестраў, высакакласныя выкладчыкі… Карацей, ёсць усе падставы назваць наш курс лепшым у свеце.

Многіх гадоў жыцця, дарагія аднакурснікі! Шчасця вам і дабрабыту!

Галіна ТРАЦЦЯК
Люксембург

Віцебск/ Шчаслівыя пачаткоўцы

У выставачнай зале Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці працуе чарговая выстава

праблемы існуюць нават у райцэнтраўскіх установах. Але гэта не азначае, што трэба чакаць немаведама якіх спрыяльных умоў. Прымусьце СМІ пісаць пра вас. Вунь у Беразіне стварылі рэкордную па памерах лыжку, дык журналісты і па сёння не стамляюцца гаварыць пра тамтэйшы Цэнтр рамёстваў і ягоных народных майстроў.

Брэнд — заканамерны вынік якаснай рэкламы. Толькі не разумею, чаму Слуцк, ужо маючы шыкоўны пояс, абраў у якасці сімвала яшчэ і салаўя. Чым больш брэндаў, тым лепш? Мо і так. Але як быць Дуброўна, дзе які ўжо год брэндам Міжнароднага фестывалю песні і музыкі "Дняпроўскія галасы ў Дуброўне" таксама з'яўляецца салавейка? Таму самы час і пра аўтарскія правы падумаць. Ёсць у Шклове, да прыкладу, свята гурка і адпаведны помнік гэтай гародніне, значыць, у іншых раёнах выкарыстоўваць такі брэнд — "не магі"!

Урэшце, на гэту тэму ўжо была публікацыя ў № 20.

Прасоўванне брэнду — лагічны працяг рэкламы. Вось каб дайшлі да Слуцка значкі, магніцікі, майкі, асадкі, паштоўкі ды кераміка з салаўінай дубровенскай выявай, дык мо і не ўзнікла б таўталогіі? Падаецца, так. А ўяўляеце, якім цікавым, ёмістым і карысным мог бы атрымацца маляўнічы альбом брэндаў: і раённых, і сельскіх. Замежны турыст не блытаўся б, куды яму ехаць па беларускі экзот.

І напрыканцы пры гісторыю расійскага мястэчка Мышкін. Прыходзіла яно паціху ў заняпад. Покуль хтосьці з работнікаў культуры не схамянуўся: пачакайце, у нас жа гатовы брэнд ёсць — мыш! Так на Яраслаўшчыне ўзнік адпаведны музей — адзіны ў свеце. І калі ў 1990-х яго наведвала за год 5 тысяч турыстаў, дык цяпер — у дзесяць разоў болей. Карацей, нам ёсць над чым працаваць.

К

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на старонках **kimpressby** у сацыяльных сетках **Facebook, VK, Twitter, Instagram**

Лепш грошы пусціць на альбом

Самадзейнаму калектыву немагчыма прабіцца да шырокага гледача без рэкламы. Натуральна, спярша мы павінны ўласнымі стараннямі давесці, што чагосьці вартыя.

Падаецца, гэта этап мы прайшлі. У сацыяльных сетках існуе суполка прыхільнікаў "Ягоравай гары". Сярод іх шмат расіян — аматараў беларускай песеннай аўтэнтыкі. Ці не таму нас больш ведаюць за мяжой? Прынамсі, нядаўна вярнуліся з Санкт-Пецярбурга, дзе па запрашэнні бралі ўдзел у фэсце "Славянскі кірмаш" і выступалі на адной сцэне з такімі гуртамі, як "Іван Купала" і "Буранаўскія бабулі".

Ягор ПАЛЯШУК,
кіраўнік і аўтар фольк-праекта "Ягорава гара" з Гомеля



Нават, калі з'явіліся б нейкія дадатковыя грошы, мы скарысталі б іх для стварэння чарговага музычнага альбома (матэрыялу ў нас на тры назбіралася). Не забывайце, у кожнага з нас ёсць асноўная праца, а "Ягорава гара" — так бы мовіць, адхланне. Так што ў плане рэкламнага прадукту абмяжоўваемся пакуль толькі магніцікамі з выявай гурта. А ўвагу прыцягваем актыўнымі канцэртнымі выступленнямі на такіх фэстах, як, да прыкладу, "Свята Сонца", што адбудзецца гэтымі выхаднымі пад Мінскам.

Толькі ў выніку нашай творчай незаспакоенасці "Ягораву гару" сёлета тройчы заўважыла Гомельскае тэлебачанне. Мы цяпер рыхтуем праграму для моладзі, дзе нас падтрымлівае брэйк-данс-калектыў з абласнога цэнтра. З'явіцца кліп паводле песні "У полі бярозка стаяла" з брэйк-дансавым афармленнем — пашырыцца і сфера нашага ўплыву. Прынамсі, ніколі не забываем, што мы — студыя эксперыментальная.

Росту папулярнасці сярод моладзі паспрыяла і тое, што зрабілі па замове Гомельскага гарадскога цэнтра культуры перапеўку песні гурта"The Beatles" — гаворка пра "All together now". Але зрабілі гэта па-свойму, на беларускай мове. І такі эксперымент быў ухвалены моладдзю.

> "У кожнага ёсць асноўная праца, так што ў плане рэкламнага прадукту **абмяжоўваемся пакуль магніцікамі** з выявай гурта. А ўвагу прыцягваем канцэртамі".

Пад дахам ГЦК — каля сотні музычных калектываў. Мы ў топ-шэрагу ці не на першым месцы. А гэта ўжо дасягненне. Хоць, паўтару, эскіз лагатыпу "Ягоравай гары" для змяшчэння на саколках так і застаецца пакуль эскізам.

Але спадзяёмся: неўзабаве станем запатрабаванымі не толькі ў Гомелі, але і ва ўсёй рэспубліцы.

Патэлефанаваць нам нельга

Фёдар РАЦЫК,
загадчык Мотальскага музея археалогіі "Нашы карані"

Наша ўстанова, як вы ведаеце, з'яўляецца філіялам Музея народнай творчасці, які змешчаны таксама ў Моталі. А другі філіял — Дом траўніка — працуе ў вёсцы Стрэльна. Іванаўскі раён увогуле ўнікальны па наяўнасці музейных аб'ектаў, бо ў Варацэвічах ёсць яшчэ і музейны комплекс Напалеона Орды.

Хачу праз "Культуру" прапіярыць Музей археалогіі "Нашы карані", якому толькі тры гады. Паверце, гэта ўнікальная ўстанова. У нас ёсць знаходкі позняга каменнага веку, эпох мезаліту і неаліту, часткова — бронзавага веку. Сярэднявечча прадстаўлена не так грунтоўна, бо тыя пласты знаходзяцца пад жылой забудовай. Археалагічныя даследаванні на нашых землях вяліся з 1960-х рознымі археолагамі, апошнія 25 гадоў — Аленай Калечыц, якая і стала аўтарам навуковай канцэпцыі нашага музея. З дапамогай артэфактаў экспазіцыя распавядае пра тое, як нашы продкі вучыліся жыць на гэтай зямлі ў гармоніі з сабой і прыродай. Ці не ў гэтым выток любога мастацтва?

А вось з рэкламай у нас — не ўсё гладка. Музею трэба ў свет выходзіць, а няма тэлефоннай сувязі, няма, адпаведна, і выхаду ў інтэрнэт. Так што стварэнне ўласнага сайта — мэта пакуль недасягальная. Але план па аказанні платных паслуг мы выконваем. Летась зарабілі, да прыкладу, 15 мільёнаў. Справімся з заданнем і сёлета. Сталая экспазіцыя заўжды прыцягвае школьнікаў, якія пастаянна здзіўляюцца, што мы — не пра дыназаўраў, а пра рэчы з археалагічных раскопаў. (Дарэчы, наш самы ўнікальны музейны прадмет — круглая амфара — знаходзіцца ў экспазіцыі Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.) Так што пастаянна даводзіць наведвальнікам: любыя керамічны аскепак ці каменная прылада працы захоўваюць цеплыню рук нашых продкаў. У пераемнасці традыцый — залог далейшага ўмацавання Беларусі. Спрабуем распавесці пра гэта ў друкаванай рэкламе. Але яна не заменіць магчымасцяў музейнага сайта.

> "Чарговы праект — больш **дасканалая прафарыентацыя** вучняў, заснаваная на арганізацыі раскопак, удзеле ў іх".

Канешне, лепшая рэклама — гэта наша праца. Запытаеце: "Якія творчыя праекты прапаноўваеце наведвальнікам?" У нас ёсць зала, якую можна перарабіць у майстэрню, навуковую лабараторыю, дзе можна было б даведацца пра археалогію палявую і кабінетную. Мала знайсці артэфакт, важна яго ўсебакова даследаваць, адшукаць яму належнае месца ў археалагічнай калекцыі. Усё гэта вельмі цікава. Але рэалізацыя праекта немагчымая без належнага фінансавання. Трэба сымітаваць зямельны пласт, наладзіць працэс навучальнага кабінетнага даследавання. Цяпер раюся са спецыялістамі, як гэта зрабіць з мінімумам грашовых выдаткаў. Выкарыстоўваем і магчымасці лекцый на мясцовым матэрыяле. Адна з іх — пра Вялікую Айчынную вайну: у нас засталіся будынкі, што захавалі сляды баёў. Цягам 45 хвілін робім віртуальныя вандроўкі па горадзе і раёне. Так што і краязнаўчы матэрыял назапашваем і выкарыстоўваем. Чарговы праект — больш дасканалая прафарыентацыя вучняў, заснаваная на арганізацыі раскопак, удзеле ў іх.

Неўзабаве скончыцца мая адпрацоўка (амаль два гады таму скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка), але з'язджаць не збіраюся: у Моталі жывуць мае бацькі, тут маё першае месца працы, дзе мяркую рэалізоўвацца і надалей.

Крэатыў-праект "Арт-вакно..." жыве і развіваецца.

работ удзельнікаў студыі творчасці для дарослых "Happy-art".

Дадзеная выстава — вынік рэалізацыі творчых здольнасцяў людзей розных прафесій і ўзросту. На выставе прадстаўлена пяць тэматычных стэндаў і каля 60 работ, выкананых пачаткоўцамі ў 2015—2016 гадах.

У экспазіцыі можна ўбачыць як рэалістычна прапрацаваныя сюжэты, так і інтуітыўна створаныя жывапісныя кампазіцыі, намаляваныя алоўкам, тушшу, гуашшу, акварэллю, пастэллю.

Як адзначылі кіраўнікі студыі Наталля Аніськовіч і Ірына Лавішэк, выстава стала падставай для падвядзення вынікаў дзейнасці студыі і магчымасцю сустрэцца ўсёй творчай грамадой, каб парадавацца за сябе і іншых ды акрэсліць планы на будучыню.

Андрэй СТРУНЧАНКА,
вядучы метадыст Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці

Рагачоўшчына\ Слова пра майстроў

У руках народных майстроў, якія займаюцца традыцыйным беларускім мастацтвам, дрэва, лаза, салома, гліна, тканіна пераўтвараюцца ў яркія выразы, якімі ганарыцца Рагачоўшчына.

Словы шчырай падзякі пастаянна гучаць у адрас дырэктара Стрэнькаўскага цэнтра рамёстваў, народнага майстра Рэспублікі Беларусь Валянціны Кіпценка. Энтузіяст, яна перадае моладзі веды, талент, натхненне і любоў да працы на ніве народных рамёстваў, знаёміць ахвотных з унікальнай тэхнікай саломкапляцення, ткацтва і габелена. Яе творы вызначаюцца добрым густам, прастатой форм, хараством дэкору і эстэтычнай вартасцю.

Самабытнымі сімваламі матэрыяльнай культуры Рагачоўскай зямлі з'яўляюцца вырабы з саломы і лазы, дрэва і скуры, розных прыродных матэрыялаў, бісеру і нітак. Іх аўтары — Ларыса Цішкова, Людміла Астапенка, Алена Чавусава, Уладзімір Нікалаенка, Галіна Піліпенка, Ніна Гарохава, Таццяна Манахава, Вольга Ткачова, Іван Рудзькоў, Мікалай Ляўкоў, Уладзімір Міхейчыкаў, Соф'я Кусянкова, Анатоль Кармужанін і іншыя.

Вольгу і Ігара Ткачовых аб'ядноўваюць не толькі сямейныя каштоўнасці, але і творчы патэнцыял. Спектр інтарэсаў гэтых майстроў надзвычай шырокі: мастацкая лепка, саломкапляценне, ткацтва, вышыванне, вязанне і дрэваапрацоўчыя рамёствы. Разам з бацькамі працуе і сын Арцём, які, ствараючы выдатныя ўзоры ганчарнага мастацтва, далучае да яго і школьнікаў.

Эстэтычная вартасць твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — адзін з падмуркаў генетычнай памяці і повязі пакаленняў, трываласці традыцый продкаў і набыткаў сучаснікаў, захавання агульна-этнічнай самабытнасці і рэгіянальна-лакальнай непаўторнасці. І за ўсё гэта адказваюць нашы майстры.

Ніна ХАРОНЖА,
загадчык сектара культуры аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Рагачоўскага райвыканкама

Магілёў/ Аконная арт-галерэя

У вокнах цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Карла Маркса горада Магілёва які ўжо год запар можна назіраць выставы жывапісных карцін, фатаграфій, твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва вядомых аўтараў і пачаткоўцаў.

Такім чынам рэалізоўваецца крэатыў-праект "Арт-вакно як аб'ект культурнай прасторы бібліятэкі", што нарадзіўся яшчэ ў 2013 годзе, калі горад быў абвешчаны Культурнай сталіцай СНД і Рэспублікі Беларусь. За гэты час арганізавана каля 50 выстаў.

Сёння шмат кажуць пра тое, што бібліятэка павінна стаць для кожнага трэцім месцам пасля дома і працы. Таму ўвесь час шукаем прывабныя ідэі і формы працы. Апошнім часам у вокнах бібліятэкі прайшлі выставы работ мастакоў Аляксандра Алёшына, Алены Кавалёвай, Юрыя Сяргейчыка, Уладзіслава Малахава...

Так, да 70-годдзя Вялікай Перамогі, у межах праекта "Памяць" наладзілі тэматычную фотавыставу: прэзентаваліся партрэты 28 Герояў Савецкага Саюза, якія атрымалі званне падчас вызвалення Магілёва. Да Дня інвалідаў валанцёры клуба "Ад сэрца да сэрца" Беларуска-Расійскага ўніверсітэта пад эгідай Чырвонага Крыжа падрыхтавалі сумесна з бібліятэкарамі незвычайную выставу "Фарбы душы". Малюнкі, прадстаўленыя ў вокнах, сталі вынікам арт-тэрапеўтычных заняткаў з людзьмі, якія маюць асаблівасці псіхічнага развіцця.

Нядаўна да ўдзелу ў крэатыў-праекце далучыліся і народныя ўмельцы. У вокнах бібліятэкі з'явіліся вырабы саломкапляцельшчыкаў, вышыванкі, лялькі… Карціны, расшытыя атласнымі лентамі, падрыхтавала Алена Гранская, а вышыўку крыжыкам — Тамара Вараб'ёва. Адна з апошніх выстаў дала магчымасць убачыць сімбіёз пляцення атласнымі лентамі і бісерапляцення Ніны Бародзіч і Людмілы Трушкевіч.

Напярэдадні чарговай экспазіцыі супрацоўнікі бібліятэкі арганізуюць прэзентацыі з удзелам аўтараў. Словам, праект жыве і развіваецца. Для жыхароў іншых гарадоў бібліятэкі робяць відэаролікі па матэрыялах выстаў і выкладаюць іх на сайт установы. Традыцыйна выставы ў вокнах дэманструюцца па тры тыдні. Сёння ахвотныя запісваюцца для ўдзелу ў праекце больш чым на год наперад.

Алена АСТАПАВА,
загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Карла Маркса горада Магілёва

РАСІЯ

Хто выжывае ў культуры?

Так "фестываляць" за мяжой: адваяваць сваю "дзялянку"

Рынак дыктуе свае ўмовы не толькі ў эканоміцы, але і ў сферы культуры. У Беларусі абвяшчаюцца тэндары на правядзенне фестываляў, прыватныя арганізацыі ствараюць рэальную канкурэнцыю работнікам культуры сваімі "пеннымі" дыскатэкамі ды фэстамі фарбаў ці рок-н-ролу, а іншыя крэатыўныя людзі, доўга не разважаючы, набываюць дзіцячыя электрамабілі і паветраныя горкі ды зарабляюць сабе "капейчыну" на аказанні культурных і забаўляльных паслуг наўпрост каля крамаў ды ў гарадскіх парках.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Мінск-Бранск-Мінск / Фота аўтара

Ад Пінска да Калугі

І гэта тычыцца не толькі нашай краіны. У суседняй Расіі, у Бранску, сёння зладзіць рэгіянальны ці міжрэгіянальны фэст за бюджэтныя грошы — таксама задачка не з простых. Бо і ў расіян рублёў на гэта не так ужо і багата. Ёсць, як і ў Беларусі, прыватнікі, здольныя "перахапіць" арганізацыю той або іншай культурнай імпрэзы ў работнікаў культуры. Якім жа чынам тут зацікаўліваюць сваімі імпрэзамі, як здабываюць фінансаванне пад свае праекты і ці распаўсюджана ў суседзяў спонсарства ды мецэнацтва?

Адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні я спрабаваў адшукаць падчас імпрэз IV Міжрэгіянальнага фестывалю фальклорных калектываў "Дзяснянскі карагод", які з 10 па 12 чэрвеня прайшоў у горадзе Жукаўка Бранскага раёна і ў самім абласным цэнтры. На маштабным фальклорным форуме былі прадстаўлены калектывы з Ніжняга Ноўгарада і Курска, Калугі і Варонежа, Санкт-Пецярбурга і Бранска… Усяго ж на фэст прыехала 22 самабытныя калектывы з сямі рэгіёнаў Расіі. Удзел у святочных імпрэзах узялі і беларусы: нашу краіну на фестывалі прадстаўляў народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль "Чабатухі" з вёскі Сташаны Пінскага раёна Брэсцкай вобласці.

Пра пінскі калектыў "К" ужо неаднойчы пісала. Нагадаю толькі, што названы ансамбль складаецца з пяці чалавек, якія спяваюць народныя песні свайго сяла. Да слова, сёння, як, скажам, і пяць гадоў таму, пінскія артысты запатрабаваны: выступаюць на фальклорных імпрэзах як у Беларусі, так і ў Польшчы, Расіі ды Літве. Ды і на "Дзяснянскі карагод" яны прыехалі не ўпершыню: пабывалі тут у 2014-м і настолькі скарылі мясцовую публіку, што арганізатары проста не маглі не запрасіць пінчукоў яшчэ раз…

Фэст на продаж

Але вярнуся да грашовых справаў. Як кажа дырэктар Ржаніцкага сельскага дома культуры Жукаўскага раёна Бранскай вобласці, кіраўнік народнага сямейнага фальклорнага ансамбля "Гарошыны" і галоўны арганізатар "Дзяснянскага карагоду" Іван Булаткін, фінансаванне фэсту адбываецца з некалькіх крыніц.

— У першую чаргу, гэта грошы Міністэрства культуры краіны і абласных уладаў, дэпартамента культуры Бранскай вобласці, — адзначыў "К" суразмоўца. — Таксама дапамагае нам абласны метадычны цэнтр "Народная творчасць" і адміністрацыя Жукаўскага раёна. Акрамя таго, з намі плённа супрацоўнічаюць спонсары як раённага, так і абласнога ўзроўню. Так што сёння асаблівых праблем з грашыма ў нас няма.

Але раней усё было не так. Першы фэст, які ладзіўся сіламі работнікаў устаноў культуры Жукаўскага раёна, прайшоў з удзелам усяго чатырох калектываў. Тады арганізатарам давялося доўга памучыцца, каб, што называецца, "прабіць" імпрэзу і зацікавіць ёй раённыя ды абласныя ўлады…

— Колькі я тады пісаў лістоў у розныя арганізацыі, каб наш фэст фінансава падтрымалі, колькі паабіваў парогаў у муніцыпалітэце, — згадвае візаві. — Дамаўляўся з адміністрацыямі тых сёлаў, дзе планавалася ладзіць фальклорныя мерапрыемствы, пра жыллё, харчаванне, пра падвоз удзельнікаў… Усяго і не прыгадаеш. Але ж усё-такі дабіўся!

Першы фэст, які прайшоў у 2011 годзе, быў, фактычна, дадаткам да другой культурнай дзеі — Усерасійскага свята "Сярэбраная ліра", прысвечанага творчасці Аляксея Талстога, якое адбылося ў сяле Чырвоны Рог Почапскага раёна Браншчыны ў сядзібе графа. Акрамя таго, фальклорныя дзеі прайшлі тады ў Жукаўцы і ў сяле Грышына Слабада. Другі фэст таксама дзяліў "дзялянку" з іншай імпрэзай — з 51 Усерасійскім Цютчаўскім святам паэзіі, што прайшло ў Мемарыяльным музеі-сядзібе Фёдара Цютчава ў вёсцы Оўстуг на Браншчыне, а пасля працягвалася ў Латышах Жукаўскага раёна ды ў той жа Жукаўцы.

— І толькі пасля таго, як усе ўбачылі, якую цікавасць выклікае "Дзяснянскі карагод", трэці фэст, што прайшоў у 2014 годзе, атрымаў падтрымку ад Міністэрства культуры Расіі, — кажа Іван Булаткін. — Але і сёлета я крыху хваляваўся, калі падаваў заяўку на правядзенне чацвёртага фальклорнага форуму: раптам нам адмовяць, часы ж зараз, як кажуць, не надта спрыяльныя ў эканамічным плане… Але, на шчасце, мяне падтрымалі: наш фэст, лічу, стаўся ўжо "візітоўкай" бранскай зямлі…

Хто ведае, мо з цягам часу названы фэст стане міжнародным? У кулуарах форуму і са сцэны пра гэта прамаўлялася не аднойчы…

Спонсары ў стылі інкогніта

— Фінансавыя памочнікі фэсту — кіраўнікі раённых ды абласных прадпрыемстваў і арганізацый, — кажа дырэктар абласнога метадцэнтра "Народная творчасць" Вікторыя Ешчанка. — Але яны часта просяць не згадваць пра іхнюю дапамогу ні падчас імпрэзаў, ні ў інфармацыйных буклетах ды ў Інтэрнэце. Мяркую, тое не боязь, а пэўная сарамлівасць, маўляў, ну што я такога зрабіў. Між тым ведаю: многія з фундатараў "Дзяснянскага карагоду"— прыхільнікі народнай творчасці, улюбёныя ў народную песню.

Не сакрэт, што падобнае, так бы мовіць, "інкогніта" часам сустракаецца і ў Беларусі. Улюбёныя яны ў народныя спевы ці не, гадаць не бяруся, але тое, што гэтыя людзі не вельмі любяць, каб іх згадвалі ў якасці мецэнатаў культурнай дзеі, — факт. Чаму так адбываецца — тэма для іншага артыкула. Але заўважу: актыўны выхад гэтых людзей "з ценю" — справа ўжо, мабыць, не столькі работнікаў культуры, колькі падатковых органаў…

Дарэчы, менавіта за грошы "невядомых" спонсараў Іван Булаткін выдаў некалькі дыскаў, на якіх можна паслухаць рэпертуар ягонага народнага сямейнага фальклорнага ансамбля "Гарошыны". Яшчэ адзін CD — "Традыцыйная культура Жукаўскага раёна Бранскай вобласці", дзе можна пачуць песні ў тым ліку і на чыстай беларускай мове, — быў выдадзены ўжо канкрэтнымі асобамі на сродкі гранта Прэзідэнта Расіі.

Карагод падчас фэсту (на першым плане — Іван Булаткін).

"Чабатухі" прыехалі з Піншчыны.

■■■

Як бачна, ідэя Івана Булаткіна прыйшлася "да густу" далёка не адразу. Таму галоўная выснова з майго трохдзённага "кватаравання" на Браншчыне такая: важна не толькі прыдумаць, але і ўмець "прабіць" сваю задумку, увасобіць яе ў жыццё, урэчаісніць, хай сабе і паступова, нават у "тандэме" з іншымі мерапрыемствамі і культурнымі акцыямі. Важкая, патрэбная ідэя заўсёды знойдзе шлях да развіцця, да росту, паступова ператворыцца ў галоўную, асноўную, здолее стаць мэйнстрымам.

А слабая і кволая ідэя, натуральна, з цягам часу проста памрэ. Бо, як я ўжо казаў напачатку артыкула, законы рынку што ў эканоміцы, што ў культуры — аднолькавыя, і выжывае тут толькі самы моцны і самы крэатыўны. К

Пра асаблівасці фінансавання ўстаноў культуры ў суседзяў **чытайце на старонцы 4.**

ЛІТВА, ПОЛЬШЧА, ВЕНГРЫЯ

Дамова на харавой мове

Інэса БАДЗЯКА,
загадчык кафедрай харавога дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, кіраўнік хору студэнтаў БДАМ

Выехаць вялікаму калектыву на гастролі, а тым больш замежныя, заўсёды складана. Хтосьці шукае імпрэсарыа, хтосьці — спонсараў, што таксама вельмі няпроста. Але, як паказала практыка нашай Акадэміі музыкі, ёсць яшчэ адно выйсце — падпісанне адпаведных дамоўленасцяў непасрэдна паміж навучальнымі ўстановамі аднаго профілю.

Менавіта дзякуючы такім дамовам адбыўся нядаўні гастрольны тур хору студэнтаў нашай Акадэміі музыкі па вядучых еўрапейскіх кансерваторыях. Мы выступілі ў Літоўскай акадэміі музыкі і тэатра ў Вільнюсе, Музычным універсітэце імя Фрыдэрыка Шапэна ў Варшаве і Музычнай акадэміі імя Феранца Ліста ў Будапешце.

Падрыхтоўка паездкі пачалася дзесьці за паўгода да яе. Нам вельмі дапамагала не толькі адміністрацыя нашай навучальнай установы, але і пасольствы Беларусі ў тых краінах, куды мы выпраўляліся. Пасля кожнага з выступленняў была магчымасць пабачыць самі гарады. А галоўнае — завязваліся новыя творча-педагагічныя стасункі. Цікавасць да калектыву была вялікай: прыходзілі да нас нават на рэпетыцыі. Так, у Вільнюсе на ўсе дзве гадзіны нашай рэпетыцыі застаўся прафесар Вітаўтас Мішкініс. Я не магла прымушаць студэнтаў спяваць на ўвесь голас і рабіць, такім чынам, два канцэрты на дзень. Да таго ж, усе былі стомлены працяглай праездкай у аўтобусе, пасля якой не тое што спяваць — стаяць бывае цяжка. Але ад нашага госця мы пачулі самыя ўхвальныя водгукі. У Венгрыі нас слухаў сусветна вядомы дырыжор Габар Халерунг, на канцэрце быў арганізатар буйных харавых святаў, дзеяч харавога фестывальнага руху Вольфганг Зіглер. У Польшчы, акрамя ўласна прафесіяналаў, да нас прыйшло шмат аматараў, у тым ліку — прадстаўнікоў беларускай дыяспары. Але мы высветлілі гэта толькі пасля выступлення, калі яны запыталіся: маўляў, чаго ж вы не праспявалі "Зорку Венеру"? Каб нас папярэдзілі, хто ў зале, заспявалі б. Бо рэпертуар на два паўнавартасныя аддзяленні рыхтавалі з разлікам на тых, перад кім будзем выступаць.

Пастараліся спалучыць, умоўна кажучы, Усход і Захад: спявалі і заходнееўрапейскую, амерыканскую класіку, і славянскую праваслаўную музыку, і творы беларускіх кампазітараў Уладзіміра Алоўнікава, Віктара Войціка, Вячаслава Кузняцова. Для кожнай краіны прыдумалі сюрпрызы: развучылі іх народныя песні, творы тамтэйшых аўтараў. Ва ўсіх трох гарадах правялі еўрапейскія прэм'еры Месы До мажор нашага выпускніка, лаўрэата Нацыянальнай музычнай прэміі 2014 года ў намінацыі "Лепшы аранжыроўшчык" Андрэя Саўрыцкага (шкада, што не паўсюль з падрыхтаваным намі відэашэрагам — з тэхнічных прычын прымаючага боку). Слухачы былі ўражаны і прафесійнасцю нашага калектыву, і відовішчнасцю саміх канцэртаў, бо мы і строі сцэнічныя змянялі, і тэатралізацыю выкарыстоўвалі.

Прызнацца, у пачатку года, убачыўшы, як змяніўся склад хору (а гэта цалкам зразумела для студэнцкіх калектываў), я хвалявалася, ці знойдзем салістаў, бо шмат прыгожых моцных галасоў было сярод выпускнікоў, якія сышлі. Але ўзраслі новыя таленты, якія добра справіліся з сольнымі партыямі: Арцём Пякарскі (3 курс), Кацярына Мадатава (4 курс) Васіль Ліпскі, Вераніка Карсюк, Юлія Папова, Алена Сыс (2 курс), Стэфан Казакевіч (1 курс). Падобныя паездкі — моцны стымул для ўсяго навучальнага працэсу. І непасрэдная канцэртная практыка для будучых прафесіяналаў.

Занатавала Надзея БУНЦЭВІЧ

У рэстаўрацыйных майстэрнях Музеяў Ватыкана.

ВАТЫКАН

Выстава беларускай іконы, якая праходзіць цяпер у Музеях Ватыкана, прэцэдэнтаў пакуль не мае. Пра рабочыя калізіі адной з самых значных сёлетніх ініцыятыў па папулярызацыі нашай культуры за мяжой, ад задумы да ўвасаблення якой прайшло дзевяць гадоў, а таксама пра яе магчымы працяг, распавядае генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір ПРАКАПЦОЎ.

Ілья СВІРЫН

Дастаць са схованак

Уладзімір Пракапцоў: "Замежнікам цікава тое, чаго няма ў іх"

Дапамог кардынал

— Прызнаюся шчыра — напачатку задума правесці выставу беларускіх ікон у адным з найпрэстыжных музеяў свету нават мне самому падавалася недасягальнай марай. Тым не менш, я не спяшаўся ад яе адмаўляцца.

Шмат у чым дапамог выпадак. У 2013 годзе ў Беларусі праходзіла вялікая міжканфесійная канферэнцыя, куды з'ехаліся іерархі розных цэркваў. На канцэрце ў філармоніі я амаль выпадкова, літаральна за кубкам кавы, пазнаёміўся з прадстаўніком Святога Пасаду — кардыналам Франчэска Какапальмерыя. Запрасіў шаноўнага госця наведаць наш музей, дзе акурат праходзіла вялікая выстава праваслаўных абразоў з нагоды 1025-годдзя хрышчэння Русі. Па шчырасці, і не спадзяваўся, што ён знойдзе для гэтага час у сваім напружаным графіку. Ды літаральна назаўтра кардынал стаў нашым наведвальнікам. Адпаведна, у мяне здарылася добрая нагода падзяліцца з Яго Эмінэнцыяй сваёй ідэяй прадставіць у Ватыкане беларускія абразы.

Як ні дзіўна, ён адразу ж яе ўхваліў і пагадзіўся дапамагчы. Менавіта дзякуючы гэтаму працэс, так бы мовіць, пайшоў. Тым больш, праект вельмі актыўна падтрымала наша Міністэрства замежных спраў і асабліва намесніца яго кіраўніка Ірына Купчына, а таксама пасол Рэспублікі Беларусь у Ватыкане Сяргей Алейнік.

Ды, нягледзячы на ўсе спрыяльныя фактары, перамовы праходзілі надзвычай складана, і ўжо толькі потым я зразумеў, у чым прычына. Як выявілася, у Музеі Ватыкана ёсць толькі адно вялікае памяшканне для зменных выстаў, але цяпер яно часова занятае для захавання падарункаў Папу Рымскаму. Адпаведна, выставы наогул там пакуль не праводзяцца, бо іх проста няма дзе размясціць.

І тое, што для нас было зроблена выключэнне — сапраўдны цуд! Для беларускіх абразоў кіраўніцтва музея пагадзілася часова ахвяраваць частку пастаяннай экспазіцыі, вызваліўшы залу, дзе экспануецца візантыйскае мастацтва XV стагоддзя — літаральна па суседстве з залай Мікеланджэла! Чаму так здарылася? Напэўна, прычынай сталі не толькі дыпламатычныя высілкі, але таксама і той імідж, які Беларусь усё больш набывае ў вачах міжнароднай супольнасці, пазіцыянуючы сябе краінай-міратворцам, якая спрыяе паразуменню паміж Усходам і Захадам.

У ролі канструктара

Але, як выявілася, на гэтым усе праблемы яшчэ далёка не скончыліся. На пачатку мы меркавалі выставіць каля сарака ікон, прычым некаторыя з іх маюць даволі вялікія памеры. Але неўзабаве высветлілася, што ў адведзенай нам зале ўсталяваны стацыянарныя шкляныя вітрыны вышынёю ўсяго ў 90 сантыметраў. Адпаведна, давялося ўпісвацца ў зададзеныя параметры.

Да ўсяго, тыя шкляныя "акварыумы" прызначаны для таго, каб выстаўляць невялічкія і лёгкія экспанаты — прыблізна як у ювелірнай краме. А ў нас — іконы… Таму давялося мне выступіць таксама і ў ролі канструктара, уласнаручна стварыўшы чарцёж спецыяльнага фанернага "дамка" для размяшчэння ўнутры стэлажоў. Менавіта на яго грані і замацоўваліся нашы абразы.

Падрыхтоўка да такой адказнай выставы была надзвычай складанай, але, усё ж, я здолеў знайсці пару гадзін, каб пазнаёміцца з тым бокам жыцця ватыканскіх музеяў, які закрыты для простых наведвальнікаў: рэстаўрацыйнымі майстэрнямі. Як вядома, яны лічацца ці не найлепшымі ў свеце, а такога сучаснага абсталявання, як там, няма нават у Луўры.

Магчыма, у нас тыя цуды тэхнікі з'явяцца яшчэ няхутка — хаця мы робім усе намаганні, каб адпавядаць у гэтым плане сусветным тэндэнцыям. Але назапашаны ў Ватыкане досвед усё адно шмат у чым можа быць карысным і для беларускіх рэстаўратараў. Напрыклад, арганізацыя рабочага месца… Вы не паверыце, але гэта — цэлая навука. Альбо такі важны нюанс: у ватыканскіх майстэрнях няма ніводнага прадмета, зробленага з дрэва. І стэлажы, і шафы, і нават крэслы — толькі з металу. Прычына, думаецца, зразумелая — арганічнае рэчыва спрыяе з'яўленню разнастайных бактэрый. Зразумеўшы гэта, мы вырашылі таксама змяніць свае планы адносна абсталявання новых майстэрняў, якія павінны з'явіцца ў Музейным квартале, поўнасцю выключыўшы драўніну з іх інтэр'ераў.

Падчас свайго візіту я правёў папярэднія перамовы аб тым, каб беларускія рэстаўратары атрымалі магчымасць павысіць кваліфікацыю ў Ватыкане. Кіраўніцтва музея ахвотна гатовае прыняць іх на стажыроўку. Гэту ідэю я агучыў Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Аляксандру Лукашэнку падчас яго наведвання выставы 21 мая, і Кіраўнік дзяржавы яе падтрымаў.

Спадзяюся, гэта будзе не адзіны фармат нашага супрацоўніцтва з музеямі Ватыкана. У маіх планах — правесці перамовы з іх кіраўніцтвам з мэтай выставіць у Мінску хаця б малую частку назапашаных там незлічоных мастацкіх скарбаў. Балазе для гэтага неўзабаве надарыцца добрая нагода. Дырэктар Музеяў Ватыкана Антоніа Паалучы ўжо атрымаў ад мяне запрашэнне на адкрыццё выставы беларускіх ікон у нашым музеі, якое адбудзецца ў верасні, напярэдадні III Нацыянальнага форуму "Музеі Беларусі". Прычым айчынны глядач здолее ўбачыць і тыя абразы, праэкспанаваць якія ў Ватыкане нам не ўдалося з прычыны іх вялікіх памераў.

Што трэба везці ў Парыж?

Выстава ў Ватыкане прадоўжыцца да 25 ліпеня, але пра яе несумненны поспех можна сцвярджаць ужо сёння. Глядзіце самі: колькасць наведвальнікаў дасягае трыццаці тысяч штодня (прычым адзначу, што гэта турысты не раўнуючы з усяго свету), а літаральна за некалькі першых дзён у кнізе водгукаў было запоўнена старонак дзесяць.

Адпаведна, выбар беларускай іконы для папулярызацыі нашай культуры за мяжой быў цалкам апраўданым. Чым жа яна звяртае на сябе ўвагу ў музеі, экспазіцыя якога перанасычана шэдэўрамі сусветнага мастацтва? Перадусім сваёй самабытнасцю. Беларуская ікона паўстала на скрыжаванні традыцый еўрапейскай культуры, гарманічна спалучаючы ўплывы і візантыйскага, і заходняга мастацтва з аўтэнтычным народным жывапісам. Магчыма, мы нават самі яшчэ не ўсведамляем, якой вялікай культурнай каштоўнасцю валодае наш народ. Хочацца верыць, гэтаму разуменню паспрыяе тая ўвага, якую праяўляюць да беларускіх абразоў і спецыялісты і простыя аматары мастацтваў з розных краін свету.

Сёння многія задумваюцца над тым, якія ўзоры нашай культуры павінны прадстаўляць Беларусь у свеце. Мяркую, адказ на такое пытанне вельмі просты: замежнікам цікава тое, чаго няма ў іх. Не трэба імкнуцца прыстасавацца пад нейкія модныя тэндэнцыі, і ўжо дакладна няма сэнсу прапаноўваць копіі таго, што на Захадзе ўжо зроблена, прычым у куды лепшым варыянце — скажам, нейкія канцэптуальныя "калякі-малякі".

Мы маем выдатную, высокапрафесійную і самадастатковую школу выяўленчага мастацтва, і ўжо сёння галерысты літаральна палююць за творамі такіх класікаў, як, скажам, Віталь Цвірка альбо Май Данцыг. Перакананы ў тым, што яны могуць з поспехам выстаўляцца ў любым еўрапейскім музеі.

Адно што мы пакуль не ведаем, як гэтым сваім багаццем распарадзіцца, і нашы скарбы сёння, фігуральна кажучы, пыляцца недзе ў схованках. Таму галоўная задача — годна паказаць тое, што мы маем, усяму свету. Я нават не сумняваюся: калі ў тым жа Парыжы ўдасца зладзіць прадстаўнічую выставу беларускага акадэмічнага жывапісу, ёй наканаваны велізарны поспех.

Вядома, многія паспяшаюцца ахрысціць мяне летуценнікам. Але ж гэта — ужо далёка не ўпершыню. Задума правесці выставу ў Ватыкане таксама здавалася далёкімі ад жыцця фантазіямі, аднак у выніку яна адбылася. Сакрэт пераўтварэння мараў у рэчаіснасць вельмі просты — жаданне і настойлівасць. Трэба не ленавацца і шчыра працаваць кожны дзень, робячы справу годна і прафесійна. Кожны мусіць задумвацца, ці годна ён займае сваё крэсла, ці робіць усё, на што ён здатны для выканання сваёй грамадскай задачы. Я задаю сабе такое пытанне літаральна штодня.

К

"Перазагрузка" балета

АЗЕРБАЙДЖАН

На сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь адбылася прэм'ера балета "Каханне і Смерць". Аўтар музыкі — народны артыст Азербайджана, прафесар, пасол сваёй краіны ў Расіі Палад Бюльбюль-аглы. На прэс-канферэнцыі ён распавёў журналістам пра мінскую версію балета.

Вольга РОПАТ

"Каханне і Смерць" можна лічыць падарункам: акурат у дзень прэм'еры споўнілася 23 гады са дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Азербайджанам і Рэспублікай Беларусь.

Палад Бюльбюль-аглы.

Але гэта не першы азербайджанскі балет у рэпертуары Вялікага: некалькі гадоў на сцэне ідзе балет у дзвюх дзеях "Сем прыгажунь" кампазітара, педагога і грамадскага дзеяча Кара Караева. Першая ж пастаноўка "Кахання і Смерці" адбылася ў 2005-м у Баку, а праз некалькі гадоў — у Екацярынбургу. Спектакль не аднойчы ўзнаўлялі, таму ў Мінску, па падліках Палада Бюльбюль-аглы, чацвёртая версія.

Народны артыст, аўтар музыкі ўзнімае агульначалавечыя пытанні: каханне, адносіны чалавека да смерці…

— У кожнага балетмайстра сваё бачанне. Першы раз я яшчэ спрабаваў спрачацца, штосьці даказваць… Але потым зразумеў, што напісаная музыка знаходзіцца "ў руках" балетмайстра. Таму выказваў свае пажаданні і даваў свабоду, каб ён паставіў так, як бачыць. Малады балетмайстар, лаўрэат міжнародных конкурсаў Вольга Косцель добра адчувае музыку. Яна ўбачыла чорныя і белыя сілы, скажам, у "множным" ліку. Гэта якраз і выклікала мае спрэчкі з ёю. На мой погляд, яны павінны быць больш персаніфікаваныя. Але, нягледзячы на маладосць, Вольга умее адстойваць сваё меркаванне, — распавёў журналістам народны артыст Азербайджана. Ён таксама дадаў, што ў Вялікім тэатры захаваны інстытут мастацкага савета, дзе свабодна выказваецца меркаванне. "І калі першы раз выказаліся, скажам так, "востра", то гэтым разам ніхто крытычнай заўвагі не зрабіў: усе члены савета адобрылі пастаноўку" — рэзюмаваў творца і дыпламат.

К

Сцэна са спектакля "Каханне і Смерць".

1941-ы: Брэсцкі...

У фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваюцца шматлікія матэрыялы па тэме абароны Брэсцкай крэпасці. Дакументы прадстаўлены ў асноўным успамінамі ўдзельнікаў і відавочцаў тых падзей.

У гэтым артыкуле гаворка пойдзе пра двух байцоў 455 стралковага палка 42 стралковай дывізіі — ураджэнцаў Міншчыны.

Аляксандр Махнач.

Аляксандр Пятліцкі.

Аляксандр Махнач (справа) выступае на сустрэчы ў Брэсцкай крэпасці. 1954 год.

Дзевятнаццацігадовы лейтэнант

Сярод абаронцаў крэпасці быў Аляксандр Махнач, які трапіў сюды напярэдадні грозных чэрвеньскіх падзей 1941 года. Дзевятнаццацігадовы малодшы лейтэнант, які толькі скончыў Калінкавіцкае ваеннае пяхотнае вучылішча, з групай таварышаў-выпускнікоў атрымаў накіраванне ў Брэст. Тут быў прызначаны камандзірам узвода ў 455-ы стралковы полк.



Лісты з успамінаў.

Гартаю ўспаміны Аляксандра Іванавіча. На світанку 22 чэрвеня ён прачнуўся ад аглушальнага грукату, калі вакол у хатняй цемры зіхацелі ўспышкі выбухаў, свісцелі аскепкі снарадаў. Усё гэта было настолькі страшна, што яшчэ не зусім ачунялы ад сну лейтэнант кінуўся пад нары. Але ўжо праз некалькі імгненняў Махнач стаў збіраць байцоў. Гэтак арганізавалі абарону, расставіўшы кулямётчыкаў і стралкоў. Увесь дзень, 22 чэрвеня, узвод адбіваў атакі праціўніка. Аляксандр Іванавіч бачыў вакол сябе толькі смерць, кроў, гібель. Ён упершыню сам страляў і забіваў.

23 чэрвеня байцы 455 стралковага палка знайшлі ў сваім распалажэнні склад боепрыпасаў, які ацалеў. Там і здабылі новенькія, яшчэ ў заводскім алеі аўтаматы. Малодшаму лейтэнанту да гэтага часу не даводзілася карыстацца такой зброяй. Выбраўшы момант зацішша, асцярожна выпаўз вонкі, каб патрэніравацца ў стральбе з аўтамата. Далей словы з яго ўспамінаў: "Я ляжаў і прастрэльваў новыя ППД, узятыя са склада, калі мне быццам электратокам адарвала левую нагу. Па мне працягваў страляць з пісталета баец. Калі ён быў забіты мной, высветлілася, што гэта пераапрануты ў вопратку нашага байца нямецкі унтэр-афіцэр..."

Рана Аляксандра Іванавіча была вельмі цяжкай: куля прайшла ад пяткі да калена: "...Я плазун, хадзіць не магу..." Ён ужо не мог змагацца, яго перанеслі ў скляпенні да параненых. "На наступную раніцу 24 чэрвеня вораг спрабаваў прарвацца ў крэпасць з плошчы 6 СД. І гэтым разам быў адбіты".

Асабліва цяжкая абстаноўка ў крэпасці была з харчаваннем, якое няўмольна заканчвалася. Зноў успаміны Аляксандра Іванавіча: "Хоць і галодныя, але без вады не ідзе. Спрабавалі прастрэліць з пісталета вадаправодныя трубы, але безвынікова... Уначы рабілі вылазкі да рэчкі па ваду, але мала каму ўдавалася яе прынесці, берагі ракі ўвесь час абліваліся кулямі". Махнач згадвае, як вораг па радыё вёў агітацыю, каб чырвонаармейцы забівалі паліткоў і яўрэяў, а самі здаваліся ў палон. "У адказ на гэта прагучаў загад ад камандзіра да байца і ад байца да байца: "Падрыхтавацца да бою!"

Падчас моцнай атакі 26 чэрвеня на ўчастку 455-га палка было загадана змагацца нават параненым і кантужаным байцам. Цяпер вораг ішоў лавінай. Выпаўз у казарму і лейтэнант Махнач. Першае, што ён убачыў, — кулямёт "Максім" з запраўленай стужкай, а побач забіты баец. Аляксандр Іванавіч адсунуў цела чырвонаармейца і ўзяўся за ручкі кулямёта. "Вораг вёў на хаду агонь з аўтаматаў, і кулі стракацелі аб шчыт. Мне пабіла рукі і твар пырскамі расплаўленага свінцу". У яго памяці засталіся зялёныя постаці ворагаў, якія набягалі шчыльным ланцугом, і злы паспешлівы грукат яго кулямёта. Затым апошнія сілы пакінулі яго, і лейтэнант Махнач страціў прытомнасць. Ачуняў Аляксандр Іванавіч у палоне. Гітлераўцы змясцілі яго ў лагер у Паўднёвым ваенным гарадку ў Брэсце. Лейтэнанту давялося прайсці праз фашысцкія лагеры аж да вызвалення, якое наступіла ў 1945 годзе.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя пры абароне Брэсцкай крэпасці, Аляксандр Махнач узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I і II ступені, медалямі. У пасляваенныя гады ён скончыў завочна Літаратурны інстытут, стаў пісьменнікам. Вялікае месца ў яго творчасці займала тэма вайны.

"Ёсць агонь!"

У страшныя чэрвеньскія дні 1941-га мінчанін Аляксандр Пятліцкі быў адным з тых, хто "стаяў да смерці" за Брэсцкую крэпасць. Паводле яго ўспамінаў знятыя фільмы "Ёсць агонь", "І вечна будзе май". Як і Аляксандр Махнач, ён быў накіраваны 17 чэрвеня 1941 года ў крэпасць у 445 стралковы полк 42 дывізіі.

Перабіраю пажоўклыя ад часу старонкі машыннага тэксту са страшнымі ўспамінамі: "Калі пачалася вайна, я спаў у адведзеным для нас інтэрнаце. Выбегшы ў нацельнай бялізне, я стаў прабірацца да свайго падраздзялення. Артылерыйскі і мінамётны агонь праціўніка ператварыў Цэнтральны востраў у нешта вогненнае, непраходнае... Усё пакрывалася выбухамі снарадаў і мінаў, чорным дымам і полымем. Ноччу немцы прабіраліся невялікімі групамі, імкнучыся закідаць гранатамі нашы агнявыя кропкі, таму ўсю ноч трэба было глядзець за сваім участкам абстрэлу..."

Ва ўспамінах Аляксандра Пятліцкага першыя дні вайны апісаны да найдрабнейшых падрабязнасцяў. Лейтэнант адзін вёў агонь па немцах, рызыкуючы жыццём здабываў патроны і боепрыпасы. "Я вымушаны быў узяць на сябе арганізацыю па вышуку хованкі для параненых, здаровых прывесці ў баявую гатоўнасць", — піша ён.

Да канца месяца ў склепе 333 стралковага палка адбыўся сход з нагоды далейшых дзеянняў, бо "скончыліся сухары, не было вады, і, самае галоўнае, скончыліся боепрыпасы. Вырашана было ісці на прарыў у лес з боку Цярэспальскага маста ля вежы. Уся група кінулася атакаваць немцаў, імкнучыся наблізіцца для рукапашнага сутыкнення. Бой доўжыўся працяглы час. Мы цярпелі вялікія страты, і, нарэшце, немцы абстралялі нас з артылерыі, канчаткова патрапаўшы нашу групу прарыву... Пакінутая невялікая частка байцоў сыходзіла хто як мог... Але ўсё ж атрымалася схавацца за сцяной электрастанцыі, а потым перайсці ў падвалы 333 палка".

У тых сутарэннях знаходзіліся параненыя, якія ўжо не маглі ісці на прарыў. "Яны падпаўзлі да агнявых межаў і вялі агонь, паміраючы ад голаду, смагі і ран, кормячыся адной толькі сырой бульбай. Кожны стрэл трывожыў немцаў, яны абвяшчалі па ўстаноўленым рэпрадуктары аб узяцці Мінска і аб прасоўванні далей на ўсход. У адказ на гэта нашы параненыя адкрывалі агонь, і немцы, удакладніўшы кірунак, абстрэльвалі гэты ўчастак, ператвараючы ўсё ў руіны".

Аляксандр Лявонцьевіч бачыў, як у страшных пакутах гінулі яго таварышы па вучылішчы, аднак працягваў весці адчайную барацьбу. Да пачатку ліпеня ні вады, ні ежы практычна не засталося. У адзін з дзён лейтэнант Пятліцкі займаўся пошукамі вады і выбіраў зручны падыход да Буга для напаўнення пляшак. З-за кантузіі ён не пачуў, як ззаду падышлі немцы і збілі яго з ног. А далей — нямецкі палон... Бясконца доўгія пяць гадоў. Бяла-Падляска, Хамельсбург, Нюрнберг, Брно, Кроны. Неаднаразова ён рабіў спробы ўцёкаў, аднак Аляксандра Лявонцьевіча лавілі і адпраўлялі ў штрафныя лагеры.

Толькі ў студзені 1946 года Аляксандр Пятліцкі вярнуўся ў родны Мінск. Шмат гадоў абаронцу Брэсцкай крэпасці разам з сям'ёй давялося жыць у падвалах дома па вуліцы Карла Маркса. У жніўні 1954 года Аляксандра Лявонцьевіча запрасілі на сустрэчу з пісьменнікам Смірновым. Тады ён сустрэўся з аднапалчанінам Аляксандрам Махначом, адбылася першая паездка ў пасляваенны Брэст. За заслугі ў Вялікай Айчыннай вайне Аляксандр Пятліцкі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалём "За перамогу над Германіяй" і іншымі.

Кацярына КАТЛОЎСКАЯ,
малодшы навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны

...Досвіткам 22 чэрвеня 1941 года камандзіра 100-й стралковай дывізіі генерал-маёра Івана Русіянава разбудзіў рэзкі тэлефонны званок намесніка камандуючага войскамі Заходняй Асобай акругі генерал-лейтэнанта Івана Болдзіна, які паведаміў аб вераломным нападзе фашысцкай Германіі на СССР і загадаў камандзіру дывізіі дзейнічаць згодна з сакрэтным "Варыянтам №1", які прадугледжвае адбіццё часткамі варожай агрэсіі.

Контрудар супраць "абцугоў"

100-я дывізія дыслакавалася ў раёне Уручча (тады яшчэ пад Мінскам). Сфармаваная ў канцы 1923 года, яна прайшла слаўны баявы шлях: у верасні 1939-га ўдзельнічала ў паходзе ў Заходнюю Беларусь, затым — у прарыве лініі Манергейма, за што ўганаравана ордэнам Леніна. Камандзірам дывізіі Іван Мікіціч Русіянаў быў прызначаны ў жніўні 1940 года.

Камандзір дывізіі Іван Русіянаў (у цэнтры).

Выконваючы загад штаба акругі, якая стала з пачаткам вайны Заходнім фронтам, воінскія часткі дывізіі былі ўзнятыя па трывозе і да 9 гадзін раніцы выведзеныя ў раёны засяроджвання, абсталяваныя ў бліжэйшых лясах Мінскага раёна, дзе была арганізавана супрацьпаветраная абарона і выстаўлена ўзмоцненая баявая ахова. Камандуючы Заходнім фронтам генерал арміі Дзмітрый Паўлаў загадаў 100-й стралковай дывізіі заняць кругавую абарону ў радыусе дваццаці пяці кіламетраў вакол Мінска і быць у гатоўнасці. Абарону Мінскага ўмацаванага раёна па лініі Дзяржынск — Заслаўе — Стайкі ажыццяўляў 44-ы стралковы корпус на чале з камдзівам Васілём Юшкевічам.

Мінск апынуўся ў напрамку галоўнага ўдару найбуйнейшай групоўкі фашысцкіх войскаў — групы армій "Цэнтр". 3-я і 2-я танкавыя групы, якія дзейнічалі ў яе складзе, хутка прасоўваліся з паўночнага захаду па флангах войскаў Заходняга фронту ў напрамку сталіцы Беларускай ССР, паступова ахоплівалі "абцугамі" галоўныя сілы фронту з мэтай іх акружэння і далейшага знішчэння. Забяспечыўшы максімальную канцэнтрацыю сіл і сродкаў на ўчастках прарыву, прарваўшы слабыя заслоны і адбіўшы контрудары савецкіх войскаў, з паўночнага захаду да Мінска падышлі нямецкія танкавыя дывізіі. Вораг бязлітасна бамбаваў Мінск, бурыліся дамы, прамысловыя будынкі, гарэлі склады, гінулі тысячы мірных жыхароў. Натоўп бежанцаў накіраваўся на ўсход па Лагойскай, Маскоўскай і Магілёўскай шашы.

25 чэрвеня для аператыўнага кіравання абаронай Мінска ў склад 2-га стралковага корпуса на чале з генерал-маёрам Аркадзем Ермаковым перададзены 100-я і 161-я стралковыя дывізіі. Камандзір корпуса загадаў першай да раніцы 26 чэрвеня выйсці на рубеж Воркава — Вандоліна — Бараўцы — Паперня — Ашмянцы, заняць абарону, прыкрыць подступы да горада з поўначы і спыніць імклівае насоўванне танкаў ворага.

У першым эшалоне абарону занялі 85-ы і 355-ы стралковыя палкі, тут жа перайшоў да абароны 603-і стралковы полк суседняй 161-й стралковай дывізіі. У другім эшалоне ў 4 — 5 км ад першага заняў рубеж абароны 331-ы стралковы полк. Артылерыі, акрамя некалькіх батарэяў 45-міліметровых гармат, у дывізіі не было: зброя была перададзена на ўзмацненне 44-у стралковаму корпусу, які вёў баі на захад ад Мінска.

Знішчальнікі танкаў

Тым часам раніцай 26 чэрвеня немцы выкінулі ў Астрашыцкі Гарадок парашутны дэсант. З падыходам асноўных сіл пяхоты і танкаў вораг планаваў выкарыстаць гэты населены пункт у якасці плацдарма для танкавага ўдару па Лагойскай шашы на Мінск.

100-я дывізія была размеркавана вакол Мінска па фронце каля 100 кіламетраў. Кінуць часткі, узброеныя толькі стралковай зброяй, супраць мінамётаў, артылерыі, танкаў праціўніка было нельга. У мемуарах "У баях народжаная" генерал Іван Русіянаў прыгадваў, што яму адзін сябар, які ваяваў у Іспаніі, распавядаў, як фашысцкія танкі выдатна гараць ад бутэлек з бензінам. Так з'явіўся загад па дывізіі: "Першае. Сабраць у асабістага састава шкляныя пляшкі і заправіць іх гаручым. Другое. Ва ўсіх частках сфарміраваць групы добраахвотнікаў — знішчальнікаў танкаў. Звярнуцца, перш за ўсё, да камуністаў і камсамольцаў. Трэцяе. Начальніку інжынернай службы арганізаваць навучанне асабістага складу прымяненню бутэлек з бензінам

для барацьбы з танкамі". Затым Русіянаў звязаўся па тэлефоне з пакінутым ва Уруччы памочнікам начальніка штаба дывізіі па тыле капітанам Растоўцавым. Загадаў яму неадкладна ехаць у Мінск, узяць на шклозаводзе ўсе наяўныя там бутэлькі, захапіць таксама са складоў дывізіі ўсе пустыя шкляныя пляшкі, загрузіць на аўтамашыны бензін і хутка даставіць усё гэта на перадавую. Вось што запісана ў журнале баявых дзеянняў 100-й дывізіі: "У 13 гадзін 30 хвілін на камандны пункт дывізіі капітанам Растоўцавым была дастаўлена першая партыя бутэлек і бензін для іх напаўнення, якія былі накіраваныя ў 85-ы і 355-ы стралковыя палкі". Усяго ж за дзень на заправачныя пункты дывізіі было дастаўлена 12 грузавікоў шкляных бутэлек і некалькі тон гаручага.

З трапятаннем у душы і асаблівым пачуццём гонару за абаронцаў Мінска бяру ў рукі газету Заходняга фронту "Чырвонаармейская праўда" за суботу 9 жніўня 1941 года, якая захоўваецца ў фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Цэлых дзве старонкі газеты выпушчаныя з матэрыяламі пад загалоўкам "100-я ордэна Леніна дывізія ў баях з ворагамі Радзімы". У артыкулах "Наводчык Іван Кавун", "Пяць смельчакоў", "Гераічны полк" і іншых франтавыя карэспандэнты знаёмяць з гераізмам чырвонаармейцаў і камандзіраў злучэння. Вось газетная нататка "Знішчальнікі танкаў". У ёй засведчана, што "па ініцыятыве капітана Каўрыжкі супраць варожых танкаў упершыню была ўжыта бутэлька з бензінам. Капітан навучыў сваіх байцоў скарыстоўваць у баі грозную зброю. Гэты просты снарад байцы ўжывалі вельмі ўмела. У першым жа баі падраздзяленне капітана Каўрыжкі вывела са строю 16 нямецкіх танкаў. Сам капітан на працягу дня падпаліў каля дзесяці танкаў. Гэты каштоўны вопыт барацьбы хутка пераняла байцы і камандзіры ўсёй дывізіі".

Наш зямляк, двойчы Герой Савецкага Саюза Маршал Савецкага Саюза Іван Якубоўскі ў кнізе "Зямля ў агні" згадваў: "Асабліва цяжкі бой злучэнне вытрымала 26 чэрвеня. Сотая, спешна заняўшы абарону ў 10 — 15 км на поўнач ад Мінска, адбіла некалькі моцных танкавых нападаў ворага. Толькі на пазіцыі яе 85-га стралковага палка ішло да 50 нямецкіх танкаў. Дваццаць з іх былі знішчаны бутэлькамі з гаручай сумессю. У другой палове наступнага дня дывізія сама перайшла ў наступ і за тры гадзіны бою адкінула ворага на 13 — 14 км на паўночны захад, знішчыўшы вялікую колькасць танкаў, бронемашын і матацыклаў праціўніка".

У фондах музея знаходзіцца яшчэ адзін важны дакумент мінулай вайны — выцвілая ад часу "Памятка байцу пра ўжыванне запальных бутэлек", падрыхтаваная палітупраўленнем Заходняга фронту. У памятцы ўтрымліваюцца канкрэтныя рэкамендацыі воінам: "Падпускай танк да сябе на 15 — 20 метраў, а то і бліжэй, і кідай бутэльку. Выкарыстоўвай варонкі, ямы, канавы, кусты, плот. Смела чакай танк і знішчай яго". Тут жа змешчаны малюнак варожага танка з указаннем яго слабых месцаў, а таксама апісаны спосабы кідання бутэлек і засады супраць танкаў. Такія памяткі з фондаў музея да гэтага часу захоўваюць пах бензіну і парахавога гару, іх трымалі ў руках байцы генерала Русіянава і іншых злучэнняў.

"Артылерыя — вось што зможа нам дапамагчы!"

На перадавой пад няспынным артылерыйскім, мінамётным агнём часткі закопваліся ў зямлю — вырывалі акопы, злучалі іх хадамі і годна сустракалі танкі ворага. У пасляваенных мемуарах Русіянаў згадваў: "Артылерыя, артылерыя — вось што зможа нам дапамагчы! І вось, нарэшце, камандаванне даслала 151-ы карпусны артылерыйскі полк у складзе 20 гармат 152-мм калібра. Я неадкладна накіраваў яго ў размяшчэнне 355-га стралковага палка, дзе бой быў у самым разгары. Абсталяваць агнявыя пазіцыі не было часу. 151-ы артылерыйскі полк з ходу ўступіў у бой. Большасць прылад, разгарнуўшыся на пазіцыях палка Шварова, ударылі прамой наводкай па танках і пяхоце суперніка. Адважныя артылерысты спалілі восем фашысцкіх танкаў і бронетранспарцёраў, знішчылі вялікую колькасць пяхоты".

Па даных Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расіі, 100-я дывізія за тры дні баёў на поўнач ад Мінска — 26, 27 і 28 чэрвеня 1941 года — знішчыла і вывела са строю 101 варожы танк, 13 бронемашын, 23 гарматы, збіла 20 самалётаў. З данясення аб баявых дзеяннях камандзіру 2-га стралковага корпуса: "усяго за перыяд баёў дывізіяй знішчана да палка пяхоты, да 1,5 батальёна матацыклістаў і знішчана да 75 адсоткаў матэрыяльнай часткі 25-га танкавага палка".

І ўсё ж сілы ў той бітве былі няроўнымі — пасля трох сутак жорсткага бою дывізіі генерала Русіянава давялося пакінуць пазіцыі пад Астрашыцкім Гарадком. Іван Мікіціч з горыччу канстатаваў, што "аператыўная абстаноўка на 28 чэрвеня складвалася вельмі неспрыяльна для 2-га стралковага корпуса, у склад якога ўваходзіла 100-я стралковая дывізія. Гітлераўцам удалося абысці нашае злучэнне справа і прабіцца да шашы Мінск — Масква. "...Нам пагражала поўнае акружэнне. Бо якой дарагой цаной мы спынілі ворага ля сцен Мінска! Колькі загінула нашых таварышаў! І вось даводзіцца адыходзіць. У дадзеным становішчы адыход — адзіна правільнае рашэнне".

Пасля салдаты і афіцэры 100-й стралковай дывізіі працягвалі ўпарта змагацца з ворагам, добра зарэкамендавалі сябе ў баях на рэках Бярэзіна і Днепр, асабліва вызначыліся ў Ельнінскай аперацыі. І цалкам заканамерна, што 18 верасня 1941-га менавіта дывізія генерал-маёра Русіянава ў ліку першых у Чырвонай Арміі атрымала ганаровае найменне гвардзейскай.

■■■

...Подзвіг абаронцаў Мінска не забыты ўдзячнымі нашчадкамі; імем генерала Русіянава названа вуліца ў мікрараёне Уручча, у сталічнай сярэдняй школе № 16 працуе музей "Баявы шлях 100-й стралковай дывізіі". У адной з залаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны змешчаныя фотапартрэты камандзіраў і байцоў славутага злучэння, дакументальныя фатаграфіі перыяду баявых дзеянняў у раёне Астрашыцкага Гарадка, падпаленых нямецкіх танкаў пад Мінскам. Тут жа ў вітрынах размешчаны рэшткі зброі і амуніцыі, асабістых рэчаў воінаў, якія былі знойдзены ў раёне бітвы 100-й стралковай дывізіі.

Каля скрыжавання дарог у Астрашыцкім Гарадку Мінскага раёна ўстаноўлены танк Т-34. На мармуровай пліце помніка высечаныя словы: "Воінам 100-й ордэна Леніна і 161-й стралковых дывізій 2-га стралковага корпуса, якія сталі насмерць на гэтым рубяжы ў суровыя дні чэрвеня 1941 года. Вечная слава героям!".

Мікалай ШАЎЧЭНКА, член Беларускага саюза журналістаў

Падпаленыя нямецкія танкі каля вёскі Паперня пад Мінскам.

...Мінскі...

Сэлфі: творца пра твор

Уладзімір Уродніч. "Вогненны Днепр 1941-га".

...і Магілёўскі рубяжы

Сёння ў рубрыцы "Сэлфі: творца пра твор" жывапісец Уладзімір Уродніч распавядае пра сваю новую карціну "Вогненны Днепр 1941-га".

Эскізы да карціны.

— На ўзорах гераізму ў часе Вялікай Айчыннай вайны выхавана не адно пакаленне беларусаў. І, нягледзячы на тое, што сёння многія ідэалагемы савецкай эпохі патрапілі пад крытычнае асэнсаванне, стаўленне да тых падзей у большасці беларусаў застаецца нязменным. Запатрабаваная гэтая тэма і ў сферы патрыятычнага выхавання. Асабліва калі гаворка ідзе пра вайскоўцаў нашых Узброеных Сіл. Арміі проста неабходныя ўзоры гераізму далёкіх продкаў і блізкіх да нас па часе дзядоў і бацькоў.

Мяне як чалавека і мастака заўжды цікавіў самы трагічны, пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай. Мяркую, што ён дагэтуль недастаткова асветлены і асэнсаваны. Канстанцін Сіманаў пісаў, што менавіта пад Магілёвам ён зразумеў, а хутчэй — адчуў, што, нягледзячы на імклівы наступ сіл вермахта, усё адно пераможам, вайна ўсё адно скончыцца ў Берліне перамогай СССР. Абарончыя баі лета і восені 1941 года неяк аказаліся ў ценю бітвы пад Масквой, калі да канчатковай перамогі было яшчэ вельмі далёка, але нямецкі "бліцкрыг" рэальна пацярпеў паразу. Зразумела, што больш цікава казаць пра тое, як спынілі варожы наступ, а не згадваць, колькі нашай зямлі ў выніку гэтага наступу аказалася пад нямецкай акупацыяй. Адзін расійскі пісьменнік, які грунтоўна даследаваў Сталінградскую бітву, напісаў пра яе дакументальна-мастацкую кнігу, прызнаваўся: усё адно не можа зразумець, як немцы маглі дайсці да Волгі… Вось і маштабы катастрофы Чырвонай Арміі і Савецкай дзяржавы летам-восенню 1941 года цяжка зразумець і вытлумачыць.

А між тым, менавіта ў Беларусі вораг упершыню сустрэў арганізаваны і дзейсны адпор. Прычым, часці Чырвонай Арміі не толькі абараняліся, але часам і пераходзілі ў контратакі, адкідваючы ворага на дзясяткі кіламетраў ад лініі супрацьстаяння. Ужо быў узяты Смаленск, але стаяў Магілёў. Амаль месяц доўжылася ягоная абарона. Тут былі скаваныя вялікія сілы немцаў, патрэбныя ім на маскоўскім напрамку. Гэта сражэнне я вывучаў па музейных матэрыялах, па таму ж Сіманаву, ездзіў на Буйніцкае поле. Напачатку мне хацелася напісаць кіраўнікоў абароны горада. Але потым вырашыў засяродзіцца на простых салдатах, што ідуць у атаку, бо менавіта яны найлепшым чынам увасабляюць народ, які паўстаў на абарону Радзімы. Пры гэтым, на маёй карціне ёсць канкрэтныя гістарычныя асобы.

Зноў вяртаючыся да кантэксту вялікіх бітваў 1941 года на тэрыторыі Беларусі, скажу, што, магчыма, іх недаацэненасць у савецкай (і, адпаведна, беларускай) гістарыяграфіі была абумоўлена своеасаблівым разуменнем паліткарэктнасці. Абарона Магілёва ці Лепельскі контрудар, вядомы ў гісторыі таксама як танкавая бітва пад Сянно, іншыя ўзоры актыўнага супраціўлення паказваюць, што Чырвоная Армія пры наяўнасці ініцыятыўных камандзіраў магла ваяваць эфектыўна. Але ў 1941 годзе сапраўдных прафесіяналаў у войску было катастрафічна мала, і менавіта гэтая акалічнасць, а не толькі вераломнасць ворага, сталася, бадай, адной з галоўных прычын трагедыі.

У беларускім савецкім мастацтве тэма Вялікай Айчыннай вайны, як вядома, была ў ліку сацыяльна прыярытэтных. Над ёй працавалі выдатныя творцы, і зробленае імі — залаты фонд нашага мастацтва. Аднак ва ўмовах суверэннай дзяржавы мы маем магчымасць па-новаму, з уласна беларускага гледзішча пераасэнсаваць тыя лёсавызначальныя падзеі. І, не ставячы пад сумнёў факту, што гэта агульная савецкая гісторыя, агульная перамога народаў вялікай краіны, засяродзіцца на беларускім чынніку. Інакш кажучы, мы ў сваіх гістарычных ацэнках можам сёння не азірацца на Маскву.

Але каб выпрацаваць уласна беларускі погляд на гісторыю, даўнюю і блізкую; погляд, які адпавядае нашым нацыянальным інтарэсам, трэба паразуменне і супольная праца творчых саюзаў і органаў улады, у першую чаргу — адказных за фарміраванне дзяржаўнай ідэалогіі. У гэтай справе мог бы вельмі прыдацца творчы патэнцыял нашай Студыі ваенных мастакоў, якія працуюць у даволі складаным, але заўжды запатрабаваным батальным жанры. У нас, у Беларусі, на шчасце, захавалася мастацкая школа, здольная працаваць над творчымі праектамі нацыянальнага маштабу. Новае асэнсаванне Вялікай Айчыннай вайны — адзін з такіх праектаў.

Занатаваў Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.".
(У рамках экспазіцыі дзейнічае выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ Рээкспазіцыя залы беларускага мастацтва 1940 — 1980-х гадоў **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.

Выставы:

■ Выстава са збору музея **"Плынь часу".** Графіка з цыкла "Нашы калекцыі", дзе прадстаўлена больш за 60 твораў 37 мастакоў Беларусі — юбіляраў 2016 года, ад 70 да 130 гадоў, — да 20 чэрвеня.
■ Выстава **"Школа класікаў. Беларускае і рускае мастацтва XIX–XX стагоддзяў"** (больш за 80 твораў жывапісу і графікі) — да 7 жніўня.
■ Выстава **"Сучасная Беларусь вачыма мастакоў"** (творы мастакоў розных пакаленняў, розных творчых памкненняў і кірункаў) — да 11 ліпеня.
■ Выстава **"Рэпліка прыгожага"** (злепкі скульптуры, створаныя ў майстэрні-атэльле Луўра) — да 1 верасня. У рамках выставы праводзіцца серыя лекцый, якія будуць чытацца на працягу ўсяго лета, кожную сераду а 17-й гадзіне.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Інтэр'еры шляхецкай сядзібы".
■ "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".
■ "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
■ Выстава **"Жыццё і творчасць Мельхіёра Ваньковіча"** — да 30 жніўня.
■ Выстава літаграфій **"Памятныя мясціны Беларусі ў творчасці Напалеона Орды"** з фондаў музея — да 30 жніўня.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Давыд-гарадоцкі роспіс"** з прыватнага збору А.М. Арлова, аднаго з першых даследчыкаў феномену "цікетак" — да 4 верасня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.

Экспазіцыі:

■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры. XIX — XX стст.".

Выставы:

■ Інавацыйны выставачны праект 3D карцін **"Ілюзорыум"** — да 3 ліпеня.
■ Выстава **"ЭКСПІРЫмЕНТуС"** — экспазіцыя незвычайных прыбораў і прылад — да 3 ліпеня.
■ Выстава фотамастачкі Марыны Бацюковай **"Сула. Непарыўнае"** — да 11 верасня (у дворыку музея).
■ Фотавыстава **"Палацы і замкі Латвіі"** — да 19 чэрвеня.
■ Персанальная выстава шведскай мастачкі Людмілы Хрысцесевай **«Sustainidentity»** — да 3 ліпеня.
■ Выстава фотаработ Льва Дашкевіча **"Святло і цень"** і яе ўрачыстая перадача ў фонды музея — 22 чэрвеня.

Філіялы Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

Экспазіцыі:

■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Інтэрактыўная выстава **"Вар'яцкая лабараторыя"** — да 3 ліпеня.
■ Выстава **"Свет савецкіх салдацікаў"**.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.

Экспазіцыі:

■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Выстава твораў Алісы Папунідзі **"Чароўныя сны Алісы"** — да 28 чэрвеня.

г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.

■ Выстава **"Лукамор'е"** — да 1 ліпеня.
■ Выстава **"Экзатычныя жывёлы свету"** — да 5 верасня.
■ Незвычайны атракцыён **"Стужкавы лабірынт"** — да 31 снежня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.

Пастаянныя экспазіцыі:

■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА

г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.

■ Пастаянная экспазіцыя.

Майстар-класы:

■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.

Выстава:

■ Выстава **"Аўтамабіль на далоні"**.
■ Выстава **"Мастацтва папяровай выразкі"** — да 3 ліпеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО

г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.

Экспазіцыя:

■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
сер. — ад 12-й да 20-й.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Сляды вайны..."** (збор прадметаў ваеннага абмундзіравання і амуніцыі з фондавых калекцый музея і ўзоры рарытэтнай тэхнікі з унікальнай калекцыі Аляксея Цікунова) — да 18 ліпеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Археалагічныя знаходкі палаца вялікіх князёў літоўскіх. Штодзённасць Віленскага двара"** з фондаў Музея-палаца вялікіх князёў літоўскіх (Вільня) — да 11 верасня.

Ратуша

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Уецца веер акрылены"** — да 5 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Стацыянарная выстава **"У хвалях няспыннага руху: аўтамабільнымі шляхамі Коласа"**.
■ У дні летніх канікул музей запрашае на праграму культурна-адукацыйных мерапрыемстваў **"Канікулы ў Доме Коласа"** (па папярэднім запісе).
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"** (праводзіцца па заяўках; маршруты могуць змяняцца ў адпаведнасці з пажаданнямі экскурсантаў).

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).
■ Музейная творчая майстэрня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыі:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

Акцыі:

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
■ Выстава **"Ісці супольна праз усё жыццё"** (да 100-гадовага юбілею вянчання Янкі Купалы і Уладзіславы Станкевіч) — да 18 чэрвеня.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва".**
■ Выстава малюнка **"Дзіўны свет Паліны Касцюкевіч"** (прадстаўлена больш за 50 малюнкаў адной з вучаніц Маргарыты Шчамялёвай) — да 19 чэрвеня.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку СССР і Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Рэканструкцыя інтэр'ераў былога сядзібнага дома **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт".**

Выставы:

■ Выстава **"9. Трыенале Польскай Графікі"** (будуць прадстаўлены каля 80 найлепшых прац конкурсу, які ўяўляе сабой цыклічны прагляд польскай сучаснай графікі) — да 30 чэрвеня.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі".**

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.

■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Нараджэнне гуказапісу"** — да 9 ліпеня.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ

г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.

■ Выставачна-адукацыйны праект **"Па слядах мамантаў".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея".**
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст.".**
■ Адкрытае захоўванне археалагічнай калекцыі музея.
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).

Выставы:

■ Інтэрактыўная выстава з Рыміні (Італія) **"Усё жыццё ў адным ровары"** — да 26 чэрвеня.
■ Выстава жывапісных работ Вольгі Капачовай **"Гарадская архітэктура"** — да 7 ліпеня.
■ Выстава **"Скрыня Пандоры. Фантастычны свет Сяргея Парцянкова"** — да 17 ліпеня.
■ Выстава **"Ад класікі да фэнтазі"** — да 31 ліпеня.
■ Выстава **"Паралельны свет, або Міфы пра дамавікоў і лесавікоў"** — да 31 ліпеня.

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстава:

■ **"Родны край, навек любімы"** — мастацка-адукацыйны праект, прысвечаны творчасці гомельскіх мастакоў (з фондаў музея), — да 31 ліпеня.

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстава:

■ Выстава **экзатычных жывёл**.

Зімовы сад

■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл".**

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Па праве Памяці"**, прысвечаная Чырвонай арміі, з фондаў музея.
■ Выстава **"Зброя для моцных духам".**

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).

Выставы:

■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава з прыватнага збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі".**
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны".**
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.

■ Выстава па выніках першага міжнароднага пленэра мастакоў-іканапісцаў на тэму **"Цудатворныя іконы Беларусі"** (Беларусь — Польшча — Украіна) — з 20 да 24 чэрвеня.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.

■ Выстава інтэрактыўных сюжэтаў — **3D карцін** — да 28 чэрвеня.
■ Выстава графічнага дызайну **"Ідэя!"** (прадстаўлена плакатная акцыя "Чарнобыль — 30, Фукусіма — 5" Маскоўскай міжнароднай біенале графічнага дызайну "Залатая пчала — 12") — да 3 ліпеня.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.

■ **19 — "Макбет"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Вердзі.
■ **20 — "Дон Кіхот"** (балет у 3-х дзеях) Л.Мінкуса.
■ **21 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ.
■ **22, 25 — "Бахчысарайскі фантан"** (балет у 2-х дзеях, прэм'ера абноўленай пастаноўкі) Б.Астаф'ева.
■ **23 — "Яўген Анегін"** (опера ў 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.

З 24 да 26 чэрвеня — спектаклі і канцэрты у рамках штогадовага фестывалю **"Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў".**

■ **24 —** канцэрт духоўнай вакальнай музыкі эпохі Барока (Касцёл Божага Цела. Пачатак у 16.00).
■ **24 — "Дон Кіхот"** (балет у 3-х дзеях) Л.Мінкуса (унутраны двор замка Радзівілаў. Пачатак у 20.00).
■ **25 —** канцэрт **"Сэрца, табе не хочацца спакою"** з удзелам вядучых салістаў оперы і струннага квінтэта "Серэнада" (тэатральная зала ў замку Радзівілаў. Пачатак у 13.00).
■ **25 — "Іяланта"** (опера ў 2-х дзеях) П.Чайкоўскага (унутраны двор замка Радзівілаў.Пачатак у 20.00).

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.

■ **22, 23 — "Пелікан"** (ода злачыннай жарсці) А. Стрындберга. Прэм'ера.
■ **24 — "Лямур, тужур і абажур"** (займальны тэатральны канцэрт, у якім акцёры з Францыі, Швейцарыі і Марока прадставяць вакальныя, танцавальныя і драматычныя нумары).

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.

■ **20 — "Мая цудоўная лэдзі"** (мюзікл у 2-х дзеях) Ф.Лоу.
■ **21 — "Аднойчы ў Чыкага"** (музычнае рэвю ў 2-х дзеях) Дж.Стайна, Г.Мілера, Дж.Кандэра і інш.
■ **22 — "Баль у Савое"** (аперэта ў 2-х дзеях) П.Абрахама.
■ **23 — "Шалом Алейхем! Мір вам, людзі!"** (мюзікл у 2-х дзеях) А.Хадоскі.
■ **24 — "Тысяча і адна ноч"** (балет у 2-х дзеях) Ф.Амірава.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **25 — "Брэменскія музыкі"** (спектакль для дзяцей ад 5 год) В.Ліванава і Ю.Энціна. Пачатак аб 11-й.